—Людзьмі звацца!
Янка Купала

# ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ГАЗЕТА ТВОРЧАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ БЕЛАРУСІ

ПЯТНІЦА
24
КРАСАВІКА
1992 г.
№ 17 (3635)

ВЫХОДЗІЦЬ
з 1932 г.

КОШТ — 50 кап.
(Па падпісцы —
10 кап.)

## БОЛЬ НЕ ЗАТУХАЕ...

**Арсен САКУН: «Адсяленне разгортвалася імкліва. Адна за адной з Чамкова, які ў трох кіламетрах ад Чарнобыльскай АЭС, адыходзілі машыны з жывёлай. Недзе каля апоўначы сабраліся ля аўтобусаў людзі. Перад ад'ездам яны папрасілі аб адным: спыніцца каля могілак, каб развітацца з роднымі».**

СТАРОНКА 4

## СВЯТЫЯ АЙЦЫ І ГРЭШНЫЯ КАМУНІСТЫ

**Анатоль СІДАРЭВІЧ: адносіны дзяржавы і царквы патрабуюць карэкціроўкі.**

СТАРОНКІ 5, 15

## СПАКУСЫ ПАФАСНАГА СЛОВА

**Маладая паэзія: дэкларацыйнасць і яе спадарожнікі.**

СТАРОНКІ 6—7

## СЕМ ГАДОЎ І ЎСЁ ЖЫЦЦЁ

**Драма і трагедыя Францішка Аляхновіча — драматурга і чалавека.**

СТАРОНКІ 8—9

## ВЫПРАБАВАННЕ БУЛГАКАВЫМ

**«Майстар і Маргарыта» Я. Глебава ў Акадэмічным тэатры оперы і балета.**

СТАРОНКІ 10—11

## АДРОДЗІМСЯ ЦІ НЕ?

**Ліст з Эстоніі.**

СТАРОНКА 16

## ЭФІР ПАД ЗНАКАМ «Ч»

**26 красавіка 1986 года ў 1.23 ночы выбухнуў Чарнобыль. Сатанінская сіла, выплюхнутая рэактарам, падзяліла нашае жыццё на «да» і «пасля» аварыі. На Беларусь, беларусаў прыйшлося да 70 працэнтаў усіх радыеактыўных забруджанняў, у зоне Чарнобыля апынулася пятая частка насельніцтва. Што будзе з намі, нашымі дзецьмі, дзецьмі нашых дзяцей? Спробай асэнсаваць нашае жыццё «пад знакам «Ч» стане радыёмарафон, які наладжваюць радыёстанцыя «Беларуская маладзёжная» пры падтрымцы міжнароднага фонду «Спадчына Чарнобыля». Каля дзвюх тысяч кіламетраў па забруджаных раёнах Гомельскай і Магілёўскай абласцей, па 30-кіламетровай зоне пройдзем мы за пяць гадзін эфіру, чарнобыльскім шляхам, падключым Кіеў, Гомель, Магілёў, Дортмунт (ФРГ). Мітрапаліт Філарэт звернецца да слухачоў і гледачоў (прамыя ўключэнні марафону зробіць і Беларускае тэлебачанне) у гэты Вялікдзень са спецыяльнай «чарнобыльскай» малітвай. Эфір будзе аддадзены народным дэпутатам, навукоўцам, пісьменнікам.**

**Галасы «зоны» ашаламляюць, прымушаюць жыць у новым вымярэнні. Але ведаць пра ГЭТА трэба кожнаму. Каб выжыць.**

**З 12 да 17.00 на Вялікдзень мы чакаем вас «Пад знакам «Ч».**

**Віталь СЯМАШКА, Алесь ДАЙНЕКА,**
**вядучыя радыёмарафону.**

**Сёлета на адзін дзень прыпадуць угодкі нараджэння Хрыста—самае светлае свята для ўсіх праваслаўных Беларусі і гадавіна катастрофы на Чарнобыльскай АЭС—чорны дзень у нашай гісторыі.**
**26 красавіка святар жодзінскае царквы св. Міхаіла а. Аляксей разам з усімі прыхаджанамі будзе маліцца, каб падзяліць з людзьмі іхнюю радасць і іхняе гора.**
**26 красавіка. Дзень радасці, дзень жалобы.**

Фота У. ПАНАДЫ.

# Кола Дзён

**16 КРАСАВІКА**

Па закліку Свабоднага прафсаюза Беларусі і Мінскага стачкама некалькі тысяч рабочых з розных заводаў прыйшлі на сталічны пляц Незалежнасці, каб выказаць салідарнасць з шахцёрамі Салігорска. Вось ужо некалькі месяцаў гарнякі вядуць барацьбу за Генеральнае тарыфнае пагадненне на прынцыпова новых пачатках. Паралізавана цэлая галіна вытворчасці... І толькі цяпер парламент, нарэшце, пагадзіўся выслухаць прадстаўнікоў бастуючых.

Дарэчы, мінскіх рабочых да Дома ўрада прывяла, напэўна, не толькі салідарнасць з незалежным прафсаюзам гарнякоў. Напярэдадні Саўмін Беларусі прыняў пастанову, згодна з якой павялічыліся цэны на паліва, газ, электраэнергію (у 3—5 разоў), медыкаменты і прыгарадныя чыгуначныя перавозкі (удвая), а таксама на гарэлку.

Мітынг каля Дома ўрада завяршыўся мірна. Але ці не быў гэта апошні званок для кіраўніцтва рэспублікі?

**17 КРАСАВІКА**

Спробы Вярхоўнага Савета Беларусі рэарганізаваць свае структуры для больш эфектыўнай работы скончыліся на сесіі амаль безвынікова: скарочаны ўсяго дзве камісіі — мандатная і па таварах народнага спажывання...

Прэзідэнт ЗША Дж. Буш падпісаў указ аб прыпыненні дзеяння так званай «папраўкі Джэксана-Вэніка» адносна Беларусі, Кыргызстана і Расіі. Гэтая папраўка абумоўлівае рэжым найбольшага спрыяння ў гандлі з боку ЗША са свабодай эміграцыі ў той ці іншай краіне. Было б чым гандляваць...

Тым часам завяршыўся візіт на Беларусь вядомага амерыканскага сенатара А. Крэнстана.

**18 КРАСАВІКА**

У Мінску ўпершыню шырока праводзіліся мерапрыемствы, звязаныя са святкаваннем яўрэйскай пасхі («пэсах»).

Незадоўга да свята на Беларусі ўпершыню пабываў кіраўнік Сусветнага яўрэйскага парламента Сімх Дзініц, які сустрэўся са Старшынёй ВС Беларусі С. Шушкевічам і першым намеснікам Старшыні СМ Беларусі М. Мясніковічам. У ходзе візіту стала вядома, што ў бліжэйшы час паміж Рэспублікай Беларусь і Ізраілем будуць наладжаны дыпламатычныя адносіны.

**19 КРАСАВІКА**

Папа Рымскі Ян Павел II выступіў у Ватыкане перад дзесяткамі тысяч паломнікаў з розных краін свету (у тым ліку з Беларусі) з велікодным зваротам у час святочнай імшы. Пажаданне міру было прамоўлена на 55 мовах.

**20 КРАСАВІКА**

Панядзелак пасля каталіцкага Вялікадня быў афіцыйна аб'яўлены святочным днём. (Таксама, як і наступны панядзелак — другі дзень праваслаўнага свята Уваскрэсення Хрыстова). Між іншым, па гэтай прычыне ў рэспубліцы, якая пакуль-што застаецца свецкай дзяржавай, тры дні запар не выходзілі газеты.

**21 КРАСАВІКА**

Беларускі парламент аднавіў работу пасля выхадных з разгляду законапраекта аб прафсаюзах.

А Старшыня Вярхоўнага Савета С. Шушкевіч адбыў у Турцыю на святкаванне Дня незалежнасці гэтай краіны па запрашэнні спікера турэцкага парламента.

У Маскве скончыў работу з'езд народных дэпутатаў РСФСР (цяпер ужо — Расійскай Федэрацыі, ці Расіі). Ва ўпартай барацьбе дэпутатам ад апазіцыі ўдалося захаваць у прэамбуле і некаторых артыкулах спасылкі на... Савецкі Саюз і яго законы. Настальгія па былой імперыі ўзяла верх над довадамі розуму.

**22 КРАСАВІКА**

Да помнікаў правадыру рэвалюцыі і заснавальніку СССР Леніну, як і звычайна раней, былі ўскладзены кветкі — у тым ліку на Беларусі. Цікава, аднак, што па некаторых звестках сапраўдная дата яго нараджэння — 23 красавіка (10 красавіка па старым стылі). Уладзімір Ільіч у нейкім дакуменце, напісаным пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, дапусціў памылку. Але ж правадыры, як вядома, не памыляюцца. Таму 112-я гадавіна нараджэння Леніна прыхільнікамі «камуністычнага шляху» адзначалася з рэвалюцыйным энтузіязмам на дзень раней.

На сесіі Вярхоўнага Савета на пасадзе міністра абароны рэспублікі Беларусь зацверджаны генерал-лейтэнант П. Казлоўскі, які быў начальнікам штаба Беларускай ваеннай акругі.

**ФЕСТЫВАЛІ**

# У АДРОЗНЕННЕ АД ІНШЫХ...

Чым адрозніваецца балет ад іншых мастацтваў? Тым, што гэта — справа маладых, творчасць маладых. Талент артыста балета сталее хутка, і тых, каго сёння журы І Міжнароднага фестывалю «Я люблю балет», праведзенага ў Мінску, адзначыла як надзею на яркую будучыню, заўтра мы будзем называць «зоркамі» харэаграфічнага мастацтва. А іх не так і мала: мы нават не зможам згадаць тут усіх, чые імёны прагучалі на ўрачыстай цырымоніі закрыцця фестывалю 21 красавіка ў Акадэмічным тэатры оперы і балета Беларусі. Гэта юныя таленты з Уфы і Вільнюса, Кішынёва і Алма-Аты, Ташкента і Мінска, Саратава і Баку, Кіева і Краснаярска... Спонсары свята пастараліся адзначыць іхнюю працавітасць, адданасць мастацтву разнастайнымі заахвочвальнымі прызамі, сярод якіх былі веласіпед, халадзільнік, гадзіннік «з голасам», радыёпрыёмнік, электрафон...

А галоўны прыз фестывалю — «Крышталёвую балерыну» ды прэмію ў 10 тыс. рублёў — атрымаў калектыў Кіеўскага харэаграфічнага вучылішча. Сярод прызёраў і Беларускае харэаграфічнае вучылішча, дарэчы, дзякуючы ініцыятыве якога і адбылося гэта незабыўнае свята маладосці, падтрыманае канцэртнымі выступленнямі майстроў балета з рэспублік СНД ды іншых краін свету.

Як адзначыла дырэктар Беларускага харэаграфічнага вучылішча Людміла Каробкіна, якую ўдзельнікі і госці фестывалю з пашанай называлі «гаспадыняю балю», за 7 дзён у Мінску дзяўчаткі ды хлопцы добра пазнаёміліся адно з адным, пасябравалі, разам рэпеціравалі, разам выступалі, і ўжо сёння ёсць задумкі на будучае — наконт новых сустрэч і супольных творчых спраў. Фестываль «Я люблю балет» можа зрабіцца традыцыйным.

На здымках фотакарэспандэнта БЕЛТА Ю. ПАЎЛАВА — надзеі беларускага мастацтва: навучэнка нашага харэаграфічнага вучылішча Ірына ЦЫМБАЛ (у варыяцыях са «Спячай красуні») і Вольга КРУКОЎСКАЯ, Вольга ІВАНЧАНКА ды Вадзім ГЕРМАНОВІЧ, таксама навучэнцы вучылішча (у кампазіцыі «Заўзятыя сяброўкі» на музыку Я. Глебава).

# «НОВАЯ ГАЗЕТА» З НАВАПОЛАЦКА

Наваполацкі гарадскі Савет народных дэпутатаў стаў заснавальнікам «Новай газеты». Да жніўня мяркуецца яе выпускаць адзін раз на тыдзень, а затым — два. На беларускай і рускай мовах. Як бачна са звароту да чытачоў, новае выданне мяркуе як мага паўней адлюстроўваць шматграннае жыццё гараджан. У першым нумары прыцягвае ўвагу артыкул дэпутата, пісьменніка Н. Гальпяровіча. Аўтар дзеліцца трывогай аб нашым сённяшнім дні, у якім так мала спагады, узаемаразумення. У газеце разнастайная інфармацыя, у тым ліку і матэрыялы, што закранаюць пытанні нацыянальнага Адраджэння. Па ўсім відаць, чытачам прыйдзецца даспадобы і падборка «Пытанне — адказ», якую таксама мяркуецца зрабіць пастаяннай.

**Н. К.**

# ШЭСЦЬ ГОД І ТРЫ ДНІ

## Кангрэс «Свет пасля Чарнобыля» ў фрагментах

**14 красавіка, Мінск.**

З раніцы фае гасцініцы «Юбілейная» каля канферэнц-залы поўніцца гулам галасоў. Гучыць нямецкая, англійская, французская, чэшская, руская, беларуская гаворка... Тут сабраліся людзі з пятнаццаці краін свету — навукоўцы і бізнесмены, грамадскія дзеячы і святары, парламентарыі і медыкі. Многія сустрэлі сваіх старых знаёмых, многія сустрэліся ўпершыню.

Васіль Быкаў, які праз некалькі хвілін выступіць з прывітаннем да ўдзельнікаў міжнароднага кангрэса, гутарыць з Івонкай Сурвілай. Субяседніца яўна ўсхвалявана. Ёй было восем гадоў, калі яе сям'я была вымушана пакінуць Беларусь. І вось цяпер яна змагла прыехаць з Канады, дзе жыве і працуе, на родную зямлю. І прыехаць не ў якасці турысткі. Яна — сябра аргкамітэта кангрэса. Па ініцыятыве спадарыні Івонкі Сурвілы ў Канадзе некалькі год назад быў створаны Фонд дапамогі дзецям Чарнобыля. Дзякуючы актывістам фонду тысячы канадцаў — і не толькі з асяроддзя беларусаў — ахвяруюць сродкі на гуманную дапамогу. Сем'і канадскіх беларусаў прымалі ўжо дзяцей чарнобыльскай зоны, якія змаглі атрымаць за тысячы кіламетраў ад сваёй рэспублікі паўнацэннае лекаванне і адпачыць. І хоць гэта каштуе вельмі нятанна, тут з радасцю гатовы прыняць новых гасцей...

Аб маштабах трагедыі Чарнобыля доўгі час мала што ведалі на Захадзе (іх спрабавалі прынізіць і ў Савецкім Саюзе, і ў міжнароднай камісіі па атамнай энергіі — МАГАТЭ). Але з кожным годам праўда прабівала сабе дарогу, выклікаючы ў сумленных людзей у розных краінах імкненне дзейнічаць, рэальна дапамагаць. Ніхто ў свеце, бадай, сёння не зможа сказаць, што Чарнобыль яго не датычыць.

Дырэктар Інстытута радыебіялогіі АН Беларусі акадэмік Яўген Канапля ў сваім дакладзе на кангрэсе паказаў, што ўсплёскі радыеактыўнасці ў выніку катастрофы на ЧАЭС назіраліся не толькі ў еўрапейскіх краінах — напрыклад, у Балгарыі (у найбольшай ступені), Германіі, Францыі, Албаніі, але нават у Індыі і Японіі. Канечне, гэта было часовае і нязначнае павышэнне радыеактыўнасці (яго можна параўнаць са зменамі радыяцыйнага фону ў выніку ядзерных выпрабаванняў у атмасферы ў 60-я гады). І яно не йдзе ні ў якае параўнанне з тым, што здарылася на Беларусі, тэрыторыя якой у найбольшай ступені забруджана радыенуклідамі. Нават у Мінску ўзровень радыяцыйнай забруджанасці павысіўся ў 5—7 разоў у параўнанні з дааварыйным узроўнем. (На Гомельшчыне — прыкладна ў 14 разоў). Даследаванні беларускіх вучоных паказваюць, што радыяцыйная сітуацыя ў рэспубліцы ў бліжэйшыя гады не палепшыцца. А гэта азначае, што яшчэ многім і многім дзецям рэальна пагражаюць рак, іншыя небяспечныя хваробы, нервовыя стрэсы.

Таму, падкрэсліў акадэмік Канапля, міжнароднае супрацоўніцтва ў пераадоленні наступстваў Чарнобыля павінна быць разлічана на доўгія гады наперад. У многіх краінах гэта разумеюць і імкнуцца дапамагчы народу Беларусі ў яго выпрабаванні — самым цяжкім пасля мінулай вайны. Мабыць, невыпадкова, што асабліва шмат арганізацый, роднасных Беларускаму дабрачыннаму фонду «Дзецям Чарнобыля», сёння ў Германіі. Вельмі шырока яна была прадстаўлена і на кангрэсе. Сярод яго ўдзельнікаў былі такія вядомыя дзеячы, як эксперт ААН па сацыяльных даследаваннях «Дзеці — пасланцы Чарнобыля» Эрыка Шухарт, прадстаўнік сусветна вядомага

# Стары Менск займеў гаспадара?

Мінуўся год, як пры Саўміне рэспублікі створана Галоўнае ўпраўленне па рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў гісторыі і культуры. І сёння ўжо можна казаць, што справы з нацыянальным дойлідствам пойдуць урэшце на лад.

А зрабіць гэтакую выснову дазваляе нядаўні факт у дзейнасці ўпраўлення: сваё лагічнае завяршэнне атрымала новая ідэя, якая выводзіць сітуацыю з аднаўленнем занядбанага нацыянальнага багацця на ўзровень, адпаведны часу. А менавіта — рэстаўратары больш не спадзяюцца на матэрыяльны клопат збяднелай дзяржавы, а дэкляравалі пра стварэнне ў сталіцы рэспублікі акцыянернага таварыства «Стары Менск».

Заснавальнікі таварыства — Мінгарвыканком, згадваемае ўпраўленне, рамонтна-рэстаўрацыйнае ўпраўленне вытворчага аб'яднання «Мінскпрамбуд», творчыя майстэрні архітэктара Багласава, зразумела, сваіх грошай не маюць і намераны прыцягнуць у рэстаўрацыю небюджэтныя сродкі.

— У часы крызісу — гэта найбольш перспектыўны шлях, — лічыць адзін з ініцыятараў стварэння таварыства, намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення па рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў гісторыі і культуры пры Саўміне рэспублікі Ігар Чарняўскі.

— Але, прабачце, узнікае міжвольнае пярэчанне: што перашкаджала шаноўным спадарам з дзяржаўных устаноў займацца пошукам сродкаў на ратаванне спадчыны да арганізацыі «Старога Менска»?

— З дзяржавай бізнес супрацоўнічаць не хоча, і гэта натуральна ў нашай палітычнай неразбярысе. Іншая гаворка — недзяржаўныя структуры. У палітычнай і эканамічнай бязладзіцы ўзнікае і рэальная пагроза «дзікай прыватызацыі» помнікаў дойлідства і нават цэлых гістарычных кварталаў. Гэта вельмі зваблівыя для дзеячаў бізнесу кавалкі. І мы аб'ядналіся, каб выключыць усялякія намёкі на такія захопы нацыянальнага багацця. Адзіны ўласнік і гаспадар гістарычных забудоў—горад. А функцыі іх захавання, аднаўлення, жыццядзейнасці перададзены акцыянернаму таварыству. Яно канцэнтруе ў сваіх руках усе сродкі і размяркоўвае іх на кожны помнік так, каб гісторыя не толькі аднаўлялася і захоўвалася, але і каб была паўнацэннай часткай жывога арганізма горада, а не толькі аб'ектам захаплення і пашаны.

«Стары Менск» — першае такое таварыства рэстаўратараў рэспублікі. Увасобленая ў сталіцы ідэя актыўна прапрацоўваецца ў Гародні, Віцебску, Полацку, Магілёве, Навагрудку, зацікаўленне выявілі ў іншых гістарычных гарадах Беларусі.

Жыхары Менска нядаўна адсвяткавалі 925-годдзе свайго горада. Сёння ён вельмі прыблізна нагадвае месца такога паважнага веку. Дажывём да наступнага юбілею, пабачым: ці апраўдаюць акцыянаваныя рэстаўратары тыя вялікія надзеі, што нарадзіла вестка аб займенні горадам свайго гаспадара?

**Валянціна АРЛОВА.**

# ВЕЛІКОДНАЯ ВЫСТАВА

**Напярэдадні праваслаўнага Вялікадня ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі рэлігіі ў Гродне разгорнута экспазіцыя велікоднай атрыбутыкі. Тут прадстаўлена каля 250 паштовак і 100 яек-пісанак з дрэва і фарфору, а таксама формы для велікодных булак, падстаўкі для яек, жолабы для іх катання. Калекцыя складзена з фондаў і адносіцца да XVIII—XIX стагоддзяў. Экспанаты ўражваюць сваёй прыгажосцю, незвычайнасцю, арыгінальнасцю, разнастайнасцю.**

Галоўны захавальнік музея Ніна Іванаўна Лешчанок дэманструе экспанаты выстаўкі. Фота Ю. ПАЎЛАВА (БЕЛТА).

**БЕЗ КАМЕНТАРЫЯ**

# УКАЗ

## Прэзідэнта Украіны аб неадкладных захадах да сацыяльнай абароны дзеячаў літаратуры і мастацтва ва ўмовах пераходу да рынкавых адносін

З мэтай сацыяльнай абароны дзеячаў літаратуры і мастацтва ва ўмовах пераходу да рынкавых адносін ПАСТАНАЎЛЯЮ:

1. Вызваліць з 1 студзеня 1992 года ад выплаты падатку на даходы і ўклады ў спецыяльныя фонды творчыя саюзы Украіны (пісьменнікаў, кампазітараў, мастакоў, тэатральных дзеячаў, кінематаграфістаў, фотамастакоў, журналістаў, архітэктараў, майстроў народнага мастацтва, дызайнераў), Усеўкраінскі музычны саюз, а таксама прадпрыемствы і арганізацыі, якія створаны імі для выканання статутных заданняў.

2. Кабінету Міністраў Украіны вырашыць пытанні:

аб забеспячэнні выдавецтва «Українські письменник», выдавецтва дзіцячай літаратуры «Веселка» і перыядычных выданняў Саюза пісьменнікаў Украіны паперай на ўзроўні 1991 года;

аб павышэнні ставак аўтарскага ганарару за выданні, публічныя выкананні і іншае выкарыстанне твораў літаратуры і мастацтва;

аб аказанні фінансавай дапамогі фонду «Літературні скарбниці» Саюза пісьменнікаў Украіны;

аб выдзяленні фондам творчых саюзаў Украіны сродкаў для аказання матэрыяльнай дапамогі іх членам;

аб памеры адлічэнняў у фонды творчых саюзаў Украіны за выкарыстанне твораў літаратуры і мастацтва членаў гэтых саюзаў;

аб стварэнні дзяржаўнага агенцтва Украіны па аўтарскіх і сумежных правах.

3. Вызваліць з 1 студзеня 1992 года ад выплаты падаткаў на даходы і ўклады ў спецыяльныя фонды Украінскі фонд культуры, а таксама прадпрыемствы і арганізацыі, створаныя ім для выканання статутных заданняў.

4. Указ набывае сілу з дня яго падпісання.

**Прэзідэнт Украіны Л. КРАЎЧУК.**

6 лютага 1992 г.

# З таранам на царкву

Сінод Рускай Праваслаўнай Царквы ўстанавіў на Беларусі Гарадзенска-Ваўкавыскую архіепархію. Сінод экзархата хадайнічаў перад Гарадзенскім аблвыканкомам аб перадачы пад епархіяльнае ўпраўленне адміністрацыйнага будынка, што ў базыльянскім комплексе. Спадар Д. Арцыменя падпісаў адпаведнае распараджэнне.

Супраць гэтага распараджэння выступілі ў выканкоме гарадскога Савета і супрацоўнікі Музея гісторыі рэлігіі, што месціцца ў базыльянскіх мурах, бо лічаць, што гэта — толькі першы крок, што РПЦ захопіць потым і кляштар.

І вось 2 красавіка натоўп праваслаўных вернікаў, падбухтораны духавенствам, уварваўся ў адміністрацыйны будынак, выкінуў мэблю на вуліцу. Умяшалася міліцыя. На гэтым пагромная дзейнасць не спынілася. 6 красавіка група праваслаўных на чале з духоўнай асобай пачала штурм уніяцкай царквы Раства Багародзіцы пры базыльянскім кляштары. Каб уварвацца ў храм, у якасці тарана выкарыстоўвалі шпалу. Мала таго, удзельнікі штурму пабілі пажылога уніяцкага святара а. Віктара Данілава.

Пра падзеі ў Гародні напісала газета «Свабода», пра іх гаварыў у Вярхоўным Савеце народны дэпутат А. Трусаў.

Ці пакліча хто архіепіскапа Гарадзенскага і Ваўкавыскага, ці зробіць хто яму папярэджанне? Пракуратура маўчыць. А тым часам музей не працуе: работнікі баяцца, што натоўп можа ўварвацца ў кляштар. Уніяты ж думаюць, як ім бараніцца.

**Ул. інф.**

Напярэдадні гэтых падзей А. Сідарэвіч напісаў артыкул «Святыя айцы і грэшныя камуністы», які друкуецца ў сённяшнім нумары «ЛіМа» (стар. 5).

фонду імя Генрыха Бёля Рэнэ Бёль, член Еўрапарламента Курт Вітэнхоф. Многія вядомыя палітычныя дзеячы Германіі прыслалі на кангрэс прывітальныя тэлеграмы. З прывітаннем на кангрэсе выступіў пасол Германіі Райнхардт Краўс...

**15 красавіка, Чачэрскі раён.**

У вёсцы Залаўе з інтурыстаўскага аўтобуса высаджваецца невялічкі дэсант удзельнікаў кангрэса. Амерыканка Фрэн Уінфрэй цікавіцца ў аднаго з мясцовых жыхароў умовамі тутэйшага жыцця (забруджанасць у раёне — ад 15 кюры і вышэй). Пытаецца, адкуль бяруць прадукты. «У нас тут усё сваё, — адказвае гаспадар дома. — Вырошчваем буракі, бульбу. Трымаю карову, свінняў...». Ні пра які дазіметрычны кантроль гаспадар не ведае. Адказаць, калі і што ён даведаўся пра аварыю, пра радыяцыю, таксама нічога не можа.

Доктар Уінфрэй — дырэктар Цэнтра навучання дарослых у Маямі (штат Фларыда). Яе бабуля — родам з Гродзеншчыны. У яе ёсць свой праект супрацоўніцтва (як і ва ўсіх амаль удзельнікаў кангрэса ў Мінску) — наладзіць кантакты паміж школамі на Беларусі і ў Штатах...

У вёсцы Залаўе ўзровень радыяцыі адносна невысокі. А ў Дубраўцы, за некалькі кіламетраў, дазіметр на асфальце паказвае 240 мікрарэнтген. Людзі адсюль ужо адселены. Большасць кінутых хат будзе разабрана, а матэрыялы прададуць дачнікам. Ніхто гэты факт тут не хавае.

На тэрыторыі калгаса імя Кірава, дзе знаходзяцца гэтыя вёскі, з 13200 гектараў зямлі ў севазвароце засталося ўсяго 600. Астатнія землі апрацоўваць забаронена. Паліць леташнюю траву і салому на палях таксама забаронена. Тым не менш, на кожным кроку — чорныя плямы ад падпалаў.

«У сярэдняй школе ў калгасе яшчэ нядаўна вучылася 160 чалавек. Сёння засталося 52, — расказвае работнік школы. — Людзі ад'язджаюць. Прытым самі — на свой страх і рызыку. Праграма адселення і матэрыяльнай дапамогі ў раёне апошнім часам згортваецца».

Замежных гасцей — сенатара з Бельгіі М. Дардэн, швейцарскага хіміка М. Шапата, мэра горада Гаўлічкаў Брод з Чэха-Славакіі Т. Галенду і Ф. Уінфрэй — запрашаюць у школьны этнаграфічны музей. Адзін з настаўнікаў з годнасцю паказвае невялікую, але з любоўю падабраную калекцыю прылад працы, узораў ткацтва, хатняга начыння, адзення. Частку экспанатаў аддаюць на памяць гасцям. Школа сёлета закрываецца назусім, і наўрад ці каго зацікавіць лёс калекцыі.

Пасля кароткага наведання магільніка (радыеактыўны друз, сабраны ў час дэзактывацыі, загорнуты ў цэлафан і засыпаны не надта тоўстым пластам зямлі) «экскурсія» ў забруджаную зону закончана. Прашу падзяліцца сваімі ўражаннямі Марціну Дардэн — члена парламента Бельгіі ад партыі «зялёных», прадстаўніка бельгійскай асацыяцыі «Дзеці Чарнобыля» (Летась па лініі асацыяцыі ў гэтай краіне прайшлі аздараўленне 450 дзяцей з Магілёва, Гомеля і Веткі).

Па словах мадам Дардэн, яе ўразіла адчуванне поўнай дэзарганізацыі і бяздзеяння з боку мясцовых улад. Яна выступае за дапамогу Захада. Але за дапамогу эфектыўную. А гэта ўжо залежыць не толькі ад тых, хто яе аказвае, але ў першую чаргу і ад тых, хто ёй будзе карыстацца.

Напярэдадні Марціна Дардэн выступіла на кангрэсе з дакладам, галоўнай мэтай якога было прыцягнуць увагу да альтэрнатыўных крыніц энергіі і асабліва — да неабходнасці энергію эканоміць. (На яе думку, у нас яна выкарыстоўваецца проста марнатраўна). Дарэчы сказаць, гэтая тэма закраналася і на сустрэчы Старшыні Вярхоўнага Савета Беларусі С. Шушкевіча з групай замежных удзельнікаў кангрэса. Яго сцвярджэнне, што развіццю ядзернай энергетыкі на Беларусі няма альтэрнатывы і што рэспубліцы патрэбны заходнія тэхналогіі дзеля гэтага, выклікала ва ўдзельнікаў сустрэчы неўразуменне. Агульнае меркаванне калег выказаў у інтэрв'ю для журналістаў вядомы канадскі сацыёлаг Дэвід Марплз: «Арыентацыя на ядзерную тэхналогію для Беларусі выглядае трагічнай памылкай у святле ўрокаў чарнобыльскай катастрофы». Яшчэ большае неўразуменне выклікала ў прафесара і іншых удзельнікаў сустрэчы пазіцыя старшыні парламента, якая заключаецца ў тым, што вырашэнне чарнобыльскіх праблем — задача дзяржавы, і таму ніякая дапамога ніякіх грамадскіх арганізацый тут не патрэбна. (Між іншым, на кангрэсе прыводзіліся вынікі апытання сярод жыхароў пацярпеўшай зоны, якія паказалі: звыш 64 працэнтаў апытаных лічаць найбольш эфектыўнай дапамогу фонду «Дзецям Чарнобыля». І толькі 11 працэнтаў назвалі ўрадавыя органы).

Пры такіх адносінах ці варта здзіўляцца, што ніхто з запрошаных прадстаўнікоў афіцыйных органаў так і не з'явіўся на кангрэсе. А кіраўніцтва Дзяржкамчарнобыля ў час яго правядзення правяло сваю асобную прэс-канферэнцыю, фактычна праігнараваўшы і сам кангрэс і ўсіх яго ўдзельнікаў.

І гэта яшчэ не галоўнае. Выезд дзяцей на адпачынак і лячэнне за мяжу цяпер, аказваецца, можа адбывацца толькі з дазволу дзяржаўных органаў. Даведаўшыся аб гэтым, удзельнікі кангрэса — звыш ста чалавек — прынялі заяву аб тым, што такое рашэнне супярэчыць агульнапрынятым міжнародным нормам і праву.

**16 красавіка, Мінск.**

Кангрэс адкрываўся малітвай, якую прачытаў патрыяршы экзарх Беларусі мітрапаліт Філарэт. Завяршыўся ён таксама малітвай. Яе прамаўляў айцец Ігар — святар храма ўсіх смуткуючых, што ўзводзіцца на грошы прыхаджан у Мінску.

А перад тым удзельнікі форуму ўсе разам спявалі вядомую песню, своеасаблівы міжнародны гімн «зялёных» і пацыфістаў «Мы пераможам». Старшыня Беларускага дабрачыннага фонду «Дзецям Чарнобыля» і старшыня аргкамітэта кангрэса Генадзь Грушавы падзякаваў усім, хто дапамог правесці форум і ўзяў удзел у яго рабоце. Сам факт правядзення кангрэсу ў Мінску, гаварыў ён, сведчыць пра тое, што важнасць праблем Чарнобыля, нягледзячы на шматлікія іншыя праблемы, прызнаецца міжнароднай грамадскасцю. І палітычная кан'юнктура тут ні пры чым.

На кангрэсе быў створаны міжнародны савет дапамогі дзецям Чарнобыля, у які ўвайшлі прадстаўнікі 8 краін і які адкрыты для ўсіх.

Ёсць і яшчэ адзін аспект, пра які нельга не сказаць. Старшыня БНФ Зянон Пазняк, выступаючы на кангрэсе (дарэчы, народны фронт стаяў, як вядома, ля вытокаў стварэння фонду «Дзецям Чарнобыля»), гаварыў аб небяспецы, не менш страшнай за радыяцыю — аб духоўным Чарнобылі. Яго думку падтрымала і Івонка Сурвіла. «Трэба працаваць не толькі над фізічным выратаваннем людзей нашых, — сказала яна, — але таксама і духоўным выратаваннем».

Шэсць гадоў мінула пасля катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Што маглі змяніць тры дні, на працягу якіх працаваў кангрэс «Свет пасля Чарнобыля»? Мала што, вядома. Ды, можа, свет у нечым змяніўся ўсё ж да лепшага? Хоць крыху?

**Віталь ТАРАС, спецыяльны карэспандэнт «ЛіМа».**

З ПАЭТЫЧНАЙ ПОШТЫ

Мікола ЛЯШЧУН

## «МОЙ КРАЙ— СВЯТЫ ПАГОСТ...»

Дасылаю не вершы, а журбу маю, боль асірацелай душы, у якой адабрана жыццядайная крыніца—бацькоўскі кут. Мая вёска Губарэвічы, што ў Хойніцкім раёне, апусцела навечна...

г.п. Лагойск.

●

Пішу пра тое, што баліць
І часта сэрца мне трывожыць,
Што лашчаць вечна Прыпяць з Сожам
І што не перастану сніць.
Маленствам змераныя межы
Маёй ахутаны тугой.
Я — іх зняволены ізгой,
А ўсё адно ад іх залежу.
Пяю, ці плачу, ці нямею —
Іх дух жыве ў маёй душы.
Натхнёна шэпчуць мне: «Пішы!».
І я пішу, на што хварэю.

●

— Тата, а чаму мы ніколі не былі ў бабы Марусі?— пытаецца мая шасцігадовая дачка Наталка.

Я не сказаў малой нічога,
У сэрцы тулячы слязу.
Аддаў бы я, дачушка, многа
За растаптаную красу.
Хачу даплакаць да канца
Свой боль і гнеў, свае пакуты,
Што горш смяротнага свінца
Мне аблілі жыццё атрутай.
Няхай жахнецца вінаваты,
Што я пяю, як галашу,
Што сірацеюць гнёзды-хаты
І скаланае боль душу.
Бо не аплачуць так праз век
Маю пакутніцу зямлю.
Яна загінула навек,
А я люблю яе, люблю!

●

Завеямі дагледжаны
Клады палешукоў.
Здаюцца хвоі вежамі
Пад коўдраю снягоў.
Так вее старажытнасцю
Нямая далячынь,
І пахне добра жытнасцю.
Жыве, але маўчыць.
Нязвыкла, страшна, дзіка.
Душа ў мяне баліць,
Што вёскі мруць без крыку
І не папросяць піць.
Мой край — святы пагост,
Чужэе, сірацее.
У вечны горкі пост
Свой плача і гавее.

●

На вокнах свежыя крыжы.
Іду, як немай цаліною.
Святлейшы божа, памажы!
Палеткі пахнуць збажыною.
Тут нехта ўсё яшчэ жыве,
Хоць свет бязлюдны ім нямілы.
Угледзеў яблыкі ў траве —
Іх абмінуць не маю сілы.
Хай пішуць, быццам небяспечна,
Я, каб свой кут да скону сніў,
Каб водар бацькаўшчыны вечна
Вярэдзіў сэрца, адкусіў
Палесся ядраны наліў.

●

Хто сказаў, што жыцця тут не будзе бясконца!
Ён чужынец на гэтай пакутнай зямлі.
Мы рыфмуем нязвыклае «стронцый» і «сонца»...
Вы б у Хойніках нашых разок пабылі.

Хай бы глянулі ў вочы здзічэлых палеткаў
І лясоў пракаветных паслухалі шум,
Што галосяць сіротамі ўзімку і ўлетку,—
Вы б адчулі Палесся жывую душу.

Хто сказаў, што тут жыта не ўзыдзе ніколі,
Замест вёсак устане дубняк малады!
Праз вякі хоць, я веру, тужлівы да болю
Голас продкаў кагосьці пакліча сюды!

●

Ля родных падворкаў схіляем галовы,
Нібы на пагостах ля даўніх крыжоў.
І коцяцца слёзы — балючыя словы:
Ці ўдасца калісьці прыехаць ізноў!

Бывайце сцяжынкі, буслянкі, азерцы!
Бывай, салаўіны і жаўранкаў спеў.
Я вас услаўляў ад натхнёнага сэрца,
А лепшых радкоў напісаць не паспеў.

●

Мрою дзяцінства ласкавага вёсны,
Рог пастуховы разбуджвае сны.
Ткалі нам долю бабуліны кросны,
Плачуць забытыя сёння яны.

Сціхлі музыкі, і песні знямелі,
Высахлі вочы ад слёз назусім,
Гойдае даўняе рэха арэлі,
І не зацепліцца з комінаў дым.

Доля мая — незагойная рана.
З бацькам і маці жыву сіратой...
Больш не страчае падмецены ганак.
Подых чужыніны ў хаце пустой.

З ПОШТЫ «ЛіМа»

# БОЛЬ НЕ ЗАТУХАЕ...

Ганіце з душ угодлівы спаной,
У нас багата прад жыццём віны...

Гэтыя радкі з паэтычнага зборніка «Палескі смутак» Міколы Мятліцкага прыгадваюцца мне зноў і зноў. І тым часцей, чым бліжэй 26 красавіка — самотная гадавіна чарнобыльскай бяды, калі нябачанай сілай сваёй мірны — так, для нас, тых, дачарнобыльскіх, мірны — атам люта шугануў па прасторах Бацькаўшчыны. І роднае, дарагое, звыклае назаўсёды засталося пад яго попелам, які пагнаў маіх землякоў нязведанымі шляхамі ратавання.

...Толькі 4 мая 1986 года пачалося адсяленне з 30-кіламетровай зоны вакол ЧАЭС. Групы ўпаўнаважаных ад раённых улад, адну з якіх узначальваў я, зранку раз'ехаліся па блізкіх ад АЭС вёсках Хойніцкага раёна. Услед ішлі калоны аўтобусаў, грузавікоў, абсталяваных для вывазу жывёлы. Бяда насядала на ўсё жывое. Яе гарачае дыханне зыходзіла ад разбуранага рэактара, над якім пастаянна віселі верталёты. А тут, у вёсках, ішло звыклае жыццё. У дварах стаялі мяхі з насеннай бульбай, яркай зелянінай на вокнах шугала расада памідораў, у гародчыках былі ўскапаны першыя грады... На інструктажы нам казалі, што адсяленне будзе часовым, праз месяц-другі людзі вернуцца ў свае хаты. Сапраўднага ўяўлення аб маштабах трагедыі мы не мелі. Няпроста было і гаварыць з людзьмі. Некаторыя з іх ужо сабралі неабходныя рэчы ў вузельчыкі, чакалі ад'езду. Пра часовасць эвакуацыі ніхто і слухаць не хацеў. Старэйшыя называлі гэта другой вайной, толькі без стрэлаў, прадказвалі, што ніколі больш не вернуцца ў родныя хаты.

Адсяленне разгортвалася імкліва. Адна за адной з Чамкова, які ў трох кіламетрах ад Чарнобыльскай АЭС, адыходзілі машыны з жывёлай. Недзе каля апоўначы сабраліся ля аўтобусаў людзі. Перад ад'ездам яны папрасілі аб адным: спыніцца каля могілак, каб развітацца з роднымі. Тыя трывожныя хвіліны растання — пакутнага, жорсткага і такога балючага — назаўсёды засталіся ў маёй памяці. Не прымалі душа і сэрца таго, што здарылася, ніяк не спалучалася яно з вясной, з квітнеючым вакол жыццём...

За гады сваёй карэспандэнцкай работы не адзін раз даводзілася бываць тут, пісаць пра гэтых працавітых і палаяшуцку шчырых людзей, захапляцца іх адданасцю земляробскай справе, спрытам, гаспадарлівасцю. Адметнасць гэтага куточка Палесся яшчэ і ў незвычайнай яго прыгажосці. Бачыў, як летам на берагах Прыпяці абсталёўваліся цэлыя палатачныя гарадкі адпачываючых. Лясы і лугі шчодра адорвалі людзей ягадамі, грыбамі і духмянымі зёлкамі. Без добрай здабычы не ад'язджалі адсюль ні рыбакі, ні паляўнічыя. Неўзабаве тут павінна было пачацца будаўніцтва зон адпачынку. Але лёс распарадзіўся інакш. Самотна, што зона прыгажосці стала зонай адчужэння. Павуцінне калючага дроту адмежавала гэтыя курортныя мясціны ад людзей. Зарастаюць сцежкі-дарожкі, у палоне быльнягу сядзібы і вёскі.

Немагчыма сёння падлічыць страчанае намі ў матэрыяльным выражэнні, аднак куды большыя страты маральныя. Выгнаныя бядою са сваіх родных мясцін людзі праз гады і адлегласці не знаходзяць душэўнай раўнавагі. Я часта сустракаюся з землякамі-перасяленцамі. Пра што б мы ні гаварылі, кожны раз прыгадвалі яны радзіму, роднае Палессе. Сяк-так прыжываюцца на новых месцах тыя, каму пашанцавала пасяліцца разам са сваімі аднавяскоўцамі, суседзямі. Астатнім не прыносіць спакою новая зямля, ірвуцца яны дамоў...

Памятаю, калі пачыналася адсяленне з забруджанай зоны, праводзілася апытанне людзей. Большасць выказвала жаданне пераехаць на новае месца жыхарства ўсім калгасам, саўгасам, ці вёскай. Але час, жыццё і начальства дыктавалі свае ўмовы. Нават тыя, хто асабліва імкнуўся знайсці магчымасць захаваць цэльнасць калектываў і гаспадарак, вымушаны былі ў рэшце рэшт адмовіцца ад гэтага. Дырэктар саўгаса «Стралічава» А. Мартыненка і народны дэпутат былога СССР У. Кашперка ў пошуках месца, куды можна было б пераехаць саўгасам, аб'ездзілі ледзь не ўсю рэспубліку. Але не знайшлося жадаючых прыняць гэты моцны, здаровы, адзін з лепшых у раёне, калектыў. Людзі пачалі перасяляцца хто куды змог. Сёння засталіся тут лічаныя сем'і, а дзейнічаюць на тэрыторыі саўгаса толькі спіртзавод, пабудаваны яшчэ ў 1912 годзе, ды невялікая транспартная брыгада.

Якім жа было маё здзіўленне, калі нядаўна ўбачыў у рэспубліканскім друку аб'яву аб наборы рабочых у... адселены саўгас «Стралічава». Няўжо камусьці прыйшла ў галаву вар'яцкая ідэя адрадзіць саўгас на ягоных руінах, на забруджаных землях? Парадокс дый годзе. Зрэшты, пры цяперашнім эканамічным і палітычным развале мы сталі амаль што вольнымі на ўчынкі. Кожны што хоча, тое і робіць. У тым ліку і глупства. Не думаючы, што за гэтым стаіць здароўе, жыццё канкрэтных людзей. На вачах чарнобыльскія праблемы пачынаюць, як ні дзіўна, пераходзіць з разраду агульнанародных у вузкарэгіянальныя. І тады нараджаецца «стралічаўскі варыянт», які інакш, як крывадушшам і блюзнерствам, не назавеш.

Між тым праблема перасялення людзей з забруджаных раёнаў усё больш абвастраецца. Вядома, можна знайсці нямала аргументаў для апраўдання, для абгрунтавання прычын, па якіх да гэтага часу не адселены жыхары вёсак, дзе практычна згасае жыццё — зачыняюцца магазіны, ФАПы, пункты бытавога абслугоўвання. Пакінутыя хаты засяляюцца бадзяжнікамі, якія трымаюць у страху адзінокіх старых, што засталіся ў вёсках. Ахоўныя міліцэйскія пасты на ўездах у такія вёскі лёгка аб'ехаць, абысці прасёлкамі, і ліхадзеі гаспадараць у іх, вывозяць усё, што трапляе пад руку, прадаюць у чыстай зоне. І распаўсюджваецца зараза па ўсёй рэспубліцы. Мясцовым уладам не па сіле вырашэнне гэтай праблемы. Да сёння няма нават сістэмы ліквідацыі пакінутых вёсак. Відаць, доўга ім яшчэ стаяць на страчанай зямлі жахлівымі знакамі нашай нядбаласці.

Сёлета толькі з пяці забруджаных радыяцыяй раёнаў Гомельскай вобласці трэба адсяліць каля 13 тысяч чалавек. Жыллё цяпер дастаецца ўсё цяжэй і цяжэй. А як жа будзе з будаўніцтвам яго заўтра, ва ўмовах рынку? Са сродкамі зараз усюды складана. Дзяржаўны бюджэт ледзь дыхае. У спадчынніцы СССР—Садружнасці Незалежных Дзяржаў няма пакуль згоды нават у тым, як наладзіць элементарныя эканамічныя сувязі. Агульнасаюзныя ж праграмы, у ліку якіх была і чарнобыльская, забыты зусім. Няма нам на каго спадзявацца, толькі на адвечныя свае цягавітасць, працавітасць, цярплівасць...

Не так даўно мне давялося зноў пабываць на Хойніччыне. З кожным прыездам не далічваюся тут сваіх былых сяброў, даўніх знаёмых, блізкіх і сваякоў. Пераехалі (у лепшым выпадку). Прыгадваю, з якім жаданнем яны некалі прыязджалі сюды жыць, працаваць. Нават калі з Мінска, з самога ЦК «прывозілі» сакратароў райкома, лічылася, што вылучэнцу пашанцавала. Яшчэ б, такі багаты край, такія працавітыя і добрыя людзі тут.

Выганяе бяда маіх любых землякоў з родных хат. Распалася, расфарміравана ўжо 8 калгасаў і саўгасаў, згасае жыццё і ў іншых. На пажытках сядзяць многія сем'і і ў вёсках, і ў райцэнтры. У раённай бальніцы застаўся толькі адзін хірург. Зачыняюцца ФАПы ў вёсках, у школах выкладаюцца не ўсе прадметы: няма медработнікаў, няма настаўнікаў. Стаяць пад плотам трактары без механізатараў, машыны без шафёраў. У бядотным раёне ўлады засталіся практычна сам-насам з горам. Падпарадкаваныя ім службы цяпер ледзь паспяваюць выдаваць разнастайныя даведкі, афармляць дакументы на адсяленне людзей, падтрымліваць у рабочым стане наяўныя сістэмы жыццезабеспячэння.

Вялікі дзякуй трэба сказаць усім тым, хто трымае зараз на сабе ўвесь націск чарнобыльскай бяды. Яны і ў гэтых умовах не губляюць аптымізму, хапае ў іх духу і на працу, і на адпачынак. Якраз тады, калі я быў у Хойніках, тут праходзіў вечар, прысвечаны лаўрэату Ленінскай прэміі, народнаму пісьменніку Беларусі, земляку — Івану Мележу. Быў дзень яго памяці. Памятаюць тут пра сваіх землякоў. Не забываюць і землякі пра іх. Гэта ім прысвяціў свой новы зборнік «Палескі смутак», вылучаны, дарэчы, на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Беларусі, паэт Мікола Мятліцкі.

«Палеская хроніка» Мележа і «Палескі смутак» Мятліцкага — пра вас, добрыя і шчырыя людзі, мае землякі. У іх — ваша гісторыя, ваша веліч, ваша жыццё. Такое рознае, але тыпова паляшуцкае, у якім заўсёды было мала месца шчасцю, шмат — клопатам, турботам, працы, а зараз і смутку...

Арсен САКУН.

г. Мінск.

Фота У. ШУБЫ (БЕЛТА).

# СВЯТЫЯ АЙЦЫ І ГРЭШНЫЯ КАМУНІСТЫ

## Адносіны дзяржавы і царквы патрабуюць карэкціроўкі

**З**НАЁМЫ пісьменнік — хрысціянін, паслядоўны талстовец — увесь час пасмейваецца з таго усеагульнага захаплення афіцыйным праваслаўем, якое ахапіла нашу інтэлігенцыю. Слухаючы яго, я не магу не згадзіцца, у прыватнасці, з тым, што РПЦ па-ранейшаму ўласцівы рускі нацыяналізм, нетаперантнасць да іншых вызнанняў і сервілізм у дачыненні да ўладу маючых.

Пачнём, бадай, з апошняга. Ужо даўнавата (14 снежня 1990 г.) я пісаў у «ЛіМе»: «Мне дакладна вядома, што нашага земляка а. Уладзіміра Русака, які напісаў грунтоўную працу пра новых пакутнікаў, «органам» выдаў адзін мітрапаліт, чыю «благообразную» бараду мы часта бачым на тэлеэкранах». Я меў на ўвазе Піцірыма Валакаламскага і Юр'еўскага. Цяпер выявілася агентурная мянушка гэтага «пастыра». Выявілася, што ў мітра-ПАЛІТБЮРО (гэтак семінарысты называюць Свяшчэнны Сінод РПЦ) засядаюць, прынамсі, тры «стукачы».

У той самай лімаўскай нататцы я пісаў, што РПЦ мае даўнія традыцыі супрацоўніцтва з ахоўнікамі існуючых парадкаў. Ці не ад часу Пятра І, калі духавенству было загадана выдаваць таямніцу споведзі. І Царква не пратэставала супраць гэтага. Духавенства з поспехам выдавала таямніцу і пры цары, і пры бальшавіках. Дыякан Уладзімір Русак, чыім духаўніком з'яўляўся Піцірым, «пагарэў» якраз на споведзі: узяў ды расказаў, што піша кнігу пра дзеячаў Царквы — ахвяраў бальшавіцкага тэрору.

Так, быў «гераічны перыяд» у гісторыі РПЦ. Перыяд, асвечаны імёнамі Патрыярха Ціхана, салавецкіх архірэяў, але верх у Царкве ўзялі прыхільнікі і паслядоўнікі мітрапаліта Сергія (Старгародскага), які ў 1927 годзе заклікаў да супрацоўніцтва з савецкай уладай. г. зн. з бальшавікамі, і пазней стаў за гэта Патрыярхам. Думаю, Руская Праваслаўная Царква за мяжою дарма ўпікае савецкай РПЦ грэх сергіянства. Грэх супрацоўніцтва з тыранамі Царква ўзяла на сябе даўно. Успомнім хоць бы тое, як дапамагаў Мураўёву-вешальніку мітрапаліт Іосіф Сямашка (так і хочацца напісаць: адзін рэнегат другому рэнегату). Успомнім, як апяваў «подзвігі» вешальніка віцебскі архірэй. Герцэн, надрукаваўшы «слова» гэтага іерарха ў «Колоколе», даў кароткі каментарый, усяго на два словы: «Опошление православия».

Пішу гэтыя радкі перад Архірэйскім Саборам РПЦ. На ім збіраюцца кананізаваць ахвяраў бальшавізму — вялікую княгіню і манашку Лізавету Фёдараўну, мітрапаліта Веніяміна Петраградскага... Але мяне больш цікавіць, ці пазбавіць Сабор сану памочнікаў КПСС-КДБ—мітрапалітаў Піцірыма і Ювеналія? Ці расстрыжэ фальшывага манаха, мужа пры жонцы, бацьку двух дзяцей, агента КДБ і адначасова экзарха Украіны Філарэта? Гэта было б ачышчэнне Царквы ад грэху супрацоўніцтва з атэістычным рэжымам.

Гэта не азначае, што Царква пазбавіцца ад іншых цёмных плямаў — ад рускага нацыяналізму і нетаперантнасці да іншых вызнанняў.

Нядаўна была тэлеперадача, у якой бралі ўдзел экзарх Беларусі Філарэт і ксёндз Уладзіслаў Завальнюк. Цікава было слухаць мітрапаліта, які, паводле ягоных слоў, яшчэ не гатовы перайсці на беларускую мову. Не гатовы — і ўсё! Кажуць, уладыка ведае старажытныя і замежныя мовы, а вось беларускай авалодаць не змог, хоць і жыве ў нас другое дзесяцігоддзе.

Асмелюся сцвярджаць: экзарх Філарэт не бачыць патрэбы ў беларускай мове. Памятаеце, колькі было размоў аб перакладзе кніг Святога Пісання на мову нашага народа? Аціхлі размовы, заглухла справа. Праваслаўны хрысціянін Васіль Сёмуха мусіць прызнацца, што ад яго патрабавалі немагчымага: пісаць Іісус, **блага** (у сэнсе «благо») і г. д.

Або вазьміце нядаўнюю падзею — прыезд на Бацькаўшчыну мітрапаліта Мікалая, першаіерарха Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы за мяжою. Запрасіў яго, вядома ж, не мітрапаліт Філарэт. Экзарх меў з уладыкам Мікалаем толькі прыватную гутарку, дазволіў служыць толькі ў сваёй дамовай царкве ды ў саборы святых апосталаў Пятра і Паўла, дзе беларускае брацтва Трох Віленскіх Пакутнікаў аніяк не можа дамагчыся цалкам беларускай літургіі. У кафедральны сабор мітрапаліта Мікалая мітрапаліт Філарэт не паклікаў. Вось вам і стаўленне да братоў па веры. Не тыя, выходзіць, браты.

Асабіста я гэтаму не здзіўляюся. Добра ведаю, як паставілася РПЦ да Беларускай Аўтакефальнай Царквы ў 20-я гады. Тая аўтакефалія была абвешчана ў 1922 годзе. Будзьце пэўныя, што экзархат не адзначыць 70-я ўгодкі падзеі, не памяне мітрапаліта Мелхіседэка ды іншых архірэяў, закатаваных сталінскімі апрычнікамі. (Ёсць звесткі, што расправіцца з Мелхіседэкам АДПУ дапамог мітрапаліт Сергій. Той самы).

Калі ўжо такое стаўленне РПЦ да сваіх братоў па веры, якога ж стаўлення можна чакаць ад яе да «инославных» вызнанняў?

Адзін жыровіцкі семінарыст са скрухаю апавядаў мне, якая літаратура прадаецца ў гэтым мястэчку. «Няма хрысціянскай любові», — казаў ён. Мне было й да таго вядома, што ў цэрквах вядзецца антыуніяцкая прапаганда. Паведамленне семінарыста толькі пацвердзіла мае веды. А потым з'явіўся артыкул выкладчыка семінарыі а. Сергія Гардуна («ЛіМ», 14 лютага 1992 г.).

З а. Сергіем я знаёмы завочна. Замаўляў, а потым рэдагаваў ягоны артыкул для «Крыніцы» пра адноўленую праваслаўную семінарыю. Так сказаць, уніят прапагандаваў праваслаўе. Меў надзею, што а. Сергій таксама выявіць сваю талерантнасць да «инославных». Ды няма верацярпімасці ў праваслаўі.

Артыкул кандыдата багаслоўя, яшчэ маладога чалавека, поўны старых і збітых аргументаў.

**Праваслаўная Царква Вялікага княства Літоўскага, сцвярджае а. Сергій, «поўнасцю адпавядала этнакультурным запатрабаванням народа». Якога народа, не канкрэтызуецца, але маюцца на ўвазе беларусы. І я згодны з аўтарам: адпавядала. Але з часам адпавядаць перастала. Асабліва пасля таго, як праваслаўны цар Іван Жахлівы прынёс беларусам незлічоныя бедствы, прэтэнзіі маскоўскага патрыярхата на валоданне душамі праваслаўных беларусаў разглядаліся, як прэтэнзіі варожай дзяржавы. А паколькі турэцкі палоннік — Патрыярх Канстанцінопальскі, які сам быў на ўтрыманні ў Масквы, не мог заступіцца за праваслаўных хрысціян Вялікага княства Літоўскага, ім прыйшлося шукаць апекі ў Папы Рымскага. Не забудзьма і тое, што ў XVI ст. была развітая старабеларуская мова, мова Ф. Скарыны, С. Буднага, В. Цяпінскага, Л. Сапегі, мова Статута, якая адышла ад царкоўнаславянскай. Склаліся новыя этнакультурныя запатрабаванні. А праваслаўе ў нас было слабое. Пачытайце, ойча Сергій, што пісалі пра яго Іван Жахлівы ды Андрэй Курбскі. Вось спалучэнне гэтых ды іншых фактараў (у прыватнасці, наступ Рэфармацыі) і прывяло да Уніі. Але пра гэта кандыдат багаслоўя не піша. Затое ён пасмейваецца. Згадаўшы пра кананізацыю Іасафата Кунцэвіча, а. Сергій з'едліва заўважае: «Больш дастойнага чалавека для кананізацыі уніяты ў сваім асяроддзі не знайшлі і па сённяшні дзень». Выдам а. Сергію таямніцу: ва уніяцкіх колах гавораць пра неабходнасць кананізаваць полацкіх пакутнікаў — тых уніяцкіх святароў, якіх у саборы Св. Сафіі забіў праваслаўны цар Пётр І.**

(Што зрабіў Пётр з самім саборам, кандыдат багаслоўя, спадзяюся, ведае).

У сваім артыкуле а. Сергій, па-руску кажучы, «лукавит».

**«Ні ў адным храме Рускай Праваслаўнай Царквы, — піша ён, — богаслужэнне не вялося і не вядзецца па-руску». Кандыдат багаслоўя нібыта не ведае, што мова літургіі значна бліжэйшая да рускай, чым да беларускай. Калі й праўда не ведае, то няхай прачытае хоць бы артыкул Івана Ласкова на гэты конт («ЛіМ», 27 сакавіка 1992 г.). Я ўжо не кажу, што мова пропаведзяў у праваслаўных храмах — руская. Знайдзіце беларускі малітваслоў ці беларускі катэхізіс, які РПЦ выдала на беларускай мове? Няма іх.**

**«Калі ў 1839 годзе беларускія уніяты вярнуліся да веры сваіх продкаў, ва ўлонне Праваслаўнай Царквы...» Не думаю, што а. Сергій не чытаў і не ведае, як Кацярына II, Павел І ды Мікалай І «дапамагалі» беларусам вярнуцца ў тое ўлонне, беларуску ўмеюць».**

Езуітаў вучаць глядзець у корань. Гэты замежнік хутка зарыентаваўся ў царкоўным жыцці Беларусі.

Не мае значэння, хто стаіць на чале тае ці іншае Царквы: беларус, паляк, рускі, немец... Галоўнае ў іншым: як ставіцца гэты іерарх да нашае мовы, культуры. Эдварда фон дэр Ропа, немца, і Юргіса Матулявічуса, летувіса, згадвалі добрым словам і беларускія ксяндзы, і свецкія гісторыкі. Але вось пасад у Вільні пасля біскупа Матулявічуса заняў Рамуальд Ялбжыкоўскі. Я пісаў пра гэтага іерарха і тут не буду паўтараць, якую шкоду чыніў ён беларускаму каталіцкаму духавенству, беларускаму хрысціянска - дэмакратычнаму руху...

На хвалі дэмакратызацыі пачалі аднаўляцца рыма-каталіцкія дыяцэзіі ў Беларусі. На чале іх пастаўлены палякі. Усё гэта рабілася праз Маскву. Афіцыйны ж Мінск прымаў прызначэнні да ведама. Ва ўсякім разе я не чуў, каб нехта з кіраўнікоў рэспублікі пратэставаў супраць кандыдатур мітрапаліта Менскага і Магілёўскага Казіміра ды біскупа Гарадзенскага Аляксандра. Чуў нешта іншае. Адзін міністр на поўным сур'ёзе даводзіў мне, дзеля таго, каб пачуць, што напісана ў папскай буле — для якіх католікаў прызначаецца а. Казімір мітрапалітам: толькі для рыма-католікаў ці для уніятаў таксама. Той, хто не быў на інгрэсе, шмат страціў. Нібы ў Польшчы, адразу пасля высокае лаціны гучала польская мова, і толькі потым — беларуская. Калі ж гучалі прамовы, то духоўныя асобы перш звярталіся да генеральнага консула Польшчы, а потым — да старшыні Савета па справах рэлігіі пры ўрадзе Беларусі, называючы яго, што праўда, міністрам. А калі б у касцёле быў нямецкі ці балгарскі генеральны консул? Да яго таксама звярталіся б раней? Вядома, такая пашана да спадарыні генеральнага консула была выяўлена таму, што яна прадстаўляе Польшчу, а ля алтара стаялі ў большасці палякі ці тыя, хто лічыць сябе палякамі.

Самае няўцямнае было пад канец, калі дзеці віталі мітрапаліта. Бедныя дзеці! Спатыкаючыся, яны чыталі Яго Эксцэленцыі прымітыўныя вершыкі па-польску. Было зразумела, што мовы яны не ведаюць, што мова для іх чужая. Яны жвавей і больш натуральна дэкламавалі б па-беларуску, але кс. Уладзіслаў Завальнюк, мусіць, каб дагадзіць мітрапаліту, вытрэніраваў іх па-польску. Калі не зважаць на вымаўленне, складвалася такое ўражанне, што падзея адбывалася недзе ў Кельцах, Познані, а не ў Менску.

Пра кс. Уладзіслава Завальнюка шмат спрачаюцца менскія рыма-каталікі. Ведаю такіх, хто з-за асобы святара не хоча хадзіць у той касцёл, дзе ён служыць. Не буду тут высвятляць, як гэты ксёндз апынуўся ў Менску (гэта, скажу вам, сюжэт!), давайце лепш зірнём на яго «заслугі».

Увесь Менск памятае пікеты ля Чырвонага касцёла. Страсці распальваў кс. Завальнюк. Яго ані не стрымлівала, што тады ў касцёле месціўся Саюз кінематаграфістаў, Дом кіно. Мы можам усяк казаць пра нашых кіношнікаў (яны гэтага заслугоўваюць), але факт застаецца фактам: Саюз кінематаграфістаў даў прытулак Народнаму фронту і тады яшчэ неафіцыйнаму фонду «Дзецям Чарнобыля». Кс. Завальнюк з дапамогаю камуністычных уладаў выжыў з будынка і Саюз кінематаграфістаў, і штаб Народнага фронту, і дабрачынны фонд.

Ці быў у вялебнага айца іншы варыянт? Быў. Гэта колішняя езуіцкая катэдра на пляцы Волі. Але кс. Завальнюк пачаў з Чырвонага касцёла. Толькі значна пазней, не давёўшы да ладу Чырвоны касцёл, ён паслаў бабулек да Дома фізкультуры, які месціцца ў катэдры. Дом фізкультуры, так бы мовіць, прамежкавы этап у ягонай дзейнасці. Цяпер, кажуць,

(Працяг на стар. 15).

Фота А. КЛЕШЧУКА.

**Проста а. Сергію НЯМА ВЫГАДЫ помніць ды пісаць праўду.**

Сёлета спаўняецца 1000 гадоў ад заснавання Полацкай епархіі. Экзарх Філарэт ды ягоныя падначаленыя паспрабуюць давесці, што без праваслаўя не было б беларускай культуры. Згадаюць імёны святых Ефрасінні Полацкай ды Кірылы Тураўскага. Але каго назаве РПЦ у XVIII — XX стст.? Не мае яна сваіх ксяндза Магнушэўскага (выхавацель П. Багрыма), Міхала Баброўскага, Кастуся Стэповіча, Аляксандра Астрамовіча, Адама Станкевіча, Вінцэнта Гадлеўскага, Фабіяна Абрантовіча, Язэпа Германовіча, Андрэя Цікоты, Часлава Сіповіча... Не дало праваслаўнае духавенства такіх падзвіжнікаў на ніве беларускай культуры. У XVI — XVII стст. шляхі беларускай культуры і праваслаўя разышліся. Пад царом і бальшавікамі РПЦ была варожая — у лепшым разе абыякавая — да нашай культуры. На жаль, сітуацыя не памянялася на лепшае і сёння.

Адзін замежны езуіт дасціпна заўважыў: «У вас што мітрапаліт Філарэт, што мітрапаліт Казімір — аднолькава пашто мітрапаліт Казімір Свёнтак — эстонец. Гэта было для мяне адкрыццём. Ведаю кс. Свёнтака трыццаць гадоў — з малалецтва — і ані разу не ўсумніўся, што ён паляк. Здагадваюся, што а. Казімір па-ранейшаму разглядае Беларусь як «крэсы». Зусім нядаўна — у снежні 1991 года — у інтэрв'ю рускай службе Радыё Ватыкана, успамінаючы пра падзеі 1939 года, ён ужыў выраз «так званая Заходняя Беларусь». Значыць, погляды засталіся тыя ж, якія былі пры Пілсудскім. (Гэта сказана, заўважце, пасля таго, як а. Казімір стаў мітрапалітам). Ведаю, што кс. Свёнтак жыве на Беларусі вельмі даўно, але за ўвесь той час, які ён жыве ў нас, гэты святар так і не вывучыў беларускае мовы, што вельмі родніць яго з мітрапалітам Філарэтам ды што адразу ж заўважыў езуіт з далёкага замежжа.

Час цяпер, што ні кажы, іншы, не тое, што пры Ялбжыкоўскім, і ксяндзу архібіскупу даводзіцца сяды-тады карыстацца нашаю моваю. У час узвядзення яго на пасад мітрапаліта кс. Свёнтак прамаўляў па-беларуску.

Я пайшоў на ўрачыстасць

# Прыняты ў Саюз пісьменнікаў Беларусі

БАТОРЫН Фелікс (ХАЙМОВІЧ Фелікс Барысавіч). Паэт, перакладчык. Нарадзіўся ў 1948 годзе ў Мінску. Скончыў Мінскі медінстытут (1972). Урач-ардынатар 2-й клінічнай бальніцы г. Мінска.

Літаратурную працу пачаў у 1968 годзе.

Аўтар кніг «Раніца» (1981), «Зялёны тралейбус» (1986), «Я дрэва пасадзіў» (1991), шэрагу перакладаў.

●

ГУБЛЕР Навум Якаўлевіч. Празаік. Піша па-руску. Нарадзіўся ў 1933 годзе ў Рагачове. Скончыў лётнае вучылішча грамадзянскай авіяцыі ў г. Сасава Разанскай вобласці (1954). Ульянаўскую школу вышэйшай лётнай падрыхтоўкі (1956), Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна (1969). Кіраўнік палётаў, начальнік змены службы кіравання паветраным рухам.

Літаратурную працу пачаў у 1957 годзе.

Аўтар кніг «Вясенні рэйс» (1979), «Пры ўспышцы маланкі» (1985), «Палёт працягваецца» (1986). Сёлета ў «Мастацкай літаратуры» выходзіць кніга «Непралітая хмара».

●

МАРОЗАЎ Змітрок Змітравіч. Паэт. Нарадзіўся ў 1954 годзе ў пасёлку Язды Крупскага раёна. Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1975). Працуе ў апараце Міністэрства сельскай гаспадаркі.

Літаратурную працу пачаў у 1977 годзе.

Аўтар кніг паэзіі «Пад небам буслінным» (1982), «Хлеб і памяць», «Хлебны верасень» (абедзве выйшлі ў 1988 г.), «Прадчуванне» (1991), «Апакаліпсіс душы» (1992), зборніка прозы для дзяцей «Азбука агранома Валошкі» (1989). У перакладзе на рускую мову выйшла кніга «Агонь і жыта» (Масква, 1983).

●

ПАНЦЮШАНКА Ціхан Антонавіч. Празаік. Піша па-руску. Нарадзіўся ў 1921 годзе ў горадзе Лебядзін Сумскай вобласці. Скончыў Харкаўскі медыцынскі інстытут (1952). Доктар медыцынскіх навук, прафесар. Кіраўнік аддзялення ў Навукова-даследчым інстытуце анкалогіі і медыцынскай радыялогіі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

Літаратурную працу пачаў у 1975 годзе.

Выдаў кнігі «Тайны старадаўніх руінаў» (1983), «Мужчыны не плачуць» (1986), «Галоўны ўрач» (1990).

Аўтар шэрагу апавяданняў і нарысаў, змешчаных у друку.

●

САВІК Лідзія Сямёнаўна. Нарадзілася ў 1936 годзе ў вёсцы Камуна Любанскага раёна. Крытык, літаратуразнавец. Скончыла Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна (1962). Кандыдат філалагічных навук. Старшы навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь.

Літаратурную працу пачала ў 1975 годзе.

Выдала кнігі «Адчуванне часу» (1981), «Пад мірным небам Бацькаўшчыны» (1986), «Каб не астыла цяпло зямлі» (1984). Аўтар шматлікіх публікацый у калектыўных зборніках і перыёдыцы.

ЛЯ КНІЖНАЙ ПАЛІЦЫ

# Мсціслаўцы пра Мсціслаў

У серыі «Па родным краі» (выдавецтва «Полымя») з'явілася новая кніжка — «Старажытны Мсціслаў» (1992 г., аўтары М. Ткачоў, А. Трусаў). Яна прыкметна адрозніваецца ад іншых кніжак серыі сваёй грунтоўнасцю і ўзроўнем падачы матэрыялу. Ведаючы аб агромністым дэфіцыце на гісторыка-краязнаўчую літаратуру, усё ж мушу зазначыць, што выдавецтва ў выпадку з названай серыяй гоніцца за колькасцю, мала дбаючы аб якасці. Каб пацвердзіць гэтую выснову, дастаткова звярнуць увагу чытача на тое, што ў большасці выданняў серый «Па родным краі» і «Гарады Беларусі» шматвяковаму пласту гісторыі да 1917 г. сціпла адводзіцца некалькі старонак, а ўвесь свой творчы імпэт аўтары аддаюць савецкаму перыяду.

У кнізе «Старажытны Мсціслаў» такой дыспрапорцыі няма. Дакастрычніцкаму перыяду гісторыі горада прысвечана 65 старонак, савецкаму — 38. Дзеля справядлівасці трэба зазначыць, што ў серыі ўжо былі працы, у якіх дэталёва і цікава выкладзена даўняя гісторыя. Напрыклад: «Древний город на Случи» А. Грыцкевіча і «Гольшаны» Э. Корзуна (выдадзеныя адпаведна ў 1985 і 1987 гг.).

Аўтары кнігі «Старажытны Мсціслаў» — вядомыя вучоныя-археолагі і гісторыкі — ураджэнцы Мсціслава. З іх біяграфіяй знаёміць прадмова, напісаная рэцэнзентам Г. Каханоўскім.

Немалаважнай адметнасцю кнігі з'яўляецца выкарыстанне матэрыялаў археалагічных даследаванняў, якія вядуцца ў Мсціславе шмат гадоў. Удалае спалучэнне навуковых звестак, атрыманых з пісьмовых і археалагічных крыніц, надае працы паўнату і грунтоўнасць. Тэкст пададзены добрай мовай, ён у меру навуковы і дастаткова «мастацкі». А раздзел «У змаганні з фашызмам» увогуле напісаны бліскуча і яго можна назваць узорным.

Упершыню ў пасляваеннай беларускай гістарыяграфіі аўтары змаглі апісаць «трубяцкую разню» 22 ліпеня 1654 г., калі рускія войскі пад началам А. Трубяцкога знішчылі ў Мсціславе каля 15 тыс. чалавек. Раней пісаць аб гэтым на Беларусі забаранялася (а ў Маскве можна было — гэта ўдалося зрабіць даследчыку Мсціслава Л. Аляксееву, гл. «Смоленская земля в IX—XIII вв.» М., 1980, с. 170—171).

Станоўча ацэньваючы працу, лічу неабходным выказаць некаторыя заўвагі як прыватнага, так і агульнага характару. У першую чаргу выклікае нараканне недастатковае ілюстрацыйнае афармленне тэксту, хаця, здавалася б, ілюстрацый шмат. Так, не стае тапаграфічнай схемы сярэднявечнага горада. Для працы, у якой апісваецца гісторыя тапаграфічнага развіцця аб'екта, такая схема абавязковая.

Даволі добра ілюстраваны раздзел аб матэрыяльнай культуры, асабліва шмат улюбёнай А. Трусавым кафлі. У той жа час раздзелу «Архітэктура Мсціслава XVII—XVIII стст.» і ілюстрацый яўна не стае. Маюцца толькі фотаздымкі раскапаных сутарэнняў бернардзінскага кляштара XVIII ст., збудаванага на яго падмурках сабора Аляксандра Неўскага (XIX ст.), на 2-й старонцы вокладкі змешчаны фотаздымак кармеліцкага касцёла (без подпісу). Ёсць яшчэ схема размяшчэння помнікаў архітэктуры Мсціслава. Яна ўжо публікавалася ў брашуры «Помнікі старажытнага Мсціслава» (Мінск, «Полымя», 1985 г., аўтары А. Трусаў, Р. Баравы), якая выйшла накладам у 750 экземпляраў і ў свабодны продаж не паступала. Але ў брашуры, у адрозненне ад гэтай кнігі, усе помнікі падпісаныя, маюцца іх фотаздымкі, і любому прыезджаму аматару мсціслаўскай даўніны лёгка тут арыентавацца.

Трапляюцца ў тэксце кнігі і некаторыя дробныя недакладнасці. Напрыклад, на стар. 18 паведамляецца, што нейкі час да 1440 г. Мсціславам кіраваў каралеўскі намеснік. Дакладней было б напісаць «вялікакняскі намеснік», бо ўсе службовыя прызначэнні ў Вялікім княстве Літоўскім у тыя часы рабіліся ад імя вялікага князя. У наступным сказе ёсць выраз «... вялікім князем Казімірам IV». Названы манарх з'яўляўся Казімірам IV толькі ў якасці польскага караля, а як вялікі князь літоўскі ён быў проста Казімір.

Аўтары працы належаць да ліку тых навукоўцаў, якія актыўна выступаюць супраць састарэлых гістарычных схем. Аднак у апісанні навейшага перыяду гісторыі Мсціслава відаць, як яны шмат у чым гэтых схем прытрымліваюцца. Так, з раздзела «Напярэдадні новай эпохі» выносіш, што ў пачатку XX ст. рэвалюцыйную дзейнасць сярод рабочых і сялян вялі толькі бальшавікі. Ці так гэта? Як жа атрымалася, што ўжо пасля 25 кастрычніка 1917 г. гарадскі Савет стварылі меншавікі, эсэры і кадэты без бальшавікоў? (Стар. 71). Амаль не ўпамінаецца аб тых мсціслаўцах, якія ваявалі супраць «чырвоных». Названы толькі былы камісар Часовага ўрада Карытка («...арганізаваў у Мсціславе беспарадкі» — стар. 71) і Тытуннікаў (кіраўнік «банды» — стар. 76).

**Алесь КРАЎЦЭВІЧ.**

# Спакусы пафаснага слова

## Дэкларацыйнасць і яе спадарожнікі

**...І ўжо не мае слова моцы той,**
**Якую мела ў вуснах першародных,**
**І ўсё цяжэй на мове — нам святой —**
**Апець Айчыну ў час яе гаротны.**

З такога характэрнага самакрытычнага прызнання, выказанага Леанідам Галубовічам, хочацца пачаць гаворку пра тыя вершаваныя творы сучаснікаў, якім не суджана было стаць адметнай мастацкай з'явай. Прычыны тут самыя розныя, і адна з іх — дэкларацыйнасць з яе адпаведным выяўленчым фонам.

Як, увогуле, нараджаецца верш? Адкуль прыходзяць яго першыя гукі і словы? Чаму руйнуецца задума, распачатая адмысловымі радкамі? Гэтыя пытанні заўжды цікавілі і творцаў-практыкаў, і даследчыкаў. Адно несумненна: у мастацкім працэсе спадзяванняў толькі на інтуіцыю, на акрыленасць натхнення яшчэ недастаткова, каб адчуць мяжу між заяўленай вышынёй гучання і яе спадам, эклектызм стылю, неапраўданую дысгармонію мелодыкі і паслабленасць думкі.

Вядома, што Хемінгуэй параўноўваў літаратурны твор з айсбергам, у якога толькі адна восьмая частка даступна зроку. У многіх жа сённяшніх творах — усё хутчэй наадварот. Тут усё ці амаль усё — навідавоку. Дзеля справядлівасці зазначым, што такая манера адлюстравання свету ўзнікла, вядома ж, не сёння. Яна карэніцца ў папярэдніх дзесяцігоддзях, калі нават вядучыя аўтары былі вымушаны «наступаць на горла» ўласнай песні, імкнучыся быць ударнікамі літаратурнага фронту, свядома ставячы перад сабой задачу клікаць і згуртоўваць, праслаўляць і развенчваць, шмат у чым ігнаруючы псіхалагічную паўнату твора і эстэтычныя запатрабаванні да яго.

На жаль, не толькі ў сацыяльным жыцці, але і ў мастацкім, узнікае нярэдка адчуванне халастых стрэлаў. Вытокі гэтага (акрамя згаданай традыцыі) — і ў саміх адносінах да тэмы, і ў тым духоўным мікраклімаце, які дае штуршок узнікненню задумы і яе рэалізацыі, і ў эстэтычнай пазіцыі мастака.

Спробы пераадолення інерцыі мыслення звязаны, як правіла, з глыбокім засваеннем і няпростай «рэвізіяй» зробленага не толькі папярэднікамі і сучаснікамі, але і самім сабой. Якраз пытанні сабе — самыя цяжкія. Ад іх асэнсавання шмат у чым залежыць будучыня, у якой можа быць альбо працяг росту, альбо таптанне на месцы. Зробленае сучаснікамі пацвярджае, што часта эвалюцыя творчай асобы адбываецца няроўна, што на шляху мастацкага пасталення ўзнікаюць шматлікія непажаданыя «калдобіны». Дэкларацыйнасць — адна з іх.

Намер быць актуальным адгукаючыся на праявы дня, прыводзіць часта да рэпартажна-хранікёрскага паказу з налётам маралізатарства, дзе прыкметна адчувальны ментарскі тон, ноткі выкрывальніцтва-асуджэння і павучальнасці. Такое здарылася з цэлымі «касякамі» вершаў апошніх гадоў самых непадобных паэтаў, прадстаўнікоў розных генерацый.

Бясспрэчна, кранаючыся «аголеных правадоў» рэчаіснасці, іншы раз і закрычыш. Але ж ёсць істотная розніца паміж крыкам душы (які неабавязкова мусіць быць надта ж гучным, грамавым, «пад Маякоўскага») і тым дэманстратыўна-эстрадным, бутафорскім «сотрясанием воздухов», ад якога мала чаго застаецца ў памяці, у сэрцы. І ці не гэта мела на ўвазе заўчасна адышоўшая ад нас Тамара Чабан, калі ў артыкуле «Незапатрабаваная паэзія» («Дружба народов», 1991, № 4) адзначала, разважаючы пра адчуванне «нейкай неўвасобленасці, няздзейснасці, няспраўджанасці надзей» прадстаўнікамі пакалення 70-ых: «І калі адны паэты змагаліся з вобразамі-стэрэатыпамі, арнаментальнасцю, «красивостью», у меру сіл шукалі выйсце, то іншыя.... паплылі па плыні, замяніўшы паэзію прафесіяналізмам, мастацкім прыёмам».

Арыентацыя на маштабнасць маналогу спарадзіла і фарсіраванне галасавых звязак, і бяскрылую канстатацыю — як ні дзіўна, празмерна камерную — у наступных радках Міколы Федзюковіча:

**Калі б попел**
**не напамінаў аб пажарах,**
**а цішыня —**
**аб выбуховым громе,**
**калі б я спакойна мог глядзець**
**на вечарова-велічнае неба,**
**не чакаючы небяспекі**
**ні з захаду, ні з усходу, —**
**о, як бы я цудоўна адпачыў!..**

Да празмернай гучнасці тону схільны і Мікола Мятліцкі:

**Наш дух круты ў застою дні зачах,**
**МЕТАЛ ДУШЫ (?) успудзіў нашы ногі.**
**Няўжо аднойчы выстыне ў вачах**
**Святы Агонь Вялікай Перамогі?!**
**Б'юць розгаласам новыя грамы,**
**Вяршыні веку — гордыя, крутыя.**
**Уваскрэсне дух наш.**
**Верце: гэта мы!**
**На ўсіх шляхах сваёй Айчыны —**
**Тыя!**

Пра маштабнасць асацыяцый, якія грашаць гігантызмам параўнанняў, дакладна сказаў у адной з рэцэнзій А. Бельскі, фіксуючы сімптомы «астранамічнай» хваробы ў некаторых вершах Мятліцкага. Вось і ў вершы «Мая рэвалюцыя» (зборнік «Шлях чалавечы») цэлы набор

занадта высокіх фраз: «Не зрыне Час айчыннай славы сцягі», «Твой кожны дзень у веях абнаўлення», «Мільёнамі мазольных дужых рук», «Эпох пламенне і шляхоў натхненне» і г. д. Падобнае — і ў вершах «Памяць дня», «Рэха» (радок з якога «Стаю паміж наступным і былым» нагадвае Куляшова), «Ты — Чалавек!», «Спыніцеся!..», «Стыхія».

Родная сястра празмернай інтанацыйнай узнёсласці — расцягнутасць, якая ўласціва не толькі Мятліцкаму. Тое, што магло быць выказана ў дзвюх-трох строфах, вырастае да васьмі-дванаццаці. Іншы раз адмыслова збітае «масла» (паэтычнае рэчыва) нястомна збіваецца яшчэ і яшчэ, як гэта сталася ў вершах «Голас», «Роднай зямлі», «Лотаць». У апошніх творах паэт намагаецца абмінуць гэту хваробу, пра што сведчыць і верш «Дарога» («Маладосць», 1991, № 9), напоўнены адметным роздумам, які без грукату і агульшчыны.

Як не перайсці тую мяжу, за якой — тэатральны пафас? Пра гэта, відаць, рупіцца кожны, хто піша вершы, хоць вынікі — самыя розныя.

Валянціна Аколава ў вершаваным цыкле «Мне ў жыцці ўсяго й трэба» выкладае балючыя праблемы ў надта ж экзальтаваным «штили». «Мая гордая мова — нязгасны касцёр», — піша яна і выказвае ўпэўненасць: «За роднай мовою — нашчадак пойдзе». Толькі я мяркую, што заклінаннямі, як і галашэннямі, справу з месца не зрушыш...

Па-рознаму, непадобна гучаць прызнанні-споведзі аўтараў: «Хацела вернай быць, а знаю здраду» (З. Дудзюк), «...Халоднай волі сцяўшы абцугі, Кую характар, спрамлены, жалезны. і заўважаю: стаў зусім другі — Нервовы, злосны, к гору не балесны» (А. Камароўскі), «Я прад людзьмі ні ў чым не вінаваты...» (З. Марозаў). Прыведзеныя радкі — усе з аднаго, восьмага нумара «Маладосці» за 1990 год. Амплітуда ж настрояў тут ледзь не палярная: ад роспачы за свае слабасці да катэгарычнай задаволенасці сабой без ценю сумненняў ва ўласнай праведнасці.

Увогуле, калі разважаць аб «правільнасці» паводзін лірычнага героя, то ў таго ж Марозава ён (герой) дужа прамалінейна-пказны, больш «дзяржаўны», без комплексаў і грахоў, чым зямны, неадрэтушаваны сучаснік. Плакатнасць, не абцяжараная глыбінёй перажыванняў, сумненняў, дзе словы «страты», «боль» і падобныя ім выглядаюць толькі механічнымі, узятымі напракат эмблемамі, дзе пра любоў і адказнасць паведамляецца-звяшчаецца як у дакладзе з трыбуны — усё гэта характэрная рыса многіх аўтарскіх вершаў («Эпоха», «Па віхлястых сцежках і дарогах пыльных...», «І маладосць, як сон, пройшла...»). Вось адзін з узораў такой «прачулай» версіфікацыі:

**Давай мазольнай, шчырай**
**працай**
**Заплоцім доўг народу**
**За хлеб і соль, што сёння маем,**
**І за жывое слова,**
**За кожны дзень, што адкрываем**
**І пазнаём нанова.**

Ці не таму ўзнікае адчуванне трафарэтнасці, «чыстапісання», лёгкай штампоўкі такіх вершаў, дзе ўсё нібыта правільна, але жыццёвы матэрыял не аказвае ніякага супраціўлення? На роўныя шнуры нанізваюцца рытарычныя, амаль бязважкія словы, якія не ў стане па-сапраўднаму ўзрушыць.

У шэрагу выпадкаў творы паслаблены адчувальнай таўталогіяй матываў, аднатыпнасцю рытміка-інтанацыйных вырашэнняў. Больш багатая структурная прырода—не самамэта, але занядбанне яе збядняе выяўленчую палітру, выклікае эксплуатацыю раней знойдзенага, шмат разоў апрабаванага. Спрацоўвае своеасаблівы закон інерцыі.

Не здолела пазбегнуць трывіяльнасці і Людміла Паўлікава:

**Зямля мая, зямля надзеі,**
**Я зноў з табой, люблю цябе я.**
**Нібы ў юнацтве халадзею**
**Ад гэтых слоў —**
**Люблю цябе.**
**(«Вяртанне да жыцця»).**

Са зместу твора вынікае, што намер быў сур'ёзны, але жаданаму не ўдалося здзейсніцца.

Гаворачы пра недахопы верша маладзейшых прадстаўнікоў паэтычнага цэха (уласцівыя не толькі ім), трэба адзначыць, што аўтары нярэдка імкнуцца выдаць жаданае за сапраўднае, як гэта зрабіў і Алесь Пісарык у вершы «З вамі — як з жывымі, гавару...», прысвечаным памяці свайго аднавяскоўца, Старшыні ЦВК БССР А. Р. Чарвякова:

**Ажылі мы зноў пасля**
**рэпрэсій...**
**З вамі —**
**Як з жывымі, гавару.**
**Вы ў народнай памяці**
**ўваскрэслі,**
**Помніць вас і любіць**
**Беларусь!**

Далекавата яшчэ да сапраўднай памяці і любові да тых, хто быў асуджаны на пагібель служкамі правадыра-тырана. Бяспамяцтва ў нас гэтулькі, што мажорныя таны не вельмі тут і дарэчы.

Адсутнасць вопыту ў маладых нярэдка прыводзіць да таго, што арыгінальна, без гладкапісу і ружовай бравурнасці распачаты верш завяршаецца ў фінале збітай легкаважнасцю, як атрымалася з вершам Уладзіміра Цішурова: «Але кім і чым бы я ні быў, больш за ўсё мне б хацелася быць патрэбным людзям на Зямлі!» («Маладосць», 1990, № 12). Паслабляюць творы і дыдактычнасць, павучальнасць: «Не кідай на вецер словы, а рабі свой свет нанова. След у свет кладзі, як след. Вось вам новы запавет...» (Ніна Шклярава) Што ж тут новага?

Ці не таму дэкларацыйнасць дае глебу халодным радкам, што прага абхапіць неабдымнае, адгукнуцца ледзь не на ўсё мала забяспечана і эстэтычнай трываласцю, і раскрыццём найбольш перажытага, патаемнага і набалелага? І справа тут неабавязкова ў «генеральнай думцы» (А. Твардоўскі), а ў той ступені псіхалагізму і глыбіні вобразнай рэалістычнасці, якія забяспечваюць твору надзейную грунтоўнасць, робяць яго з'явай мастацкага адлюстравання і пазнання свету і чалавека ў ім. Занядбанне гэтай «барадатай» прапісі помсціць не толькі маласпрактыкаваным, але і шматвопытным аўтарам.

Вы заўважалі, наколькі рэдкай з'явай сталі ў сённяшняй паэтычнай мове элементы падтэксту, прыём недагаворанасці, нахолькі збяднелі асацыятыўныя разгалінаванні радка, — пануе анемічнае падабенства стылю, раскашуе канстатацыя заклікаў без багатых выяўленчых сродкаў.

Як спалучыць у паўсядзённым жыцці прагматычнае, утылітарна-неабходнае з узвышана-адвечным, з тым, што так упарта руйнавалася цэлым стагоддзем?

Аб гэтым — таксама роздум. паэтаў. Сярод старэйшын нашае літаратуры да асабіста зведанага неаднаразова звяртаецца Сяргей Грахоўскі. І ў гэтым звароце—не толькі поспехі. Пацвярджаюць сказанае і радкі з верша «Рэтраграды», дзе налёт пратакольнасці, шчодрай прамалінейнасці досыць адчувальны:

**Кіньце вы свае загады,**
**Маладыя рэтраграды,**
**Бо працуе не на вас**
**І народ, і новы час.**

А вось верш «Трыбуна» («Беларусь», 1989, №9) атрымаўся з добрай сатырычнай падсветкай. Зусім невыпадкова эпіграфам да яго ўзяты словы з «Дзённікаў» Аляксандра Даўжэнкі: «Нашу трыбуну рабілі нейкія невядомыя майстры з нейкага асаблівага дрэва і, напэўна, праклялі, зачаравалі яе. Яна адрозніваецца ад усіх трыбун тым, што на ёй ніхто не мог сказаць праўду».

Паўната праўды ніколі не бывае лішняй, але празмерная эксплуатацыя адных і тых жа матываў вядзе нярэдка да пэўнай дэвальвацыі мастацкага слова. Пры гэтым здараецца і так, што выкладзеная ў творы інфармацыя не абрастае надзейнай плоццю вобразна-выяўленчых сродкаў, якія ратуюць ад сухасці. У нейкай ступені гэта закранула і прыхільніка нетаропкай апавядальнай манеры Аляксея Русецкага («След», «Ваўкалакі шэрыя», «З дзённіка ветэрана» («ЛіМ», 28 чэрвеня 1991 г.).

Ва ўсе часы — у эпоху Гамера і Шэкспіра, у гады творчага ўзлёту Твардоўскага і Смелякова, Панчанкі і Пысіна перад мастацтвам заўсёды стаяла асноўная задача — узрушваць людзей праўдзівасцю перажыванняў. Незыпадкова, што найбольш усхваляваныя творы з'яўляліся менавіта тады, калі былі моцна знітаваны «з любоўю і нянавісцю зямною» (Г. Бураўкін).

Колькі існуе паэзія — столькі існуюць і спробы растлумачыць яе прызначэнне і асаблівасці. Напрыклад, Валянцін Тарас гаворыць, што «паэт павінен слухаць сябе — свой талент, сваю ўнутраную мелодыю, бо талент ад Бога і ніхто не мае права ім камандаваць, як ніхто не мае права камандаваць селянінам». Супраць сказанага запярэчыць, здаецца, немагчыма. Але дзіўная ж прырода гэтага таленту! Літаральна праз два абзацы пасля прыведзеных слоў той жа аўтар прызнаецца: «І пад страхам смерці я не напісаў бы ніводнага радка ў тыя дні, калі глядзеў па тэлевізары пасяджэнні Першага з'езда народных дэпутатаў СССР. Хоць, вядома, тое, што ўбачыў, пачуў і зразумеў, — крыніца будучага так званага натхнення». Вось так. І тут, між іншым, ніякага антаганізму няма, як і няма пярэчання даўно ўсталяванаму тэзісу аб тым, што асэнсаванне вострых пытанняў часу — тая «лакмусавая паперка», якой правяраецца грамадзянская сталасць мастака.

Чытаючы вершы апошніх гадоў, міжволі ловіш сябе на думцы, што ўзнікае адчуванне сітуацыі, калі пэўная вычарпанасць твораў (і тэматычная, і вобразна-структурная) суседнічае з апантаным жаданнем аўтараў абавязкова адпавядаць лозунгу «Ні дня без радка!» Ці не гэты дэвіз часта і мабілізуе на тэхнічна ўпэўненую, інтанацыйна (і стылёва ў цэлым) падвышаную дэкларацыйнасць з яе роднаснымі «спадарожнікамі»?

**Віктар ЯРАЦ.**

г. Гомель.

# ЦЯГНІК НАЗАД НЕ ІДЗЕ...

**САКАВІК**

**Наўрад ці хто з тых, каму трапіцца ў рукі «Нёман», праміне ўспаміны колішняга першага сакратара ЦК КПБ(б), начальніка Цэнтральнага штаба партызанскага руху П. Панамарэнкі «Падзеі і майго жыцця» (змешчаны пачатак). Можна па-рознаму ставіцца і да самога аўтара і да партыі, функцыянерам якой ён быў, але, калі хочаш ведаць глыбей нацыянальную гісторыю, і без П. Панамарэнкі не абыдзешся. У рэшце рэшт наконт гэтага вельмі дакладна ва ўступе да публікацыі сказаў А. Кудравец: «Што такое гісторыя? Перш за ўсё час, прастора і людзі. Ці, па-другому: жыццё людзей, якое прайшло ў пэўным часавым і прасторавым вымярэнні. Што было і што засталося ў выбранай зямной памяці.**

**І як бы мы ні адносіліся да падзей мінулага, падабаюцца яны нам сёння ці не падабаюцца, яны т а к і я (тут і далей разбіўка А. Кудраўца. — А. А.), яны б ы л і і гэта нічым н е з м е н і ш. З гэтым можна толькі змірыцца і прымаць з разуменнем фатальнай непазбежнасці тое, што адбылося. Жыццё яшчэ не прыдумала цягніка ў зваротным кірунку».**

**Важкія і правільныя словы, тым болей, што яны не толькі ключ для разумення напісанага, занатаванага П. Панамарэнкам. Так ужо атрымалася, што сказанае А. Кудраўцом неаднойчы згадваеш, калі знаёмішся з часопісам «Полымя». Збег выпадковы, але ў нейкай ступені і сімптаматычны. Як пацвярджэнне, што нарэшце мы пачынаем разумець: гісторыю ні ў якім разе нельга ні перапісваць, ні падпраўляць. Гісторыя любіць праўду і толькі праўду.**

**Да гэтай праўды мінулай вайны імкнецца ў аповесці «Трывожна шумяць ясакары» Н. Маеўская. Здавалася б, навошта жанчыне спрабаваць разблытваць клубок супярэчнасцяў там, дзе і В. Быкаву, І. Шамякіну, Б. Сачанку, І. Пташнікаву, І. Чыгрынаву, іншым нашым знакамітым празаікам няпроста даводзіцца? Ды, аказваецца, ёсць патрэба: пісьменніца не паўтарае папярэднікаў, піша сваё. Удаўся Н. Маеўскай вобраз галоўнага героя Жураўскага, які на схіле гадоў вяртаецца ў пару баявога юнацтва, бо няма чалавеку спакою ад таго, што забыўся пра людзей, каму абавязаны жыццём. Больш таго, забыўся Жураўскі і пра тое, што яго забяспечаная старасць, павага аплачаны не толькі крывёй загінуўшых, але і забыццём многіх радавых удзельнікаў барацьбы з фашызмам. Маральным суддзёй Жураўскага выступае Жданюк, якраз той, каго Жураўскі лічыў здраднікам. Шкада, што ў аповесці часам заўважаецца расцягнутасць (гэта наша агульная бяда) і жаданне аўтара абавязкова ўціснуць у сюжэтную канву твора напамінак аб адраджэнскіх працэсах (зноў жа, не ў адной Н. Маеўскай гэта адчуваецца). І вось ужо Жданюк называе сябе рускім і растлумачвае сваю пазіцыю: «Ні адзін чалавек тутэйшы не скажа іначай. Мы забыліся на сваё. Усё было накіравана на тое. Усё наша жыццё. Дык вось: мы — рускія, бязлітасна судзім адзін аднаго. Мы забылі, што чалавек найперш усяго — нявінны...»**

**Вайна з яе супярэчлівасцямі і ў цэнтры апавядання Л. Арабей «Адзін доўгі дзень». Сапраўды, пісьменніца ўзяла ўсяго-наўсяго адзін дзень жыцця гераіні твора і гераіні вайны Зінаіды Міхайлаўны. Адзін звычайны, будзённы дзень. Жанчына, якая, здавалася б, павінна адчуваць сябе шчаслівай,— хворы, адзінокі чалавек. Адцураўся каханы, бо не змог дараваць узаемаадносін... з немцамі. Адцураўся, а мы ж ведалі пра такія прыклады і маўчалі. Маўчала і літаратура, бо не мела права аб гэтым гаварыць. Маўляў, нетыповае ўсё, не характэрнае для сацыялістычнай рэчаіснасці...**

**«Галоўная бяда ў тым, што ў выніку ўсіх гэтых мерапрыемстваў (тое, на што арыентавала кожнага партыя. — А. А.) губляўся чалавек, што літаратура павінна была толькі вітаць іх, у пісьменнікаў было адабрана права сумнявацца, крытыкаваць, адмаўляць», —гэта ўжо гаворыць Р. Шкраба ў артыкуле «У сааўтарстве з часам», разважае над праектам новай праграмы па беларускай літаратуры для сярэдняй школы. Як бы астуджвае пыл тых крытыкаў, якія, скарыстоўваючы момант, гатовы ўсё перакрэсліць ці зрабіць яшчэ «лепей»: у колішніх ацэнках плюсы памяняць на мінусы — як быццам усё можна паставіць на месца.**

**Небяспечная падобная актыўнасць. Катэгарычнасць ніколі яшчэ да дабра не прыводзіла. Ніхто не сумняваецца, што былі ў нас і «дутыя» класікі, і завышаныя ацэнкі твораў, напісаных тымі ж «класікамі». Але ці трэба сячы з-за пляча? Шчыра радуюся ўменню П. Васючэнкі пісаць востра, вобразна («Пра чалавека, які ўкусіў сабаку», «Нёман»), але натыкаюся: «Мне зразумела былая папулярнасць «Снежных зім», «Сэрца на далоні», «Атлантаў і карыятыдаў» І. Шамякіна. Пісьменнік умеў пракласці славуты калідор, стварыць адаптаваны варыянт «жыцця», дзе сацыяльныя калізіі змякчаны, трансфарміраваны ў меладраматызм». Так і хочацца ўсклікнуць: «Даражэнькі калега, ну няма цяпер аддзела культуры ЦК КПБ, дык хоць Бога пабойся!». Гэта ў «Сэрцы на далоні» «сацыяльныя калізіі змякчаны»?! (дарэчы, гэты раман усё ж з'явіўся раней за «Снежныя зімы»). Гэта «адаптаваны «варыянт» жыцця» ў «Снежных зімах», «Атлантах і карыятыдах»?! Не падабаюцца табе гэтыя творы — справа іншая. Але вось так — пад «сук»? Дык гэта ж тое самае, што і прыдумаць «цягнік», які б ішоў у зваротным кірунку...**

**А мо лепей, чым кідацца ў крайнасці, паспрабаваць спакойна паставіцца да створанага раней, што стала ўжо гісторыяй літаратуры, як гэта зрабіў Д. Бугаёў у артыкуле «Дасягнутае і страчанае» («Полымя»). Па-новаму прачытваючы «Сокі цаліны» Ц. Гартнага і «Драпежнікі» Я. Нёманскага?**

**Зрэшты, у некага, вядома ж, іншая думка. Можа стацца, што знаёмства з чарговымі нумарамі часопісаў нехта ўвогуле пачне з паэзіі. Тым больш, што варта ўвагі — многае. Скажам, падборка У. Паўлава ў «Полымі». І вайна тут, і пасляваеннае жыццё, і дзень сённяшні. І ўсё публіцыстычна-востра і, я б сказаў, з высокай планкай маральнасці. А ў «Полымі» ж яшчэ — вершы М. Дуксы і С. Панізніка, у «Беларусі» — Т. Бондар. Паэты, якія сёння робяць «твар» беларускай паэзіі. На жаль, пра маладосцеўскія публікацыі нічога не магу сказаць — запазняецца часопіс. Але дзякаваць Богу хоць выходзіць!**

**Праўда, і «Полымя» не забывае пра маладых аўтараў. У трэцім нумары хораша заявіла аб сабе апавяданнем «Грандамы» Г. Багданава, тут жа вершы маладых паэтэс, аб'яднаныя назвай «Выток любві». Сёйтой успрыме гэта, як жаданне неяк выкарыстаць пошту напярэдадні 8 Сакавіка — можна і так зірнуць на публікацыю. Але ж можна і па-іншаму. Зерне пасеяна. Нешта засохне, а нешта і ўзыдзе. І на карысць літаратуры, і на нашу з вамі карысць, бо, можа, хоць паэзія зробіць нас у тлумны час дабрэйшымі, шчадрэйшымі, а значыць і шчаслівейшымі!**

**А. АН-ЕВІЧ.**

Таіса БОНДАР

# Душа прамаўляе да Бога...

●

Цяжкія армады аблокаў,
Цяжкое дыханне зямлі,
Скаванае водгуллем крокаў...
Дзе знойдзем прытулак! Калі!

На стыку вякоў! На пад'ёме,
Ад смерці за крок, як заўжды!
Ні ў зорнай прасторы, ні ў доме
Не могуць сагрэцца гады.

І стынуць, халодзячы душы...
Усё прадказана. Даўно.
І гнеў, што святло ў нас патушыць,
І жах, што нам стане труной.

А мы ўсё гадаем на гушчы:
Успыхне ці выбухне дол,
І шлях, як раней, невідушча
Кружляе вакол і вакол.

●

Цярушыцца паднеб'е... Снег, не снег,
А дзень, зрашэчаны яго мігценнем,
Ніяк не ўкрыецца уласным ценем,
Каб адагрэцца, адагрэць свой смех.

І пасмяяцца — з неба, і з сябе...
Яшчэ не зжухла полымя лістоты,
Яшчэ не змылі пахі кветак слоты,
І—снег! І гэта прыткасць у сяўбе!!

Не, зерню гэтаму не прарасці
З травы, не закранутай маразамі:
Праблісне сонца — і ў зіхоткім ззянні
І следу яго будзе не знайсці.

Растане снег, і здасца: не было
Ні дня, застылага ў яго мігценні,
Ні неба, што, зліваючыся з ценем,
Краналася зямлі сваім крылом.

І толькі смех, вясёлы чыйсьці смех
То ўспыхваў, то згасаў і зноў успыхваў...
Прыкрыю ж вочы — нада мною ціха
Ляціць, знікаючы ў паднеб'і, снег.

●

У мовах маёй слепаты,
П'яная маёю трывогай,
Душа прамаўляе да Бога
З прадоння начы, з пустаты.

Гадамі ўкарочаны шлях,
Сумненнямі з'едзены ўдачы...
Не вечнасць, дык вецер аплача
Пагаслы, бяззорны абсяг.

А шлях скрозь яго! А душу,
Душу, што так прагнула веры!
Хто ёй, хоць слязінкаю, верне
Спагаду, якой я прашу!

Наступнасць! Нашчадак мой! Бог!
Світае так ціха, так доўга...
Душа прамаўляе да Бога,
Не чуючы: ён — дапамог.

●

Балады Шапэна... Крынічкі журбы,
З якіх несамотнай душы не напіцца...
Не памяць, а вечнасць нашэпча: любі,
Любі — і любоў зберажэ таямніцу.

Не тую, што мучыць разгадкай сваёй,
Вярэдзячы споміны, доўжачы ночы,
А тую, што вабіць святлом, вышынёй
Бязмежжаў надземных,
памкненняў прарочых.

Крылатаму — вецер, бяскрыламу —
шлях...
Так проста, здаецца. Будзённа і проста.
Чаму ж, перамогшы язычніцкі страх,
Збаімся з душою памерацца ростам!

Збаімся. Хто духам, хто целам слабы,
Хто звык над сваёй радаводнай сляпіцца.
Балады Шапэна... Крынічкі журбы,
Якімі бяззорнае неба бруіцца...

●

У садзе зорак сама ярка з іх
Зноў ззяе тая, што вось-вось пагасне,
І ззянне доўжыць, доўжыць,
доўжыць міг,
Бясконца радасны, бязмежна ясны.

Нібы за ім не смерць,
зусім не смерць,

ГЭТА БЫЛО, БЫЛО...

# Сем гадоў і ўсё жыццё

## Драма і трагедыя Францішка Аляхновіча — драматурга і чалавека

«Не было, здаецца, выпадку ў гісторыі літаратуры, каб мастак прымушаў сябе рабіць нешта праз сілу, кідаў на рынак твор незазнаны, далёкі ад яго поглядаў. Калі ж такія выпадкі магчымы, дык, чытач, ці глядач лёгка адчуе фальш».

(Францішак Аляхновіч. Аўтабіяграфія.—Архіў Камітэта Дзяржаўнай Бяспекі Рэспублікі Беларусь).

У 1991 годзе ў часопісе «Полымя» была надрукавана кніга Францішка Аляхновіча «У кіпцюрох Г. П. У.», добра вядомая замежнаму чытачу яшчэ ў 30-я гады і зусім невядомая нам, суайчыннікам аўтара. Нельга спадзявацца і на тое, што беларускі чытач добра ведае гэтае імя, хаця ў апошнія гады і было некалькі публікацый пра Ф. Аляхновіча. Бо амаль не ведаюць беларусы нават тых сваіх драматургаў, пра якіх напісана не адно манаграфічнае даследаванне, чые творы выдаваліся і перавыдаваліся неаднаразова.

Што ж тады казаць аб тых, чые імёны нават у спецыяльных даследаваннях па гісторыі беларускага тэатра не ўспаміналіся, а калі дзе і згадваліся, дык толькі з адной мэтай — падкрэсліць палітычную нядобранадзейнасць гэтых твораў, варожасць іх да сацыялістычнага ладу. Да ліку апошніх адносілі і Ф. Аляхновіча, аўтара амаль 20 драматычных твораў, рэжысёра, акцёра, які пачаў сваю дзейнасць у час беларускага адраджэнскага руху на пачатку XX стагоддзя, і потым на ўсё жыццё застаўся верным яму, нягледзячы на цяжкі, нават трагічны лёс.

Мы невыпадкова ўзялі эпіграфам да гэтага артыкула словы, напісаныя Ф. Аляхновічам у следчым ізалятары ДПУ. Цяжка знайсці іншыя, якія б так трапна характарызавалі яго сутнасць, яго імкненні: заўсёды, пры любых палітычных абставінах заставацца Беларусам. «Я — не палітык, я — культурнік, я — тэатральны работнік»,— гэтая фраза праходзіць не толькі праз усю судовую справу Ф. Аляхновіча, яна як бы пралягае праз усё яго жыццё.

Нарадзіўся Ф. Аляхновіч 9 сакавіка 1883 г. у Вільні ў сям'і, як ён пісаў, мяшчан. Яго дзед (па бацьку) родам з дробнае беларускай шляхты, меў невялікую гаспадарку пад Радашковічамі. Але не ляжала душа ў яго да зямлі. Добра маляваў, іграў на скрыпцы. Страціўшы ўсю маёмасць, ён пераехаў у Вільню. Любоў да музыкі перадаў адзінаму сыну, Каролю (бацька будучага драматурга), які ў сталым узросце іграў у віленскіх тэатрах. Маці Ф. Аляхновіча (таксама з дробнай беларускай шляхты) была швачкай. Таму, відаць, ён і меў падставу напісаць у аўтабіяграфіі, што нарадзіўся ў сям'і мяшчан. Ды і час быў такі, што лепш не ўспамінаць пра сваё шляхецкае паходжанне.

Вучыўся ў 2-й Віленскай гімназіі, дзе ўсе прадметы выкладаліся па-руску. Па гэтай прычыне, ці па якой іншай, але вучыўся неахвотна, пад прымусам рэпетытара. Пасля шасці класаў увогуле быў выключаны. І хоць марыў пра тэатр, пад уздзеяннем сям'і вымушаны быў паступіць у Віленскае тэхнічнае вучылішча. Тут таксама доўга не затрымаўся: праз год кінуў вучобу. Пасля поўных рызыкі і нястач вандровак усё ж паступіў у Варшаўскую драматычную школу пры музычным таварыстве, якую скончыў у 1907 годзе. Нейкі час ездзіў з польскім тэатрам, а ў 1908 годзе вярнуўся ў Вільню і працаваў рэпарцёрам у газетах, рэдагаваў гумарыстычны часопіс-тыднёвік «Перкулас», які выдаваўся па-польску.

Менавіта ў гэты час Ф. Аляхновіч актыўна ўключаецца ў беларускі рух. У 1910 годзе ў Вільні адбылася першая беларуская вечарына. Ф. Аляхновіч быў рэжысёрам спектакля па п'есе Крапіўніцкага «Па рэвізіі». Але папрацаваць доўга ў Беларускім тэатры Ф. Аляхновічу не ўдалося. За адзін з артыкулаў, змешчаных у часопісе «Перкулас», ён быў прыцягнуты да судовай адказнасці па арт. 79, 121 і 123 — «за кощунство, стремление к свержению существующего строя и за оскорбление царствующей особы в печати», а таксама за «возложение хулы на бесплотные силы небесные». Атрымаўшы павестку ў суд, Ф. Аляхновіч эмігрыраваў у Аўстрыю. Калі ў 1913 годзе была аб'яўлена амністыя (у сувязі з 300-годдзем дома Раманавых), вярнуўся ў Вільню. Але аказалася, што пад амністыю падпалі не ўсе пункты абвінавачвання, таму давялося правесці 9 месяцаў «на Лукішках».

Менавіта ў турме і напісаў сваю першую п'есу «На Антокалі», якая была пастаўлена ў снежні 1916 года ў Вільні, дзе пад кіраўніцтвам І. Луцкевіча дзейнічаў беларускі клуб. У гэты ж час з-пад пяра Ф. Аляхновіча выходзяць п'есы «На вёсцы» (1916), «Бутрым Няміра» (1916), «Манька» (1917), «Базылішак» (1917).

Грашовыя нястачы вымушаюць Ф. Аляхновіча пакінуць Вільню і пераехаць у Чорны Бор, дзе ён некаторы час працаваў настаўнікам у дзіцячым беларускім прытулку. Там напісаў п'есу «Калісь» і аднаактоўку для дзяцей «У лясным гушчары», якая і была ўпершыню пастаўлена ў Чорным Бары. Вярнуўшыся ў Вільню, працаваў у пажарнай камандзе, а ў вольны час займаўся любімай справай.

У гэты час у Мінску, дзякуючы намаганням У. Фальскага і Ф. Ждановіча, пачынае дзейнічаць Першае беларускае Таварыства драмы і камедыі. Пасля таго, як у лютым 1918 г. у горад уступілі аўстра-германскія войскі, дзейнасць гэтага калектыву часова спынілася, але ўжо ў кастрычніку таварыства аднавіла паказ спектакляў у «Беларускай хатцы». Дачуўшыся аб падзеях, якія адбываліся ў культурным жыцці ў Мінску, Ф. Аляхновіч, пасля васьмідзённай пешай вандроўкі, прыбывае ў горад. Тут ён працуе як рэжысёр, акцёр, драматург.

Для сваёй першай пастаноўкі ў Мінску абраў гістарычную п'есу «Бутрым Няміра». Яна ўжо ішла на тэатральнай сцэне ў Вільні і атрымала добрыя водгукі ў гледачоў і ў прэсе. Вось што пісала аб ёй газета «Homan»: «...Новы твор таленавітага беларускага аўтара і драматычнага артыста — гэта драматызаваная легенда, якая была з народных вуснаў пераказана ў «Homane» ў літаратурнай форме Ластоўскім. Народ наш мае многа ўспамінаў аб тых даўніх-даўніх часах, калі сяляне былі за нявольнікаў у сваіх паноў і цярпелі страшны здзек...

Трэба сказаць, што «Бутрым Няміра» («Каменная труна») належыць да найлепшых твораў Аляхновіча, які сам выканаў галоўную ролю — Бутрыма Няміры».

Спектакль зрабіў моцнае ўражанне і на мінскага гледача. Але, бадай, найбольш водгукаў (вельмі розных, падчас супярэчлівых) выклікала пастаўленая ў тым жа 1918 годзе трохактовая п'еса «Страхі жыцця». Калі мінскі «Беларускі шлях» пісаў, што «Страхамі жыцця» аўтар стварыў «новую эпоху ў беларускай драме», што «як з літаратурнага, так і з сцэнічнага боку гэты твор можна лічыць завершаным» і г. д., дык іншыя абвінавачвалі ў згушчэнні фарбаў.

З Мінска Ф. Аляхновіч час ад часу наязджае ў Вільню, імкнучыся, каб і там тэатральнае жыццё пашыралася. Цікавы факт: як толькі Ф. Аляхновіч пакідаў Вільню і вяртаўся ў Мінск, тэатральны сезон у Вільні пачынаўся няўдала (так, прынамсі, сведчылі віленскія газеты). Мо прычына і ў нечым іншым, але факт застаецца фактам.

У 1918 годзе ў Мінску адначасова дзейнічалі тэатр пад кіраўніцтвам Ф. Ждановіча і тэатр Ф. Аляхновіча. Але калі ўсталявалася савецкая ўлада, яны зліваліся. Ужо на дзесяты дзень з'явілася афіша «Беларускага Пралетарскага Тэатра», а праз тыдзень (22 снежня 1918 г.) адбылося адкрыццё «Беларускага Савецкага Тэатра». За два месяцы было пастаўлена 23 п'есы.

Аднак пасля палякаў тэатральнае жыццё на нейкі час сціхлася. Праўда, неўзабаве пачаў дзейнічаць тэатр пад кіраўніцтвам Ф. Аляхновіча, які атрымліваў субсідыю ад польскіх улад. Гэты перыяд жыцця і дзейнасці яго ў далейшым і будзе падвергнуты крытыцы з боку мастацтвазнаўцаў. Яму ставілася ў віну тое, што рэпертуар быў вельмі вузкі: ставіў толькі ўласныя п'есы, а гэта, маўляў, не задавальняла гледача, таму цікавасць да беларускага тэатра падала. Але ці Ф. Аляхновіч быў таму віною? Трэба ж разумець, у якіх абставінах яму даводзілася працаваць. І ўсё ж тэатр дзейнічаў. Крыху пазней Ф. Аляхновіч так напіша пра гэты перыяд у сваёй кніжцы «Беларускі тэатр»: «Субсыдыя выплачваецца неакуратна, карыстацца гарадскім тэатрам беларусам дазваляецца толькі ў будныя дні, дзеля таго што ў нядзелі і сьвяты тэатр аддаецца польскай трупе, апрача таго тагочасная тэатральная цэнзура, якую вела польская паэтэса Savitri (п. Растовіч-Загорская), надта абмяжоўвала дзеяльнасць беларускага тэатру з боку рэпертуарнага. Было забаронена гуляць гэткія п'есы: «Паўлінку» і «Раскіданае гняздо» Я. Купалы, «Моднага шляхцюка» Каганца, «Каліст» і «Бутрыма Няміру» Аляхновіча. Пры беднасці беларускага рэпертуару гэтая забарона сільна адчувалася».

Пасля канчатковага ўсталявання ў Мінску савецкай улады зноў пачалося ажыўленне тэатральнай дзейнасці. Быў арганізаваны рускі дзяржаўны тэатр, што, па словах Ф. Аляхновіча, «пачынае новую фазу ў гісторыі нашага тэатру, які... згуляў... вялізарную ролю ў беларускім адраджэнні».

Вось і падыходзім мы да самага супярэчлівага перыяду жыцця Ф. Аляхновіча, перыяду, які пазней адгукнуўся яму нялёгка і прывёў на Салаўкі. У 1921 годзе Ф. Аляхновіч нелегальна пакінуў Беларусь і зноў вярнуўся ў Вільню. Што прымусіла яго зрабіць гэта? Існуе дзве версіі. Адна — версія ДПУ, якая лягла ў аснову абвінавачвання Аляхновіча ў злачынстве супраць БССР. Другая — яго асабістыя паказанні, што знаходзяцца ў судовай справе. Звернемся да апошніх:

З пратакола допыту 3 студзеня 1926 года:

**Ф. Аляхновіч: «У 1921 г., даведаўшыся, што ў Вільні... займаюць крупныя ўрадавыя пасты беларускія дзеячы Тарашкевіч і Іваноўскі, у якасці дырэктароў дэпартаменту (на старонках пратакола насупраць гэтых слоў пастаўлены пытальнік, відаць, рукою следчага. Сумненні маюць рацыю — ніякіх важных пастоў названыя дзеячы ў той час не займалі), ведаючы, што ў Мінску тэатр дастаткова акрэп, а ў Вільні ў гэтым напрамку не робіцца нічога, што магчымасці к гэтаму маюцца, я паехаў у Вільню нелегальна. У хуткім часе Вільня адышла да Польшчы. Пачаліся рэпрэсіі і мая дзейнасць абмежавалася толькі пастаноўкай некалькіх спектакляў...»**

Праз месяц пасля прыбыцця ў Вільню Ф. Аляхновіч пачаў працаваць у беларускай гімназіі. У палітычным жыцці, як ён сам адзначаў, у той час не ўдзельнічаў. Летам разам з беларускай трупай ездзіў па правінцыі: Маладзечна, Вілейка, Ашмяны. Сродкаў на тэатральную работу выдзялялася мала, таму, вярнуўшыся з турнэ, ён вымушаны быў шукаць іншую работу. У гэты час у Вільні ства-

А таямніца пераўвасаблення,
Якога смертным нам не ўразумець
Без цвёрдай веры, што пазбегнем
тлення.

Што, нават захлынуўшыся тугой,
З тугі, з нябыту, з забыцця паўстанем,
Бо вечнасці патрэбен наш агонь,
Цяпер, і потым, калі нас не стане.

Абы з сумненняў выбрацца сваіх,
А не чакаць, што вера ў іх угразне...
У садзе зорак са́ма ярка з іх
Зноў ззяе тая,
што праз момант згасне.

●

Таямнічасць зямных скрыжаляў...
Спасцігаю душой спакой,
Глыбіню яго, што пужае
Чарнатою сваёй цяжкой.

Хтосьці тоіцца там, у змроку:
Зрэдку чутны то ўздых, то ўзмах
Лёгкіх крылаў ці шолах крокаў,
А гукну — і замрэ абсяг.

Толькі лёгкі павеў трывогі
Скалыхне цішыню наўкруг —
Дзе яе, дзе мая дарога,
Не падкажа няўлоўны рух.

Адступлюся, прыкрыю вочы,
Засланяючы цішыню,
І адчую: плыву за ноччу
На забыты ўжо кліч агню.

І сабе і агню чужая,
Прагну зліцца з той вышынёй,
І ні страху ў душы, ні жалю
Па самоце сваёй зямной.

Як жылося, так пражылося —
Збыўся ж, збыўся абраны лёс!
Што збылося, што не збылося,
Не пытацца ж цяпер у слёз...

●

Цягнік гадоў... Які ўжо там цягнік!
Адно ліхтар намацвае дарогу
Край бездані, ў якой разбіўся крык,
Самотны крык мой, не расчуты Богам.

Зноў не расчуты. Мабыць, нездарма.
Насустрач рушыла ўся тоўшча змроку,
І што ліхтар, калі сама, сама
Задзьму яго агонь праз колькі крокаў!

Успыхне неба— вольная душа,
Абрынецца цямрэчаю — не ўскрэсне
Для далечы, якою спакушаў
Ён, недасяжны, і душу і песню.

Усё вядома ўжо. І да канца.
У гэтым і асуд, і суцяшэнне.

Ніхто ніколі мне не абяцаў
Ні несмяротнасці, ні ўваскрашэння.

●

Жыву бязрадаснасцю дзён,
Такіх бяссонечных і шэрых,
Што зноў не дагукацца веры,
Не ўчуць, каму спявае звон.

Зямлі! Бязмежжу! Званару
Прасторы гэтай незямное!
Глыбеючы, сціхае рух
Што пада мной, што нада мною.

Мо час гэта, мо толькі шлях
Самотных дзён маіх у часе...
Не неба згасла — позірк гасне,
Не ўмеючы адолець страх.

Жыццё... А што пасля! За ім!
Уваскрашэнне! Змрок нябыту!
Усё ўжо начыста забыта,
Што стане спомінам маім.

Я ж помню, помню вышыню,
І звон яе, і лёгкасць крылаў,
Якімі неба нас прыкрыла
Ад яркага свайго агню.

Дзе той агонь! Калі ён згас!
Чаму сцюдзёна, шэра ў свеце!
Не сцюжы боязна, не смерці —
Прадоння, ў якім тоне час.

## ПЕРАКЛАДЫ

Летась у Ізяслава Катлярова, які жыве таксама, як і я, у Светлагорску, выйшла ў выдавецтве «Советский писатель» кніга вершаў «На расстоянии взгляда и души». Некаторыя з іх я пераклала. Думаю, што вершы вартыя таго, каб з імі пазнаёміліся чытачы «ЛіМа».

Соф'я ШАХ.

### Ізяслаў КАТЛЯРОЎ

●

Убачыць у гарадку краіны ўсёй абсяг
І думаць з нечаканымі слязамі:
не ўся вада, што ў гэтых берагах,
не ўся зямля, што тут перад вачамі.

Ды зноў лясы, адбітыя ў вадзе,
якія ты і знаеш, і не знаеш,
ды гэтак неба стыне ў немаце,
што слёз ужо зусім не адчуваеш.

Тут лашчыцца ля ног тваіх рака,
так ясна абуджае ўспаміны,
што без яе ўжо і без гарадка
табе не уявіць сваёй Айчыны.

●

Яшчэ не тут, яшчэ здалёк
як быццам цішыня ўздыхнула.
Яшчэ бы на яго намёк,—
не гул, а толькі рэха гулу.

Пад асляпляльнаю вадой,
пад яркім лугам прабярэцца.
Пасля — пад засенню лясной.
І нават ліст не зварухнецца.

Наяве ўсё, а нібы ў сне...
Нясмела слыхам спасцігаю,
Яшчэ чуцён ён толькі мне.
Пра што! І сам пакуль не знаю.

А сэрца ўжо дрыжыць у ім.
О, як ён уладарыць намі,—
той слоўны гул, той слоўны рытм,
яшчэ не злоўлены радкамі!

●

Чавусы... Вось і прыехаў,
быццам на нейкі фінал.
Даўнім, заплаканым рэхам
стрэціў пагоставы вал.

Побач з дарогаю дзесьці,
помніцца, маму хаваў...
Колькі магіл без адмецін,
колькі іх скрыта між траў!

Дзе мне схіліць тут калені,
дзе пакланіцца душой!
Ўюцца жалобныя цені,
сырасцю пахне грыбной.

Выйшла бабуля з прагалу
і праз гадоў шчыльны змрок
ў вочы зірнула... Пазнала:
— Дзе ж ты раней быў, сынок!

●

Ужо дарэчы і холад сёння,—
гэтак вычысціў сіняву.
Прачынаюся ў бліках, промнях,
успамінаю,— чаму жыву.

Толькі памяць маўчыць пужліва,—
я яе ад сябе таю...
Гэта яблыня, гэта сліва,—
ўсіх па шолахах пазнаю.

Што са мною было,— не важна,
ўжо не зменіць таго ніхто...
Я памерці магу адважна,
толькі ведаць было б,— за што.

Сад світальны акіну вокам,—
дробняць кроплі ў лісці зару.
Далей лугу і далей зроку,
і жыцця ўжо свайго гляджу.

●

Не перажыць, а ўсё-такі пражыць!
Я не хачу, каб ён імгненна кануў,
вось гэты дзень, які ўжо, можа быць,
за дні наступныя цяжэй не стане.

Над рэчкай снежна свеціцца язмін,—
іду туды, дзе шэпт яго цнатлівы...
Ну што з таго, што я ізноў адзін!
Пакуль жыву, я ўсё-такі шчаслівы.

Так рэчка ўжо струменіцца ўваччу,
так пахне сонцам цёплы пыл дарогі,
што я ізноў, што я ізноў шапчу:
мой цяжкі дзень, яшчэ падоўжся трохі!

●

рылася «Бальнічная каса» (страхавая каса), куды ён паступіў служачым і працаваў да 1926 года. Вольны час аддаваў тэатральнай дзейнасці. Ды не толькі тэатральнай...

Палітычныя хвалі ўсё ж захапілі Ф. Аляхновіча і прымусілі адступіць ад яго крэда: не ўмешвацца ў палітыку. Ён зрабіў крок, які ў далейшым многія разглядалі як трагічную памылку: уступіў у «Беларускую Часовую Раду» Паўлюкевіча. Цяжка сказаць, што прымусіла Ф. Аляхновіча звязаць свой лёс, няхай і на кароткі час, з тымі, хто ўзначальваў гэтую арганізацыю. «Аб тым, што Паўлюкевіч, Валейша, Знамяроўскі і іншыя з'яўляліся правакатарамі, здраднікамі беларускага рэвалюцыйнага руху, людзьмі без ідэй, якія прадаліся польскай паліцыі — я ведаў»,— так заявіў Ф. Аляхновіч на адным з допытаў у студзені 1927 года. Ведаў, але згадзіўся супрацоўнічаць. І нават, калі ўжо пакінуў Раду, паспрабаваў стварыць другую, падобную арганізацыю пад назвай «Беларуская хатка». Чаму? Застаецца толькі прыняць яго тлумачэнні гэтых падзей.

З архіва КДБ Рэспублікі Беларусь:

**«...У адказ на прад'яўленае мне абвінавачванне я заяўляю і падкрэсліваю, што маё знаходжанне ў «Беларускай Часовай Радзе» мела мэтай паралізаваць у магчымай ступені яе шкодную дзейнасць і было вядома і адобрана дэпутатамі Сейма: Тарашкевічам, Рак-Міхайлоўскім, дырэктарам Віленскай беларускай гімназіі Астроўскім і фактычным рэдактарам органаў Беларускай Сялянска-Рабочай Грамады Луцкевічам. Знаходзячыся ў Радзе, я падтрымліваў кантакты з гэтымі людзьмі, інфармаваў іх аб дзейнасці апошняй і супрацоўнічаў у органах друку Грамады пад псеўданімамі Монвід, С. Маскарас, Пуга».**

Развітаўшыся з Радай, Ф. Аляхновіч скіроўвае позірк на Мінск. Тут і толькі тут, лічыць ён, у яго будуць магчымасці цалкам аддацца тэатральнай справе, адысці ад палітыкі. Наіўна? Думаецца, так. Але гэта сёння мы гэтак лёгка судзім тых, хто жыў, працаваў і памыляўся ў той складаны час. Ужо потым, вырваўшыся з «салавецкага кашмару», Ф. Аляхновіч напіша ў кнізе «У кіпцюрох Г. П. У.»: «...Я гэтулькі чуў аб «вялікім савецкім будаўніцтве», аб росквіце ў старонцы пралетарскае дыктатуры навукі, мастацтва, тэхнікі, аб самавызначэнні народаў, якія «дабравольна» злучыліся ў саюз савецкіх рэспублік, і ў канцы — што для мяне, як для Беларуса, было найбольш заманчыва — я чуў аб беларусізацыі Беларускай Савецкай Рэспублікі: аб дзяржаўных тэатрах, аб шырокай выдавецкай рабоце...»

Так ці інакш, але ўвосень 1926 года Ф. Аляхновіч прыбыў у Савецкую Беларусь. Прытым легальна, маючы на руках замежны пашпарт і візу. Атрымаць іх, мяркуючы па яго паказаннях, дапамаглі Тарашкевіч і Рак-Міхайлоўскі.

**«Прыехаўшы ў Мінск, — успамінаў Ф. Аляхновіч, знаходзячыся ў следчым ізалятары ДПУ,—я папаў у нейкае цялячае захапленне. Усё для мяне было новым, мілым, прывабным. З замілаваннем глядзеў я на шыльды, дзе ўсе чатыры мясцовыя языкі красаваліся раўнапраўна, я быў гатовы кінуцца ў абдымкі кожнаму сустрэчнаму. Першы спектакль, які мне давялося ўбачыць у Мінскім Дзяржаўным Тэатры, была п'еса «Кастусь Каліноўскі», аб якой даходзілі ўжо да мяне слухі. Я быў зачараваны сюжэтам і выкананнем... З боку сяброў, знаёмых і таварышаў па сцэне я сустрэў гарачы прыём. З усіх бакоў чуліся пытанні: «Што, к нам? Назаўсёды?». Я адказваў: «Так, сябры мае. Хачу з вамі жыць. З вамі працаваць». У хуткім часе я пабачыў пастаноўку Віцебскага Дзяржаўнага Тэатра... У такі кароткі час, такія аграмадныя поспехі! І тады я канчаткова пераканаўся, што толькі пры рабоча-сялянскай уладзе наша мастацтва можа развівацца і квітнець...»**

Але эйфарыя доўжылася нядоўга. Хутка Ф. Аляхновіча напаткаў першы ўдар: яму недвухсэнсоўна было сказана, што разлічваць на тое, каб застацца ў БССР, не можа. Праўда, вясной наступнага года кампетэнтныя органы гатовы былі дазволіць яму з сям'ёй пасяліцца ў Мінску, але пры ўмове, што акажа рабоча-сялянскаму ўраду адпаведную паслугу. Дзеля гэтага яму прапанавалі часова вярнуцца ў Польшчу.

Можна толькі здагадвацца, колькі прыйшлося перадумаць Ф. Аляхновічу, перш чым прыняць такое рашэнне: «Мною авалодала манія праследавання. Мне здавалася, што маё знаходжанне ў Мінску ўзбудзіць падазрэнне ў польскіх улад, што я, прыехаўшы ў Польшчу, буду арыштаваны... Але выхаду не было. Гэтай цаной я купіў сабе права вярнуцца вясной у Мінск і заняць тут ціхае, але такое жаданае для мяне палажэнне тэатральнага дзеяча».

Вяртанне ў Польшчу, аднак, не адбылося. Якраз у Мінску, па дарозе з Варшавы ў Маскву, прыпыніўся паўнамоцны прадстаўнік БССР пры Савецкім пасольстве Ульянаў, які ведаў Ф. Аляхновіча і выдаваў яму візу на ўезд у СССР. Пры сустрэчы Ульянаў сказаў, што ён у Польшчы не прынясе карысці савецкай уладзе і лепей звярнуцца да ўлад з просьбай аб грамадзянстве БССР. Просьба гэтая хутка была задаволена, і Ф. Аляхновіч з палёгкай паехаў у Віцебск, дзе рыхтавалася да пастаноўкі яго п'еса. Але радавацца было рана. 1 студзеня 1927 года ў Віцебску Ф. Аляхновіча арыштавалі і даставілі ў Мінск. Праз некалькі месяцаў, 16 сакавіка 1927 года, яму прад'явілі абвінаваўчае заключэнне. Прыводзім яго цалкам:

**«Абвінаваўчае заключэнне па справе № 4636 па абвінавачванні грамадзяніна Аляхновіча Франца Карлавіча ў злачынстве, прадугледжаным арт. 61 КК**

**Абвінавачваецца:**

**Грамадзянін Аляхновіч Ф. К., 1883 г. нараджэння, выхадзец з сям'і мяшчан г. Вільні, беларус, скончыўшы 6 класаў гімназіі і драматычнае вучылішча, па прафесіі акцёр-драматург, журналіст,—за ўдзел у арганізацыі, якая дзейнічала ў накірунку дапамогі міжнароднай буржуазіі, г. зн. у тым, што перайшоўшы ў лютым 1921 г. нелегальна Дзяржаўную граніцу з БССР на бок Польшчы, прыняў актыўны ўдзел у дзейнасці «Часовай Беларускай Рады» (як намеснік старшыні), створанай польскай палітычнай паліцыяй з мэтай барацьбы з беларускім рэвалюцыйным рухам у Польшчы, шляхам адпраўкі на тэрыторыю БССР узброеных атрадаў, дыверсантаў, шпіёнаў, правакатараў і выйшаўшы з Рады ў 1926 годзе асабіста стварыў пры пасрэдніцтве той жа палітычнай паліцыі, аналагічную арганізацыю «Беларуская Хатка», а затым у 1925 г. прыбыў у СССР для выканання тых жа мэтаў Рады, г. зн. у злачынстве, прадугледжаным 61 арт. КК.**

**На аснове загаду АДПУ за № 499-23 г. гэтая справа накіроўваецца ў Калегію АДПУ на разгляд у несудовым парадку.**

**Рэчавых доказаў па справе няма.**

**Складзена 16 сакавіка 1927 г. г. Мінск»**

11 ліпеня 1927 года Калегія АДПУ разгледзела (на судовым) пасяджэнні гэтую справу па арт. 58/5 КК і вынесла пастанову: «Аляхновіча Ф. К. заключыць у канцэнтрацыйны лагер тэрмінам на дзесяць гадоў».

Усе просьбы родных (перш за ўсё маці, якая жыла ў Мінску) заставаліся без адказу. Умяшаліся прадстаўнікі грамадскасці. У кастрычніку 1927 года на адрас Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саветаў БССР прыйшоў такі ліст:

**«У Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Саветаў БССР**

**Мы, ніжэй падпісаныя, просім ЦВК БССР дараваць беларускаму пісьменніку-драматургу Францішку Аляхновічу і выпусціць на волю дзеля літаратурнае і тэатральнае працы ў БССР.**

**25 кастрычніка 1927 г.**

**Падпісалі:**

**Якуб Колас, М. Гарэцкі, аўтар «Гісторыі беларускай літаратуры», З. Бядуля, В. Друшчыц, праф. Беларускага Дзярж. Універсітэту, Міх. Грамыка, дацэнт БДУ і пісьменнік Янка Купала, А. Гурло, Аркадзь Смоліч, праф. БДУ, правадзейны член Інстытуту Беларускай культуры, Язэп Лёсік член Інбелкульту, Уладзімір Жылка, Бр. Эпімах-Шыпіла, А. Багдановіч, дацэнт БДУ, Мікола Байкоў, Н. Красінскі—дырэктар БДТ-2, Янка Лабаноўскі, А. Грыневіч, Ч. Родзевіч, член І. Б. К., А. Пітуховіч, праф. БДУ.»**

Зварот гэты не дапамог. Пасяджэннем Калегіі АДПУ (судовым) ад 27 сакавіка 1928 г. было вырашана амністыі ў адносінах да Ф. Аляхновіча не прымяняць.

Толькі праз сем гадоў сталічныя ўлады пагадзіліся абмяняць яго на арыштаванага палякамі Браніслава Тарашкевіча. Перад вызваленнем у Ф. Аляхновіча адбылася сустрэча з саветнікам польскага пасольства Сакольніцкім. У заключэнне яе Сакольніцкі сказаў Ф. Аляхновічу, каб той па прыбыцці ў Польшчу не даваў ніякіх інтэрв'ю. Такая дамоўленасць, маўляў, была ў яго з НКУС і ён просіць не падводзіць. На гэта Ф. Аляхновіч адказаў, што ніякага жадання пісаць у яго зараз няма. Праўда, праз некалькі гадоў з-пад яго пяра выйшла кніжка-ўспамін пра сем гадоў, праведзеных у Салавецкім канцэнтрацыйным лагеры, якая на працягу 1935—1937 гг. пабачыла свет у Еўропе і Амерыцы на сямі мовах. Нядаўна і беларускі чытач атрымаў магчымасць прачытаць яе. А дзякуючы работнікам Камітэта Дзяржаўнай Бяспекі Рэспублікі Беларусь, якія дазволілі пазнаёміцца з судовай справай яго, мы змаглі больш дакладна і падрабязна пазнаёміцца са старонкамі жыцця беларускага драматурга.

**Валянціна і Георгій ГРЫГОР'ЕВЫ,**
**старшыя навуковыя супрацоўнікі**
**Інстытута гісторыі АНБ.**

# Энтузіясты Адраджэння

Мінула ўжо нямала часу пасля таго канцэрта, але не магу не падзяліцца ўражаннямі. Вядомы чытачам «ЛіМа» беларускі ансамбль салістаў «Класік-Авангард» выступіў у Гродне з праграмай старадаўняй і сучаснай музыкі. Наша музычнае мінулае было прадстаўлена псальмамі на тэсты Сімяона Полацкага і «Віленскім сшыткам».

Сюіта «Віленскі сшытак» мае і другую назву: «Зборнік п'ес беларускага барока ў інструментоўцы А. Літвіноўскага». У яе ўвайшлі асобныя п'есы з лютневай табулатуры, знойдзенай у Вільні і датуемай прыкладна 1600 годам. Сюіта пабудавана на чаргаванні аркестравых і сольных нумароў. Сольную партыю выканаў таленавіты гітарыст Валерый Жывалеўскі. Як заўсёды гітара кранала стрыманым і журботным гукам, непасрэднасцю і разам з тым таемнай глыбінёй. Гітарныя нумары, на мой погляд, выклікалі большае ўражанне, чым аркестравыя часткі сюіты. Ці не таму гэта здарылася, што гітара і лютня — роднасныя інструменты, што гітары блізкі інтымны свет лютні? Вядома, кожны музыкант мае права на індывідуальнае прачытанне арыгінала. У будучым В. Жывалеўскі мяркуе зрабіць свой варыянт «Віленскага сшытка» з інакшым адборам п'ес і новай аркестроўкай. Хацелася б пажадаць, каб ён захаваў далікатнасць і тактоўнасць у рабоце з такім крохкім матэрыялам, як старадаўняя музыка.

Мастацкі кіраўнік «Класік-Авангарда» Уладзімір Байдаў распавёў пра творчае аблічча ансамбля, які быў удзельнікам трох фестываляў памяці І. Салярцінскага ў Віцебску, Першага міжнароднага фестывалю камернай авангарднай музыкі ў Мінску, а таксама гістарычнага ўжо фестывалю «Адраджэнне беларускай капэлы». Цяпер калектыў плануе цыкл тэматычных канцэртаў у філармоніі, запісы на грампласцінкі, мяркуюцца гастролі ў Маскве і Пецярбурзе.

Мне падалося, што музыка мінуўшчыны ў выкананні «Класік-Авангарда» гучыць трохі больш сціпла, чым рамантычная ці сучасная. Узнікла пытанне: ці не чужы нам стаў духоўны вопыт нашых продкаў? На думку У. Байдава, нівеліроўка гучання непазбежная, папершае, з-за таго, што ў распараджэнні ансамбля няма старадаўніх інструментаў — лютняў, віёлаў, флейт, па-другое, творы мінулага — гэта ціхая, вытанчаная музыка і яе трэба іграць у малых (камерных) залах, а не ў такіх аграмадных, як зала гродзенскага палаца «Юнацтва», па-трэцяе, трэба ўлічыць і тое, што яна звычайна падносіцца ў сучасных транскрыпцыях. Таму часам цяжка вызначыць, у якіх выпадках арыгінал рэстаўруецца, а ў якіх — скажаецца. Мабыць, лагічней было б ставіцца да твораў старых майстроў як да помнікаў гісторыі і не спяшацца ацэньваць іх з мастацкага пункту гледжання. Слухачы з часам яшчэ атрымаюць асалоду ад хараства сапраўднай старадаўняй музыкі!

Саліст Віктар Скорабагатаў праспяваў чатыры псальмы, у тым ліку — псальму Васіля Цітова, выдатнага рускага кампазітара другой паловы XVII ст., якім, дарэчы, напісана цудоўная музыка да ўсёй «Псальтыры рыфмаванай» Сімяона Полацкага. Застаючыся вядучым салістам опернага тэатра, В. Скорабагатаў аддае шмат сіл нашай камернай музыцы. Ён праспяваў дзесяткі й дзесяткі рамансаў беларускіх кампазітараў. Яго падзвіжніцтва ў гэтай справе заслугоўвае самых добрых слоў. Як вядома, менавіта ён быў ініцыятарам правядзення фестывалю «Адраджэнне беларускай капэлы». Цяпер садзейнічае адкрыццю Цэнтра адраджэння нацыянальнай музыкі. Як мяркуе В. Скорабагатаў, нам трэба аднавіць у прыстойным аб'ёме музычную культуру мінулага — як свецкую, так і духоўную. Акрамя таго, трэба аднавіць важнейшы эстэтычны прынцып колішніх капэл: сёння пішацца — сёння ж і выконваецца! Без гэтага прынцыпу любое творчае аб'яднанне — філармонія ці капэла — будзе ў аснове сваёй кансерватыўным і ў рэшце рэшт перастане выконваць ускладзеныя на яго функцыі.

Выснова зразумелая: без рэспубліканскай і абласных капэл, без Цэнтра адраджэння нацыянальнай музыкі не ўдасца вярнуць да жыцця наша багатае музычнае мінулае, мы не здолеем далучыць кожнага беларуса да гісторыі сваёй дзяржавы. Беларусь была краем высокай музычнай культуры, і дай Бог ёй зноў набыць сябе ў гэтай якасці.

**Віталь РАДЗІЕНАЎ.**

г. Гродна.

НА МУЗЫЧНАЙ СЦЭНЕ

# Выпрабаванне Булгакавым

## «МАЙСТАР І МАРГАРЫТА» Я. Глебава ў Акадэмічным тэатры оперы і балета

Напрыканцы красавіка ДАВТ Беларусі пакажа оперу Я. Глебава «Майстар і Маргарыта» ўжо ў іншым, змененым аблічы — параўнальна з тым, што мы чулі ды бачылі месяц таму. Але тыя першыя прэм'ерныя паказы, якіх чакалі самыя нецярплівыя тэатралы, меламаны, прыхільнікі творчасці М. Булгакава, прафесійныя музыканты,—ужо зрабіліся здабыткам спрэчак і размоў нашай культурнай грамады. З'явіліся і першыя рэцэнзіі. Спектакль займеў як сваіх прыхільнікаў, так і тых, хто не прыняў яго цалкам. Таму, нягледзячы на тое, што ў бліжэйшы час ён паўстане шмат у чым іншым, мы пагаворым пра першае, мо і не зусім адэкватнае з пункту гледжання пэўнай часткі публікі, увасабленне геніяльнага булгакаўскага рамана на опернай сцэне.

Я. Глебаў вельмі доўга ішоў да гэтай працы. Шматгадовыя глыбокія разважанні кампазітара пра сэнс быцця, пра жыццё й смерць, пра неўміручасць знайшлі свой асаблівы рэзананс у задуманай оперы. Геніяльны твор Булгакава ён ведае ці не на памяць. І тым больш цяжка яму працавалася над партытурай, бо звышзадачай было не «адштурхнуцца» ад тэксту, не рыфмаваць неўміручыя радкі, а як мага больш ашчадліва захаваць іх у оперы. Гэтая праца была выканана з дапамогай сааўтара лібрэта Л. Глебавай. Ды такі падыход зрабіўся ў пэўным сэнсе «коранем праблем» пры сцэнічным увасабленні: з'явіліся размоўныя дыялогі, якія не надта ўдала ўпісаліся ў дзеянне, расчлянілі ды здрабнілі яго. Дый оперныя спевакі ніякавата пачуваюцца ў размовах на сцэне.

Музычная драматургія оперы яшчэ знойдзе свайго даследчыка. Адзначу толькі асаблівую поліфанічную структуру апавядання, сімфанізаванае разгортванне некалькіх ліній, монатэматызм твора. Праз усю оперу праводзіцца адна папеўка, інтанацыйна блізкая вядомай песні «Вечерний звон», для аўтара, відаць, глыбока сімвалічнай. Яна працінае ўсю музычную тканіну, з яе вырастаюць многія тэмы оперы. Стыль партытуры, у якім і вострая экспрэсіўнасць, і філасафічнасць, і трапяткая лірыка, — арыентуецца на дух булгакаўскай прозы, адлюстроўвае намер кампазітара данесці ідэю рамана: неўміручасць сапраўдных чалавечых каштоўнасцей, повязь вобразаў і сувязь эпох. Пры гэтым відавочна, што «Майстар і Маргарыта» — узор менавіта глебаўскай музыкі, дзе «цытуюцца», замацоўваюцца знойдзеныя ў працы над ранейшымі партытурамі, дарагія аўтару мелодыі, характэрныя для ягонага почырку аркестравыя прыёмы, тэмбравыя спалучэнні.

Паводле задумы кампазітара ды лібрэтыста спектакль мусіў разгортвацца па дакладнай адзінай лініі: ад фарса да драмы і ад яе да трагедыі. І гэты трохактовы твор з кульмінацыяй у апошняй дзеі паўстае перад слухачом і гледачом праз шэраг карцін, дзе гратэск змяняецца высокім каханнем, здрадніцтва — Галгофай, дзе чаргуюцца рознахарактарныя эпізоды: то сур'ёзныя, то камічныя, то фарсавыя, то адцягненыя. Рэжысёр - пастаноўшчык В. Цюпа і мастак У. Арэф'еў імкнуліся наладзіць дыялог з партытурай, арганізаваць тэмпарытмічныя звязы, поліфанію вобразаў, атмасферу, вызначальную для ўнутранага драматызму спектакля.

Сцэна са спектакля. У цэнтры — н.а. рэспублікі У. ЭКНАДЗІЕСАЎ (Майстар).

Фота У. ПАНАДЫ.

Вялікай удачай, на мой погляд, сталася сцэнаграфія. Мастак знайшоў такое сцэнічнае ўвасабленне дзеяння, якое спакваля раскрываецца як істотны мастацкі элемент спектакля. Куб з люстранымі гранямі, які знаходзіцца ў цэнтры сцэны і падзяляе яе прастору, з'яўляецца адначасова нібыта вежай з далёкага мінулага, ля падножжа якой — прах стагоддзяў, і дадатковай пляцоўкай, дзе разыгрываюцца найбольш важныя дыялогі: Пілат — Ешуа, Пілат — Каіфа. Люстэркі ўтвараюць гульню святла, у іх адбіваюцца-падвойваюцца людзі ды рэчы, узнікаюць як бы маляўнічыя кантрапункты — карціны таго, што адбываецца па-за сцэнай (эпізод адплаты Іудзеі). Насычанасць выяўленчага шэрагу, багатая светлавая партытура (майстар па святле С. Мартынаў) надаюць відовішчу асаблівы «булгакаўскі» каларыт інфернальнасці й сучаснасці (колькі разоў эфект дынамічнай гульні святла трапляецца ў рамане!).

Рэжысёрскія пошукі В. Цюпы скіраваныя, відаць, на псіхалагічную верагоднасць, пільную ўвагу да дэталяў, але, як і ў папярэдняй яго опернай пастаноўцы — «Кармэн», абстрактна-разумовыя канцэпцыі апынуліся ў разладзе з дзеяннем. Гэта датычыць і сцэны ў вар'етэ, і неўразумеласцяў у трактоўцы вобраза Маргарыты, асабліва ў II дзеі пасля з'яўлення Майстра, і сцэн Пілата і Ешуа (III дзея). Тое, што ў рамане і ў партытуры адбываецца наяве, сцэнічна пададзена рэтраспекцыяй: Пілат, аказваецца, успамінае ўсё, што здарылася ў вясновы месяц Нісан напярэдадні свята Пасхі ў Ершалаіме, і Ешуа (з якім адбываецца дыялог), ужо распнуты на крыжы і схаваны ў нейкі напаўпразрысты цыліндр ці калону за спіной Пілата. Я ўжо

# «Мяняйце імёны і строі...»

## «ЛАЛІТА» ў Брэсцкім аблдрамтэатры

Жадаеце ўбачыць эратычныя сцэны і экзотыку замежнага жыцця? — Калі ласка! Не проста асабняк, цэлы мармуровы палац пабудаваў на берасцейскай сцэне мастак В. Лесін. У гэтых харомінах, відаць, некалі блукалі Саламея або царыца Саўская, а цяпер у іх хутчэй чакаеш з'яўлення галодных малпаў — палац мёртвы. Сюды даўно не ступала нага чалавека. Закінутыя рамантычныя паўруіны чакаюць свайго выпадковага першаадкрывальніка. Крыху пазней на фоне кранутага плесняю шэрага мармуру з'яўляюцца салонныя карцінкі мах, што ўжо распрануліся і яшчэ распранаюцца — мёртвая пустэча экзатычнай глушы вось-вось ажыве... Тым больш у цэнтр сцэны выстаўлены велізарны ложак і які б маршрут ні выбіралі сабе персанажы, ім яго не абмінуць.

Занадта ўжо сусальна «выпісаны» мастаком заморскі палац і занадта навязліва выглядаюць у ім статуэткі і вазоны з кааператыўных крамак, каб прыняць увасобленае ўбогае ўяўленне аб раскошы за «чыстую манету». Амаль нязменны атрыбут «эратычнага кіно» — раскоша трапічных раслін — у дэкарацыях таксама прысутнічае, але з той жа здзеклівай інтанацыяй — калі ласка! Страсці ў ценю гаршчочных раслін...

У апошнія гады тэатр, здаецца, узяў на сябе функцыі масавай рэкламы скандальна вядомага за мяжой рамана У. Набокава «Лаліта» і настойліва падаграе вакол яго айчынны ажыятаж. Рэдка за апошнія гады сустрэнеш гастралёраў, якія б не мелі ў рэпертуары сваёй «Лаліты». Нават для цяперашняга часу сексуальнага плюралізму адносіны, у якіх для масавага чытача заключана соль рамана, — экзатычныя: там саракагадовы дзяцюк з дзяўчынкай!.. Як кажуць, да ўласнай пачуццёвасці не кожны «прымерыць». Адносіны не проста падсудныя закону і маралі (хоць сабе й моцна асучаснены): пра такое прывыклі чытаць толькі ў калонках злачынстваў...

Ні да рамана У. Набокава, ні да п'есы Э. Олбі (яго драматургічнай трансфармацыі) спектакль берасцейцаў ніякага дачынення не мае. Тэатр увасабляе страсці паводле Набокава, масавыя чуткі пра раман, плёткі пра яго, мінаючы самую літаратуру. Падражніць далёка не вытанчаныя жаданні гледача, пагуляцца з імі і ўвасобіць іх, — вось мэта, дзеля якой тэатр мабілізуе свае лепшыя сілы!

Чакаеце інтымнасцей? А рэжысёр У. Караткевіч не без злой іроніі ставіць «Лаліту» ў інтанацыях і прыёмах манежнага прадстаўлення. Хамберт у выкананні В. Міхайлава — кілімны клоун, які без прэлюдый гучна раве, што закаханы ў дзяўчынку! Так (пад выбухі рогату) прызнаюцца клоуны ў сваіх непадзеленых пачуццях да сланіх і, завалодаўшы ўвагай публікі неверагоднасцю становішча, ператвараюць потым кожную рэпліку ў забаўнае антрэ. Рыжы заўсёды пасмешышча, заўсёды пазначаны нейкім дзівацтвам. Акруглы карантыш з платаяднымі вачамі ў пінжаку бардо ў В. Міхайлава — кампліемент гледачу (маўляў, глядач — душэўна добраўпарадкаваны і бліжэй да фізіялагічнай нормы). В. Міхайлаў часам імкнецца захаваць выратавальную чалавечую дыстанцыю паміж сабой і гэтым сексуальна заклапочаным тыпам, застаецца нібы ўбаку ад свайго персанажа, але часцей не пазбягае спакусы па-акцёрску «пературэсці» ягоныя сальныя, «заслюненыя» перажыванні.

У ягоных абдоймах сцішыцца вульгарная пампушка — такая Шарлота (Т. Валчэцкая) — белая клаунэса з вялізным азадкам і ўскудлачанай галавой. У тэатральным парадзе-але Лаліта з'яўляецца танцоўшчыцай з пёрамі ў руках. У выкананні В. Чачэрынай гэта раздуранае, разбэшчанае дзіця, якому, на сваю галаву, дужа патуралі. Сябар сям'і — Куілці (М. Мятліцкі) — закончаны нахабнік, валіць усіх на ложак і фатаграфуе. Ці то шпіён, ці то фокуснік: змяняе прычоскі, насы і нават пол. І ў крытэрыях гэтага падкрэслена нездаровага свету Куілці — поўны дэгенерат, бо, як хутка высвятляецца, на сексуальны кантакт не здольны і шукае асалоды, пільнуючы парачкі, смакуе схапіць іх аб'ектывам.

Менш за ўсё можна было спадзявацца, што тэатр знойдзе ў «Лаліце» матэрыял для камедыі і зробіць з герояў тонкага псіхалагічнага рамана пасмешышча. Каб пакпіць з нешляхетнага густу публікі ды зрабіць пародыю на эратычныя гісторыі, наўрад ці можна было знайсці больш неадпаведную літаратуру. Да таго ж іронія, ледзь-ледзь пазначаная, хутка знікае і намаганні з боку акцёраў, рэжысёра, мастакоў захаваць яе, патанаюць у моры разліваным — пошласці, якая выйшла з берагоў. Ды і, па шчырасці, захаваць іронію не вельмі імкнуцца. Становішча ў тэатра... ханжаскае. Разумны і ўважлівы да сваіх персанажаў пісьменнік, які пазнае ў іх сябе і губляе ўсе ніці разумення іх непрадказальных учынкаў у берасцейцаў асоба шэрая — графаман, які прыдумвае самыя недарэчныя - павароткі сюжэта толькі дзеля таго, каб Хамберт змог максімальна рэалізаваць свае паталагічныя схільнасці. У выкананні У. Кулішава ён гэткі ж

не кажу пра тое, як цяжка выканаўцу спяваць у такім становішчы — гэта проста непераканаўча з пункту гледжання драматургічнай логікі, нават тэкст не стыкуецца з «карцінкай» («Развяжите руки...» і да т. п.). Наступныя драматычныя сцэны з Каіфай і з Левіем Мацвеем, поўныя трагізму і вобразнай адпаведнасці, толькі падкрэсліваюць надуманасць і непераканаўчасць рэжысёрскай канцэпцыі дыялога Понція Пілата і Ешуа. І гэта вельмі засмучае, бо акурат тут — філасофская, драматычная вяршыня ўсёй оперы.

На працягу ўсяго III акта, гэтага славутага «рамана ў рамане», разгортваюцца перад намі пакуты, трагедыя сумлення пятага пракуратара Іудзеі. Дакладна «патрапілі ў вобраз» абодва выканаўцы партыі Пілата — А. Саўчанка і М. Жылюк. Увогуле, размова пра выканаўцаў у гэтай оперы асаблівая. На аснове булгакаўскага рамана аўтары склалі такі тэкст, у якім ці не кожная фраза, кожнае слова павінны гучаць з драматычнай выразнасцю і ўспрымацца сімвалічна. Апроч таго, у оперы вялікая градацыя відаў вакалізацыі: тут і меладычны рэчытатыў, і звычайная гаворка, і арыёзнае пяянне. Панаванне моўнай інтанацыі стварыла для салістаў дадатковую складанасць. А ім жа, зразумела, для стварэння булгакаўскіх вобразаў давялося глыбока спасцігнуць псіхалогію і нават падсвядомасць сваіх персанажаў!

У цэлым акцёрскі склад досыць паспяхова справіўся са сваімі складанымі задачамі. Назіраючы на апошніх перадпрэм'ерных рэпетыцыях за тым, як пакутліва цяжка выбудоўвалася дзеянне, як нялёгка акцёрам працаваць у даволі нязвыклых, часам проста няручных для спеваў мізансцэнах (дуэты Майстра і Маргарыты ў I і II дзеях), на абодвух прэм'ерных спектаклях я была прыемна ўражана тым, наколькі выканаўцы засяроджана й дакладна правялі свае ролі, як зрушыўся тэмпарытм відовішча.

Асноўная нагрузка, натуральна, выпала на долю галоўных герояў. Думаю, У. Экнадзіёсаў у ролі Майстра паказаў свае лепшыя якасці. З дзвюх выканаўцаў ролі Маргарыты — Н. Кастэнкі і Т. Глаголевай — адзначу больш дакладнае дыкцыйна і па-акцёрску выкананне Т. Глаголевай, чыя гераіня нібыта выпраменьвае дзённае святло, лучыць сімволіку оперы з жыццём. Прыкметны ў ролі Воланда А. Кеда: гэта не «часть той силы, что вечно хочет зла и вечно совершает благо», але дух, воляю якога складваецца лёс усіх іншых персанажаў. Ёсць спроба па-акцёрску асэнсаваць карыкатурна-гратэскную тройцу — Кароўева, Бегемота (А. Тузлукоў, Ю. Слонаў, Р. Палішчук), Азазелы (У. Каўрус). Выканаўца ролі Левія Мацвея ў першым спектаклі Р. Палішчук прывабіў сваёй сцэнічнай арганічнасцю, выразнасцю інтанацыі й дыкцыі. Ешуа ў выкананні С. Драбышэўскага і М. Грыгорчыка — відавочная ўдача спектакля. Экспрэсіўна правялі сцэну з Пілатам абодва выканаўцы партыі першасвяшчэнніка Каіфы Г. Чэпікаў ды В. Стральчэня. Засталася ў памяці і В. Цішына (жонка Семпляярава) — актрыса не згубілася ў калейдаскопе постацей і твараў шматлюднай I дзеі.

Музычны кіраўнік і дырыжор А. Анісімаў імкнуўся, каб процістаянне цэнтральных вобразных сфер — цемры і святла, грукату і цішыні, зла і дабра—успрымалася як хоць і супярэчлівы, але адзіны оперны арганізм.

«Майстар і Маргарыта» Я. Глебава завяршаецца дуэтам герояў, у якім гучыць тэма іх кахання — «сапраўднага, вернага, вечнага». Ціхі гімн хараству чалавечых узаемаадносін і шчасця...

Ці кране гэты гімн слухацкія сэрцы? Ці будзе шчаслівым сцэнічны лёс оперных Майстра і Маргарыты? Ці доўгім будзе жыццё новага спектакля, у які пасля двух прэм'ерных паказаў уносяцца карэктывы? Адназначных адказаў няма, бо ў кожнага — глыбока сваё, можа, нават інтымнае ўспрыманне рамана «Майстар і Маргарыта». Адназначна, бадай, толькі тое, што вынікі выпрабавання Булгакавым, якое прыйшло і ў оперны тэатр, цікавяць шматлікіх прыхільнікаў ягонай творчасці.

**Іна ГУРАРЫЙ.**

---

нягеглы, як і ягоныя героі. Сам не супраць спакусіцца тым, на што правакуе сваіх герояў, але пры гэтым крывадушна бярэ на сябе ролю добрапрыстойнага міравога суддзі. За цыркавой формай тэатр схаваўся ад тых праблем чалавечага існавання пра якія У. Набокаў у рамане гаворыць нязвыкла для нашай пурытанскай закамплексаванай свядомасці. Тэатр і не імкнецца далучыцца да гаворкі такога ўзроўню, а, наадварот, як мага спрашчае сітуацыі і матывоўкі. Разыгрываецца трывіяльная гісторыя спакушэння. Хамберт пажадліва чакае доўгачаканы момант завалодання Лалітай. І калі, нарэшце, «татусь» дарваўся, і мізансцэна на касмадроме ложка абяцае разгарнуцца ў «эратычную сцэну», рэжысёр, шкадуючы сваіх гледачоў, адгароджвае яе ад іхніх вачэй шырмачкай. Ён выпускае на авансцэну таго самага джэнтльмена-мараліста (пісьменніка), які, заспеўшы нас знянацку, павучальна водзіць пальчыкам: «Вядома, вы не супраць паглядзець, што ж там робіцца?» і прапаноўвае пагадзіцца з тым, што ўсе мы па сутнасці—жывёліны... (?!)

І ў глядзельнай зале, і на сцэне чалавек зведзены да інстынкту. Персанажы элементарныя ў сваёй ілжывай шматзначнасці. Калі сцэнічна разгарнуць гісторыю жыцця кожнага з іх, то ў ім выявяцца не менш крымінальныя і паталагічныя моманты. «Змяняйце імёны і строі, месцы пражывання і тады вы зможаце захаваць у тайне сваё мінулае і цяперашняе». Гэтай парадзе, выпадкова кінутай адным з персанажаў, здаецца, наследуюць у спектаклі ўсе. Хамберт — ахвяра ўласнай нястрымнай страсці, бо не здолеў яе схаваць. Самец, які даводзіць сябе фізіялагічнай рэўнасцю і ўразлівасцю да шаленства. Кашуля з вар'ята ці электрычнае крэсла — непазбежны вынік для гэтага героя.

Мо і не варта было так шмат гаварыць пра спектакль, які — толькі даніна часу, модзе, варварскім густам і ніколі не будзе аднесены тэатразнаўцамі ні да якіх творчых дасягненняў берасцейцаў. Чаму, скажам, не сказаць пра крамальны, чалавечы ў сваіх пастаральных інтанацыях спектакль «Грай, Ёсель, грай...» у пастаноўцы У. Караткевіча. Бо творчае аблічча вызначае лепшыя работы трупы?..

Не ад добрага жыцця адыходзіць сёння берасцейскі тэатр у масавую культуру і менавіта ў рэчышчы падобных убогіх камерцыйных пастановак бачыць сваю бліжэйшую будучыню. У жорсткіх умовах цяперашняга існавання тэатраў, калі не сёння-заўтра многія з іх могуць проста зачыніцца, крытэрый, які забяспечыць калектыву права на існаванне, будзе адзін. Не навізна сцэнічных пошукаў, не багацце сцэнічнай культуры, не эксперымент, а сума збораў. Апошнімі гадамі публіка ўцякала з тэатра, вярнуць яе — значыць выжыць. Праз масавую культуру намагаюцца вярнуць яе сабе берасцейцы.

Ці ж вернуць?

**Уладзімір МАЛЬЦАЎ.**

---

# «Для мяне беларускасць пачалася з Вільні...»

## Маналог захопленага чалавека

**Уладзімір Канановіч — аспірант Інстытута гісторыі АН Беларусі, даследуе сярэднявечча. Можа, таму ў ягонай нататцы шмат спасылак на гістарычнае мінулае. І хаця некаторыя рэчы для нас не навіна, але асабіста для маладога чалавека яны крэўна блізкія, бо складаюць частку яго светапогляду. Гэтым — асабіста важным — і прыцягвае роздум У. Канановіча.**

... Дзень 23 сакавіка 1987 года назаўжды застанецца ў маім сэрцы. У той дзень упершыню ў сваім жыцці, будучы праездам з Гародні ў Астравец, я трапіў у горад, з якім у мяне ў хуткім часе будзе звязана шмат успамінаў. Пра горад гэты ведаў і чуў раней, але ягоная назва «Вільнюс» мне нічога не казала, не выклікала ніякіх пачуццяў. Лічыў, як шмат хто на Беларусі, што горад не меў ніякага дачынення да гісторыі і культуры Бацькаўшчыны. Ды і школьныя, і універсітэцкія падручнікі сарамліва замоўчвалі значэнне Вільнюса-Вільні для нашага народа.

Тое, што я ўбачыў, робячы першыя крокі па віленскай зямлі, пераўзышло ўсе мае спадзяванні. Я быў настолькі зачараваны хараством і веліччу старой Вільні, што адразу забыўся пра даволі моцны, нягледзячы на сканчэнне першага месяца вясны, мароз. У той дзень я адкрыў для сябе Вільню, а Вільня, у сваю чаргу, адкрыла мне Беларусь.

Для мяне асабіста беларуская культура пачыналася з Вільні. Потым было шмат вандровак і паездак у Вільню, у выніку якіх у маёй свядомасці склаўся трывалы вобраз горада.

...Нішто так не кідаецца адразу ў вочы, калі ўпершыню трапляеш у Вільню, як віленскія помнікі архітэктуры. Надзвычай уражвае гарманічнасць і дакладнасць архітэктуры старой часткі горада. Усе стылі, якія складваліся ў Вільні стагоддзямі, арганічна зліліся ў адно цэлае, стварылі неверагодна маналітны архітэктанічны ландшафт. Готыка і рэнесанс, барока і ракако, класіцызм і мадэрн—кожны стыль спалучае і ўзаемна дапаўняе адзін аднаго. Любы будынак старога горада мае сваю адметнасць і непаўторнасць. І толькі асобныя цэрквы (Прачысценская, Свята-Мікалаеўская, Пятніцкая — помнікі XVI ст.), перабудаваныя ў пачварна - эклектычным стылі мураўёўскай эпохі, як незагойныя раны, праходзяць па ўсім жывым целе Вільні.

У Вільні быццам адчуваеш сябе непасрэднай часткай горада, злучаешся з ім. Горад не цісне на чалавека, а, наадварот, дапамагае яму зразумець ягонае прызначэнне на зямлі.

З чым толькі не параўноўвалі Вільню! І з Ерусалімам, і з Афінамі, і з Флярэнцыяй... У гэтых словах і эпітэтах заключалася прызнанне непарушнай повязі горада з сусветнай культурай. Але ўсё ж такі Вільня для ўсіх нас адна, непаўторная ў сваім родзе, не падобная ні на адзін другі горад свету. І ў гэтым яе прывабнасць і прыцягальная сіла.

Вільні, з самага пачатку яе заснавання, было наканавана гісторыяй стаць культурным і палітычным цэнтрам. У ролі заштатнага і правінцыйнага гарадка Вільню немагчыма ўявіць. Горад створаны для вірлівага, насычанага разнастайнымі падзеямі жыцця. Рэдкі выпадак у сусветнай гісторыі, калі горад лічаць родным прадстаўніком трох народаў, уклаўшых у Вільню душу,— беларусы-ліцвіны, палякі, летувісы.

Нельга абысці ўвагай і яўрэяў, прыдаваўшых гораду асаблівы каларыт. Яўрэі стварылі тут адметную культуру. Мой калега, вядомы беларусіст са Злучаных Штатаў Курт Вулхайзер даваў мне аднойчы праслухаць касету з яўрэйскімі песнямі пачатку XX ст. пад назвай «габрэйскі рэнесанс». На ёй меліся песні, прысвечаныя Вільні. Вобраз Вільні адлюстраваны ў многіх помніках духоўнай культуры гэтага народа. Яны знайшлі тут другую радзіму. Яшчэ ў 20—30-я гады нашага стагоддзя яны складалі ў Вільні амаль палову насельнікаў. Як успамін пра былую веліч віленскіх яўрэяў засталася ў горадзе Яўрэйская вуліца і шэрыя, занядбаныя гмахі былога яўрэйскага квартала.

Усё глыбей і глыбей пранікаючы ў душу Вільні, нельга не прыйсці да ўсведамлення ролі і значэння яе для беларускага народа. Усе віленскія будынкі і палацы, замкі і храмы былі на працягу стагоддзяў маўклівымі і аб'ектыўнымі сведкамі драматычных, а часам і трагічных падзей у нашай гісторыі.

Няма на свеце другога горада, які адыграў бы такую важную і значную ролю для Літвы-Беларусі. Вільня з'яўлялася калыскай старабеларускай (XIV—XVII стст.) і новабеларускай (канец XIX — пачатак XX ст.) культур. З першай чвэрці XIV ст. і ажно да рэвалюцыі 17-га года яна была прызнаным цэнтрам нашага народа. У адносінах да Заходняй Беларусі Вільня выконвала гэтую функцыю да кастрычніка 1939 года. Надрукаваныя ў міжваенны час у Вільні падручнікі і кнігі выкарыстоўваліся і ў школах Савецкай Беларусі. З усіх куткоў Літвы-Беларусі ехалі сюды людзі з разнастайнымі мэтамі: і па адукацыю, і ў пошуках працы, і па г спадарчых справах.

Узнікшы на славяна-балцкім памежжы, горад успрыняў усе дасягненні суседніх усходнеславянскіх земляў. Ранняя Вільня шмат у чым нагадвала старажытныя Полацак, Смаленск, Наваградак, Пінск. Ды гэта і не дзіўна — з усіх куткоў нашай Бацькаўшчыны ехалі ў Вільню найслыннейшыя майстры і дойліды, простыя работнікі, каб зрабіць з цягам часу горад непаўторным і прыцягальным для Еўропы. А будаваць Вільню прыходзілася ў неверагодна цяжкіх умовах. Пра гэта сведчыць існаваўшая на працягу стагоддзяў абраза: «Каб цябе забралі ў Вільню горы капаць».

Прыбываўшыя ў Вільню з усіх куткоў Літвы-Беларусі ды з іншых краін Еўропы людзі належалі да розных канфесій. Але ў гэтым горадзе яны ўсе бралі ўрокі талерантнасці і верацярпімасці. Вільня, як, дарэчы, і ўся дзяржава, не ведала святой інквізіцыі, аўтадафэ, «варфаламееўскіх начэй». Храмы розных канфесій звычайна існавалі побач. Нават у самыя змрочныя часы Контррэфармацыі на Вострабрамскай вуліцы ўтульна месціліся адзін ля другога уніяцкі Свята-Троіцкі, каталіцкі Кармяліцкі кляштары і праваслаўны Свята-Духаў манастыр, на суседняй Завальнай вуліцы знаходзіліся побач яўрэйская сінагога і лютаранская кірха. Утульна адчувалі сябе ў Вільні і татары, якіх асабліва шмат жыло ў раёне Лукішкі. Татары, як і прадстаўнікі іншых веравызнанняў, мелі ў горадзе свае малітоўныя дамы і мячэці. Гэту унікальную для тагачаснай Еўропы з'яву можна матываваць агульнавядомай беларускай рысай добразычлівасці і верацярпімасці.

Вобраз Вільні быў надзвычай трывалы ў свядомасці Літвы-Беларусі. Гэта быў горад, які людзі ўзгадавалі з пачуццём павагі і хвалявання. Беларускі менталітэт немажліва ўявіць без Вільні. Вільня — сімвал Літвы-Беларусі, яе душа.

У многіх легендах, паданнях песнях наш народ уславіў Вільню. Яе апявалі ў сваіх творах Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч, У. Жылка, М. Танк, У. Караткевіч і інш. Віленскія сілуэты прыцягвалі мастакоў Я. Драздовіча і П. Сергіевіча, фотамайстра Я. Булгака.

50 гадоў гвалтоўнага і несправядлівага адлучэння ад Вільні не здолелі пазбавіць наш народ гістарычнай памяці. Жыхары прылягаючых да Вільні раёнаў і зараз карыстаюцца ў штодзённым ужытку гістарычнай назвай «Вільня», а не «Wilno» ці «Vilnius».

Сёння Вільня ізноў вяртаецца да нас. Горад з'яўляецца адным з цэнтраў сучаснага беларускага Адраджэння, у ім дзейнічаюць беларускія таварыствы і ўстановы, якія ставяць за мэту адраджэнне беларускасці не толькі на самой Віленшчыне, але і на ўсіх этнічна беларускіх абсягах.

Урад рэспублікі Беларусь, усе свядомыя беларусы павінны зрабіць усё магчымае ў справе падтрымкі беларускасці ў горадзе і краі. Бо калі беларускі дух згасне на Віленшчыне, то ад гэтай страты шмат згубіць і сама Вільня.

**Уладзімір КАНАНОВІЧ,**
**гісторык, аспірант Інстытута гісторыі АН Беларусі.**

---

**ТЭАТР**

# СТУДЫЯ ЧАКАЕ ХЛОПЧЫКАЎ

**Другі месяц працуе пры Беларускім тэатры юнага гледача дзіцячая тэатральная студыя. У ёй займаецца каля дваццаці школьнікаў, якія прайшлі перад тым даволі сур'ёзны конкурс. Кіруе студыяй юных аматараў сцэны мастацкі кіраўнік тэатра М. Абрамаў.**

**— Нашы студыйцы,— гаворыць Мадэст Мадэставіч,—знаёмяцца з асновамі сцэнічнага майстэрства, вучацца спевам, танцу, руху, займаюцца сцэнаграфіяй, бутафорыяй, ёсць група рэцэнзентаў. А галоўнае — яны далучаюцца да нацыянальнай культуры, да нацыянальнага мастацтва. Заняткі па роднай мове і літаратуры, па далёкай і блізкай гісторыі Беларусі, наведванні музеяў, выстаў будуць спрыяць іх агульнаму развіццю, абуджэнню пачуцця гонару за свой народ, сваю Бацькаўшчыну. Выкладанне ў студыі даручана найбольш прафесійным акцёрам. Акрамя таго, запрашаем спецыялістаў з іншых тэатраў, з інстытута культуры, навукова-даследчага інстытута педагогікі, пісьменнікаў, навукоўцаў. А мара наша такая — каб дзіцячая студыя не ператварылася ў тэатр пры тэатры, а стала жыватворнай крыніччай, ад якой пацягнуліся б ручаінкі ў школы, у сем'і. І гэта будзе нашым укладам у святую справу адраджэння нацыянальнае культуры Беларусі..**

**Заняткі ў студыі праводзяцца тры разы на тыдзень: па панядзелках і серадах — увечары, па нядзелях — удзень. Наведаўшы іх, мы пераканаліся, што гэта сапраўды цікава, сапраўды карысна. Адно здзівіла — сярод юных студыйцаў пераважаюць дзяўчынкі.**

**— Так,— згаджаецца артыст У. Макараў, які з'яўляецца нечым накшталт завуча студыі,— гэта наша бяда. Хлопчыкаў у нас малавата. А з аднымі дзяўчынкамі спектакль паставіць цяжка.**

**Дык прыходзьце, хлопчыкі! Не пашкадуеце. Студыя чакае вас.**

**А. ВОЛЬСКІ,**
**загадчык літаратурнай часткі тэатра.**

# ЯК САПСАВАЛІ СВЯТА

## Пасляслоўе да юбілею «ЛіМа»

Бачыць Бог, у нас і наўме не было пісаць якое-небудзь пасляслоўе да лімаўскага юбілею. З гэтае нагоды мы наогул не ўздымалі асаблівага «ляманту» — час не той. Але юбілей усё ж адзначылі. 28 лютага выпусцілі юбілейны — напаўсвяточны-напаўбудзённы — нумар штотыднёвіка, а ўвечары таго ж дня ў вялікай зале Дома літаратара адбыўся святочны лімаўскі вечар. Ён прайшоў, па шматлікіх водгуках, проста хораша: паўнюткая зала, узнёслы настрой, шчырыя, сардэчныя віншаванні і добрыя пажаданні, ну і, вядома ж, музыка, спевы.

У зале працавала і тэлебачанне — вяло запіс вечара. Думалася: мо калі-небудзь і тэлегледачы пачуюць з экранаў сваіх тэлевізараў добрыя словы ў адрас «ЛіМа», адчуюць святочны настрой залы, чысты і светлы дух паразумеласці, паяднанасці супрацоўнікаў штотыднёвіка і ягоных чытачоў, што хораша праявіўся ў той вечар.

Але бег час, а рэпартажу пра лімаўскае свята на экранах усё не было. Мы ўжо і надзею страцілі ўбачыць яго. Ажно раптам, 13 красавіка, праз паўтара месяца пасля падзеі, рэпартаж з'явіўся. З'явіўся нечакана, як Піліп з канапель, без абвестак, у тэлепраграме ён быў закадзіраваны, як: «Студыя «Мэта». Тэлечасопіс «Вобраз». Думай, чалавеча, што хочаш! Ну, ды дзякуючы падказцы мы паглядзелі той, мякка кажучы, «рэпартаж». Лепей было б не глядзець!

Мо і сапраўды на тэлебачанні не было магчымасці паказаць наш вечар цалкам (доўжыўся ён крыху больш за паўтары гадзіны), хоць і з гэтым цяжка пагадзіцца, ведаючы, чым запаўняецца экраны час беларускай тэлепраграмы. Але хай будзе рэпартаж, хай будзе, так сказаць, скарочаны варыянт, ды толькі... Што было галоўным на вечарыне, прысвечанай 60-годдзю «ЛіМа»? Вядома ж, выступленні запрошаных на ўрачыстасць гасцей, а не канцэрт, які быў усяго толькі яе акрасаю. А на экране? На экране ж асноўны час занялі канцэртныя нумары, а выступленні, у якіх гучала ацэнка «ЛіМа», яго здабыткаў і плёну за 60 гадоў працы, былі бязбожна і, што самае горшае, неахайна абкарнаны.

Знік пачатак вечара, цікавы і адметны, які задаў тон, стварыў атмасферу ўрачыстасці. Зніклі, можна сказаць, вядучыя вечара — народная артыстка Беларусі З. Бандарэнка і артыст філармоніі В. Ласоўскі, а менавіта яны паспрыялі таму, што свята прайшло ўдала, у тэмпе, без зрываў і накладак, быццам не адзін раз было адрэпеціравана. Мала што засталося ад глыбокага, прынцыповага, зусім не ялейна-юбілейнага выступлення народнага дэпутата Беларусі А. Трусава, выкінуты ці не самы важны і цікавы момант з выступлення міністра замежных спраў рэспублікі П. Краўчанкі, наогул апушчаны выступленні галоўнага рэдактара часопіса «Полымя» С. Законнікава і паэта і эсэіста Л. Дранько-Майсюка. А з уступным словам рэдактара «ЛіМа» абышліся проста здзекліва: бяздумна вырвалі некалькі сказаў з пачатку і з сярэдзіны і зляпілі іх разам, у выніку немагчыма было зразумець, што ўсё гэта азначае, пра што наогул ён гаварыў.

На старонках «Ліма» неаднойчы выказваліся думкі аб тым, што нашаму тэлебачанню найперш бракуе прафесіяналізму. Кіраўніцтва, супрацоўнікі тэлебачання аспрэчвалі гэта, крыўдавалі. Аднак жа... «Рэпартаж» з лімаўскага вечара красамоўна засведчыў, што закіды ў непрафесіяналізме былі, на жаль, слушныя. Мантажу — аніякага, як і ніякіх спроб змацаваць, вытлумачыць асобныя кавалкі-абрэзкі закадравым каментарыем. Ды што, зрэшты, гаварыць пра гэта, калі нават самы звычайны адбор матэрыялу аўтарам «рэпартажу» быў відочна не пад сілу: істотнае апушчана, а другараднае ці, прынамсі, менш важнае пакінута, выдзелена.

Адным словам, свята з нагоды 60-годдзя «ЛіМа» на экране паўстала сапсаваным, яго проста не стала (а яно, паўтараем, было!). Таму і вымушаны мы напісаць гэтае пасляслоўе, а заадно і надрукаваць ніжэй уступнае слова на юбілейнай лімаўскай вечарыне нашага галоўнага рэдактара (тое, што прагучала з ягоных вуснаў у «тэлерэпартажы», набрана іншым шрыфтам) — насуперак таму зману, у які былі ўведзены чытачы «ЛіМа» Беларускім тэлебачаннем.

ЛІМАЎЦЫ.

---

Добры вечар, дарагія, шаноўныя лімаўцы! Так, я не абмовіўся, назваўшы вас лімаўцамі! Раз вы адгукнуліся на наша запрашэнне і прыйшлі на лімайскую вечарыну,— значыць, вы лімаўцы. Дзякуй вам сардэчны за падтрымку і разуменне! І выбачайце, калі скажу, што не надта юбілейнае.

Роўна 60 гадоў назад пабачыў свет першы нумар «ЛіМа». 60 гадоў — узрост паважны, сур'ёзны, узрост сапраўднай, мудрай сталасці, і па добрай традыцыі нашага народа не прынята праходзіць міма такіх гадавін. Аднак жа час, абставіны ў нашай маладой дзяржаве і вакол яе такія, што аніяк не спрыяюць адзначэнню юбілеяў.

Семдзесят з гакам гадоў савецкага гаспадарання адкінулі нас на задворкі цывілізацыі. «Усюды па Русі бруд, смецце. І ў галовах смецце. І ўсе падмятаюць, але часцей заклікаюць падмятаць, а справа ж ні з месца. Хітрую, павучальную ленінска-сталінскую навуку мы прайшлі — крок наперад, два крокі назад, крок направа, крок налева і... ні з месца! Самапажыраннем гэта называецца!» Лепш за Вінтара Пятровіча Астафьева не скажаш. Ён, вядома, пра сваю любімую Русь-Расею. Але ж гэтая бяда на ўсіх нас адна. І ў нашай выклятай Богам старонцы шмат заклікаў падмятаць, а падмятаем мала, і паўсюль бруд і смецце. І найперш — смецце ў галовах. Горка і балюча! Ці не ў цэлым свеце — як у людзей, а ў нас быццам д'ябал пагаспадарыў, усё паперакульваў дагары нагамі, усё зблытаў і зблоціў!

Нядаўна ў Маскве гасцяваў французскі рэжысёр Жан Люк Гадар. У адным з ягоных інтэрв'ю мяне ўразілі такія словы: «Французская нацыянальная ідэя — гэта французская мова». А ў нас? А ў нас нацыянальная ідэя — кілбаса. Будзе кілбаса, дык з'есца і з чужым словам. У нас родная мова — апрыклая падчарка. Прыняты парламентам Закон аб мовах ці не паўсюдна ўпарта, ваяўніча, хоць пакуль і ціха, ігнаруецца, успрымаецца як нейкая забаўка гэтых недабітых ці, прынамсі, неразумных беларускіх нацыяналістаў.

Ды ўжо не толькі ціхае гэтае ігнараванне Закона аб дзяржаўнасці нашай мовы. Ужо і ў суд падаюць на яе, занядбаную, усімі пагарджаную! І хто? Самі ж даведзеныя да бяспамяцтва сыны і дочкі зямлі нашай, манкурты ўласнай, тутэйшай гадоўлі.

Самы негатыўны вынік сямідзесяцігадовага панавання бальшавізму — абыякавасць, лянота душы нашых людзей. Звычайна гады рабства выспельваюць у людскіх душах магутны і нязломны, бо выпакутаваны, парыў да волі, да творчасці, да годнага чалавечага жыцця. Нас жа рабства не збудзіла, не падняло. Не збудзіла, не ўзрушыла, не скаланула нас і наша нацыянальная трагедыя, што мае назву чарнобыльскай. Дык што ж скалане і згуртуе?

Нас вядзе ў бездань найперш нізкая нацыянальная свядомасць. Папраўдзе — адсутнасць яе. Адсюль і ўсе нашы беды. У тым ліку палітычныя, эканамічныя, сацыяльныя. Але ж ці можна іх пераадолець без нацыянальнай свядомасці? Ці ж незразумела, што нацыянальна несвядомы чалавек, — гэта значыць, негаспадар, — ніколі не зробіць нешта карыснае, тым больш на ўзроўні сучаснай тэхналогіі?

Здаровым грамадства робіць культура. На жаль, культура ў нас, як і раней, займае славутае надбудовачнае становішча, з'яўляецца нейкаю прыстаўкаю да нечага, у пераліку патрэб яна — на апошнім месцы. Як у нас адносіліся і адносяцца да культуры, гавораць адносіны да культурнага, інтэлігентнага чалавека. Адносіны гэтыя вельмі часта зняважлівыя, пагардлівыя. «Мы табе зараз пакажам тваю інтэлігентнасць!» Як паказвалі — мы ўсе, бадай, ведаем, гэта яшчэ на памяці многіх. Інтэлігентнасць — гэта найперш свабодалюбства і вальнадумства. А кіруючая партакратыя не цярпела ні того, ні другога. Цягам дзесяцігоддзяў дзяржавай у нас кіравалі «кухарчыны дзеці», прытым не лепшыя, розныя недавучкі і наогул невукі, цынічныя, двурушныя, зладзеяватыя, нахрапістыя і жорсткія. Нават у дачыненні да сваіх блізкіх.

У нас на Беларусі, пэўна ў адпаведнасці з лёсам, паводле якога нам не пашанцавала з начальствам, апошнія дзесяцігоддзі чамусьці надта ў пашане былі завочна абучаныя аграномы і заатэхнікі. Амаль на ўсіх кіруючых пасадах сядзелі гадаванцы сельгасакадэміі. Быццам заатэхнік ці аграном — самая прыдатная спецыяльнасць нават і для таго, каб кіраваць, скажам, асветай, культурай, вызначаць эканамічную і сацыяльную палітыку.

Найбольшых «поспехаў» за савецкія гады мы дасягнулі ў выхаванні «новага чалавека» — «хозяина необъятной родины своей». А вось навучыць чалавека з малых гадоў глядзець на сваю зямлю ўлюбёнымі вачыма — не ўмелі. А любоў жа да сваёй зямлі — гэта грунт, аснова, падмурак, без чаго няма чалавека. А няма чалавека — няма народа, няма нацыі. Ці ж можна шанаваць нейкія, скажам, агульначалавечыя каштоўнасці, калі няма любові да свайго, роднага, крэўнага, калі ў сэрцы няма пачуцця патрыятызму да малой радзімы, да Бацькаўшчыны?

У «ЛіМ» прыслаў сваю кніжку ўспамінаў былы рэдактар беластоцкай «Нівы» Георгі Валкавыцкі. Ён згадвае пачатак сваёй працы гэтак вось: «Наш паходны лозунг «Не саромецца беларускасці!» на Беласточчыне папахваў утапічнасцю. Мая маці, даведаўшыся, што я стаў беларускім рэдактарам, не падзяліла маёй радасці, засмуцілася і сказала: «На беларускай справе яшчэ ніхто добра не выйшаў». Беларусь у дачыненні да Беласточчыны, так сказаць, метраполія, аднак і ў нас лозунг «Не саромецца беларускасці!» таксама папахвае утапічнасцю, і мы, беларускія рэдактары, ад сваіх маці чулі і чуем тое ж самае: «На беларускай справе яшчэ ніхто добра не выйшаў».

Пра ўсе гэтыя балючыя праблемы «ЛіМ» гаворыць ужо немала часу. Бадай што ўсе 60 гадоў. Праўда, адным часам — ціха, прыглушана, другім — гучней, іншым — голасна і адкрыта. Пішучы пра родную літаратуру, культуру і мастацтва, занатоўваючы і аналізуючы падзеі і з'явы літаратурна-мастацкага жыцця Беларусі, «ЛіМ», здаецца, заўсёды вёў сваю лінію — спрыяў ачуньванню чытачоў ад хваробы, дыягназ якой — нацыянальны нігілізм, намагаўся закінуць зерне беларускасці ў сэрцы маладых і дапамагчы расплюшчыць вочы старэйшым. Настойліва вёў гэтую лінію і «ЛіМ» апошніх гадоў, гадоў так званай перабудовы, гадоў, якія паклалі пачатак сённяшняму этапу нашага нацыянальнага адраджэння. Хочацца думаць, што з гэтага кірунку мы не збочваем і сёння. Поруч з паказам і раскрыццём працэсаў, якія адбываюцца ў літаратуры і мастацтве, аналізам і ацэнкай здабыткаў пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў, дзеячаў тэатра і кіно, архітэктуры і дызайна, адным з галоўнейшых нашых клопатаў быў і застаецца клопат аб тым, каб спрыяць вяртанню нашай гістарычнай памяці, запаўненню белых плям у мінуўшчыне Бацькаўшчыны, абуджэнню пачуцця нацыянальнай годнасці, адраджэнню роднай мовы, аднаўленню беларускай школы, яднанню, кансалідацыі ўсіх свядомых, дэмакратычных сіл нашага народа дзеля пабудовы незалежнай і дэмакратычнай Беларусі.

Мы, вядома, разумеем, што не ўсё і не заўсёды рабілі так, як хацелася б. Часам мы самі не дацягвалі, часам жа нам перашкаджалі, тузалі нас, крычалі «Асадзі назад!» Тым не менш мы маем, здаецца, права сказаць сёння, што сёе-тое ўсё ж зрабілі. Пра гэта найперш сведчыць наша рэдакцыйная пошта, якая апошнім часам відочна пабагацела. Мы рады, што да «ЛіМа» пагарнулася не толькі творчая, але і навуковая, тэхнічная інтэлігенцыя, што чытаюць «ЛіМ» і пішуць у «ЛіМ» настаўнікі, рабочыя, студэнты, вайскоўцы — найперш афіцэры, — як кажуць, людзі самага рознага веку і занятку.

Само сабою, мы былі б рады, калі б кола нашых чытачоў пашырылася яшчэ больш, ды, ведаючы сённяшнюю сітуацыю ў рэспубліцы, не цешым сябе ілюзіямі. Галоўнае ж — чытацкія пісьмы для нас — як подых свежага паветра ў задуху, як глыток сцюдзёнай вады ў спёку, як найлепшыя лекі і наймацнейшы зарад бадзёрасці.

Вось, калі ласка: «Дарагія лімаўцы, адкажэце мне на пытанні: што такое камуна? Хто яе сфантазіраваў? Дзеля якое мэты была яна таму фантазёру? Хто збудаваў у ёй сваё каралеўства? Якая сталася найбольшая каланіяльная краіна ў свеце? Хто вялікае, шырокае поле наша пусткаю зрабіў, здратаваў, патаптаў, сплюндрыў злева направа і справа налева, а што не дабіў, не дапаліў, дык бадыллю аддаў? Гэта не думка, не мазгаванне, проста — кроў душу залівае, так шкода вас, добрыя друкары, што многа працуеце, крывёю малюеце, Радзіму ратуеце! Вялікай дзякуй вам за вашу навуку, ласку і муку! Гэта пісана толькі для вас за чароўны «ЛіМ» у адказ. Жадаю шчасця і поспехаў у працы».

Так напісала нам простая, як мы раней казалі, не надта, па ўсім відаць, пісьменная жанчына са Скідзеля, якая падпісалася: Лажэчнік Алена А. Значыць, мы не марна ядзім свой не надта ўмаслены кус хлеба.

Але мы, так бы мовіць, не засмучаемся, калі атрымліваем і іншыя лісты. Такія, скажам: «Привет, так называемые белорусы. Недавно пробовал читать вашу газетенку, «ЛіМ» называется. А там какие-то бредовые идеи о свободе и независимости. Вы что, слабоумные? На что вы, быдло, надеетесь? Я вам советую забыть скорее все колхозное и способствовать быстрейшему переходу территории в состав Российской Федерации. Не для того Россия свою землю у Польши отвоевала, чтобы отдать ее недоразвитому племени. У меня все. Ваш колонизатор». Гэта напісаў нейкі В. В. Корзін з Наваполацка. Дальбог жа, міжволі ўспомніш колішняе, несмяротнае: «Калі мяне мой вораг ненавідзіць, дык, значыць, я сапраўдны камуніст!»

Вось так, дарагія спадары і спадарыні! Прыходзяць і такія лісты. Але паздароў, Божа, добрых людзей — першых лістоў у шмат, у сто разоў больш! І патугі розных Корзіных (а вы ведаеце, бадай, і некаторыя іншыя прозвішчы) — марныя, яны толькі дадаюць нам большага імпэту, сілы, упартасці і добрай злосці рабіць адвечную лімаўскую работу.

І, між іншым, чытацкія лісты, у тым ліку і такія, як згаданы ліст «каланізатара», яскрава сведчыць аб тым, што «ЛіМ» — з'ява, фактар не толькі культурна-нацыянальнага, але і палітычнага жыцця рэспублікі.

Так, час сёння — не юбілейны. Не надта юбілейны ён і для нас, лімаўцаў. «ЛіМ», дзякаваць Богу і Саўміну, выходзіць, і мы, ягоныя супрацоўнікі, яшчэ не ідзём з торбамі ў мінскія падзямеллі-пераходы прасіць міласціну, аднак жа і не раскашуем. І апартаменты нашы на Захаравадзевятнаццаць многія з вас ведаюць, і ганарар у нас зноў стаў здзекліва мізэрны, і многія з вас гэта таксама ведаюць (артыкул у «ЛіМе» зараз «цягне», так сказаць, усяго на кіло той жа варанай кілбасы), і пра зарплату нашу лепш не гаварыць, і аўтамашыны ў нас як не было, так і няма. Ды гэта я ўжо так кажу, па звычцы. Бо што казаць пра аўтамашыну, калі ў нас напрыканцы XX стагоддзя няма аніводнага звычайнага дыктафона. Заўтра — вясна, а там і лета «катит в глаза», а нам гэта — як набліжэнне гібелі Пампеі, бо дзе і як будзе набірацца і вярстацца «ЛіМ» — пакуль што, пэўна, і Богу невядома...

Ды пакуль жывеш — песціш надзею. Як пісаў Рыгор Барадулін у сваёй апошняй паэме: «Пакуль за душой цікуе бяда, душа жывая...» Паміраць збірайся, а жыта сей. Мы і не падаем духам, сеем. І вось сабраліся сюды і вас запрасілі на 60-годдзе лімаўскай сяўбы і, пэўна ж, жніва таксама.

60 гадоў як для гісторыі — час невялікі, імгненне, не больш. А для чалавека? Для чалавека — цэлае жыццё. А для грамадства? Для грамадства таксама ладнаваты прамежак часу, які ўбірае ў сябе жыцці некалькіх пакаленняў, мноства вялікіх і малых падзей, з'яў і фактаў. Лімаўскія 60 гадоў прыпалі на асабліва бурны, віхурны час. У гэтым часе — крывавы тэрор 37-га і наступных гадоў, мужная і смяртэльная барацьба народаў з фашызмам, голад і галеча босых і голых на пасляваенных вогнішчах-папялішчах, мілітарызацыя краіны і засілле ваенна-прамысловага комплексу, здрадлівы вясновы подых 56-га года, асваенне цаліны, вялікія будоўлі камунізму, кукурузная эпапея, абложная меліярацыя і хімізацыя, суцэльная хлуснізацыя і фальшывізацыя нашага жыцця і ягоных каштоўнасцей, абрабаванне, вынішчэнне і выміранне вёскі, атручанне і запусценне зямлі-карміцелькі, паўсюдны гаспадарчы развал і нядбальства. А ў нас, на Беларусі, да ўсяго гэтага дадаліся яшчэ мэтнакіраваная русіфікацыя, дэнацыяналізацыя ўсіх сфер жыцця, фактычная ліквідацыя беларускай школы, выцясненне роднай мовы толькі ў побытавы, сямейны ўжытак, духоўнае ўмярцвенне народа, у выніку чаго сёння мы аказаліся мала падрыхтаванымі і да незалежнасці, і да дэмакратыі.

Праз усё гэта прайшла — разам з народам — творчая інтэлігенцыя. Яна, зведваючы ўсе патрасенні, рэпрэсіі, агітацыйна-прапагандысцкія кампаніі, валюнтарысцкія віхлянні і перабудовы, уціск ідэалагічных пастаноў і загадаў, царска-мецэнацкія асуджэнні і прысуджэнні, ганьбаванні і ўслаўленні, тым не менш працавала, тварыла і стварала. І поруч з ёй усе гэтыя гады ішоў «ЛіМ», дзе памагаючы, а дзе, сам таго не хочучы, і замінаючы; пеставаў маладую творчую змену і «отраду старцам» падаваў, адных улешчваў, другім даваў прачуханца (згадаем і такую расшыфроўку нашай абрэвіятуры, як «лесть и месть»); гадаваў пісьменніцкія кадры (лімаўскую школу прайшлі многія і многія літаратары, сёння ці не трэць нашага Саюза — былыя лімаўцы); а галоўнае — нястомна вёў свой лімаўскі часапіс, занатоўваючы па меры сваіх сіл і магчымасцей на гэтым шляху і добрае, і благое. І ўжо з тае прычыны, што «ЛіМ» — адзіная (да самага апошняга часу) газета па пытаннях літаратуры, культуры і мастацтва, роля яе неадменная. Сёння мы можам, бадай, сказаць, што лімаўскія старонкі за 60 гадоў — ці не самае поўнае выданне энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі — не ў крыўду будзе сказана гэта нашым энцыклапедыстам-броўкаўцам.

Пра сёе-тое з лімаўскага часапісу за 60 гадоў мы паспрабавалі сказаць у сённяшнім юбілейным нумары, пра сёе-тое мо скажуць яшчэ на гэтай вечарыне іншыя.

Дзякуй за ўвагу! І — з лімаўскім юбілеем вас!

---

## НАШ КАЛЯНДАР

110 гадоў з дня нараджэння народнага казачніка Івана МАКЕЯ (памёр 7 ліпеня 1955 года). У 1946 годзе ўдзельнікі фальклорнай экспедыцыі універсітэта запісалі ад яго 30 казак. Адна з лепшых чарадзейных казак «Кіёчак» апублікавана ў зборніку «Чарадзейныя казкі» (1973) і ў перакладзе на нямецкую мову ў кнізе «Беларускія народныя казкі» (Берлін, неаднаразова перавыдавалася).

●

105 гадоў з дня нараджэння сатырыка і гумарыста Анатоля ДЗЯРКАЧА споўнілася 18 красавіка (памёр 5 верасня 1937 года). Выйшлі зборнікі «Пра папоў, пра дзякоў, пра сялян-мужыкоў» (1925), «Усім патроху» (1930), паэма «Міколава гаспадарка» (1927) і іншыя кнігі.

●

100 гадоў з дня нараджэння польскага пісьменніка Богдана ЖЫРАНІКА (памёр 11 студзеня 1984 года) споўнілася 11 красавіка. Аўтар кнігі «Нарыс беларускай літаратуры» (1924). Складальнік зборнікаў паэзіі Я. Купалы «Дзень звычайны, убогі» (1962), М. Танка «На шляху дзікіх гусей» (1965), для якіх пераклаў большасць твораў. Перакладаў таксама творы Ф. Багушэвіча, Я. Коласа, Цёткі, М. Багдановіча і іншых аўтараў.

●

100 гадоў з дня нараджэння гісторыка, этнографа, публіцыста Міхаіла МЯЛЕШКІ (год смерці невядомы). У «Нашай Ніве» выступаў пад псеўданімам Міхалка Скарэўскі з публіцыстычнымі артыкуламі. Аўтар верша «Разгані па небе», апавяданняў.

●

100 гадоў з дня нараджэння бібліятэказнаўцы і бібліёграфа Іосіфа СІМАНОЎСКАГА спаўняецца 24 красавіка (памёр 8 кастрычніка 1967 года). У 1922—1937 і 1944—1961 — дырэктар Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна. На беларускую мову пераклаў творы Г. Гейнэ, А. Мицкевіча, аўтар прац па тэорыі і методыцы бібліятэказнаўства.

●

90 гадоў з дня заснавання ў Пецярбурзе культурна - асветнай арганізацыі «Круг беларускай народнай прасветы і культуры» («Круг беларускі»). Існавала ў 1902—1904 гадах. Выдала друкарскім спосабам «Вязынку» Я. Лучыны (1903) і «Казкі» (1904). На гектографе — зборнікі «Калядная пісанка» і «Велікодная пісанка» (1904). Адзіны нумар нелегальнай газеты «Свабода» ў 1902 годзе быў аддрукаваны ў Лідскім павеце, але з-за небяспекі яго самі выдаўцы знішчылі.

●

75 гадоў з дня выхаду першага нумара сельскагаспадарчага часопіса дэмакратычнага кірунку (выходзіў на беларускай мове да снежня 1913 года, спачатку ў Вільні, пасля ў Мінску). Выданне было аднаўлена ў красавіку-маі 1920 года ў Мінску, з сакавіка 1927 года да жніўня 1931-га зноў выходзіў у Вільні. Усяго пабачыла свет 70 нумароў.

●

75 гадоў з дня заснавання Першага беларускага таварыства драмы і камедыі (існавала ў красавіку 1917—сярэдзіне 1920 года ў Мінску). Створана Ф. Ждановічам пры ўдзеле І. Буйніцкага і У. Фальскага.

ЛІТКУР'ЕР

## Жывуць на свеце тры браты...

Выступае народны пісьменнік Беларусі Янка Брыль.

Гэты здымак Ул. Крука паяўляецца ў «ЛіМе» са спазненнем (не па нашай віне), але, як кажуць, лепш позна, чым ніколі. А згадаць пра вечарыну ў Доме літаратара, у час якой гэты здымак быў зроблены, проста неабходна: была яна неардынарная і называлася «Браты Ермаловічы».

Прыхільнікам Адраджэння, канечне, у першую чаргу добра вядомы Мікола Ермаловіч, аўтар знакамітай кнігі «Старажытная Беларусь». Аматары ж самадзейнасці згадваюць Валянціна Ермаловіча, які не адзін год кіруе Краснапольскім народным тэатрам. Ну, а трэці Ермаловіч — Лявон настаўнічае ў Дзяржынску.

Браты (на здымку яны злева) і сталі «віноўнікамі» гэтага незвычайнага вечара. Гаварылі выступоўцы і пра іх (В. Зуёнак, Я. Брыль, В. Іпатава, Г. Каханоўскі, І. Чыгрынаў), але «гаварылі» на вечары і іхнія справы. У прыватнасці, была паказана сцэнічная кампазіцыя па творах М. Гарэцкага «Стогн душы» ў пастаноўцы В. Ермаловіча і ў выкананні краснапольскіх артыстаў. Драматург А. Петрашкевіч перадаў самадзейным тэатралам сваю новую п'есу «Дагарэла свечка да палічкі».

## Другі век Алеся Гаруна

Уступным словам У. Казберука пачаўся ў Доме літаратара вечар памяці Алеся Гаруна, прысвечаны 105-годдзю з дня яго нараджэння. Пра аднаго з выдатнейшых беларускіх паэтаў, публіцыстаў пачатку дваццатага стагоддзя гаварылі М. Мушынскі, В. Рагойша, Ю. Гарбінскі. Артысты народнага тэатра чытальнікаў «Жывое слова» Мінскага педінстытута выканалі асобныя творы А. Гаруна.

## Гісторыю нельга забываць...

Гэтая думка лейтматывам праходзіла ў час прэм'еры ў Доме літаратара кнігі А. Сульянава «Арыштаваць у Крамлі!». Уражаннямі аб творы падзяліліся С. Законнікаў, М. Чаргінец, У. Някляеў, Л. Караічаў, І. Васілеўскі, вядучы вечара А. Жалязоўскі.

А. Сульянаў расказаў аб тым, як збіраў матэрыялы, звязаныя з лёсам Берыі, паведаў нямала цікавых эпізодаў з жыцця былых кіраўнікоў дзяржавы, падзякаваў рэдактару І. Мятліцкай за працу над рукапісам, адказаў на шматлікія пытанні.

Урыўкі з кнігі прачыталі народная артыстка Беларусі М. Захарэвіч, дыктар радыё Т. Лонская і акцёр ТЮГа А. Жук.

## У госці да школьнікаў

Прэм'ера кнігі Валянціна Лукшы «Як Ліса вучылася лётаць» адбылася ў Дулебскай школе-інтэрнаце Бярэзінскага раёна. Школьнікі і наўстаўнікі мелі магчымасць сустрэцца з аўтарам, а таксама з Міхасём Зарэмбам і Уладзімірам Карызнам. Дзеці атрымалі ў дарунак ад выдавецтва «Юнацтва» бібліятэчку дзіцячай літаратуры. У адказ яны парадавалі гасцей чытаннем вершаў, дзяліліся ўражаннямі ад кнігі В. Лукшы.

## На выязным пасяджэнні

Адбылося сумеснае пасяджэнне секцыі паэзіі Саюза пісьменнікаў Беларусі і Брэсцкага абласнога аддзялення СП. Яно праходзіла ў Брэсце і было прысвечана абмеркаванню творчасці братоў Анатоля і Васіля Дэбішаў, якія выдалі кнігу паэзіі ў «Бібліятэцы часопіса «Маладосць».

Цёплае пісьмо прыслала Н. Мацяш. Грунтоўна і заклапочана гаварыў аб вершах братоў Дэбішаў У. Калеснік. У абмеркаванні прынялі ўдзел намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў А. Пісьмянкоў, сакратар абласнога аддзялення А. Каско, намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Маладосць» К. Камейша, М. Пракаповіч, П. Шруб, А. Камароўскі, З. Дудзюк, В. Сахарчук.

Браты Дэбішы аднагалосна рэкамендаваны для разгляду на прыёмнай камісіі адносна прыёму ў творчы саюз.

Адбылася сустрэча мінскіх і берасцейскіх паэтаў са студэнтамі мясцовага педінстытута.

А. С.

## Пытайцеся, хлопчыкі...

І дзяўчаткі—таксама. Пытайцеся, і на самыя розныя вашы пытанні, што тычацца самых розных падзей, жыцця і дзейнасці знакамітых людзей Бацькаўшчыны, знойдзеце адказы ў кнізе «Ці ведаеце вы помнікі гісторыі і культуры Беларусі?», выпушчанай выдавецтвам «Народная асвета». Аўтары яе А. Дылейка і В. Жаўнерчык адказы зашыфравалі ў галаваломках, красвордах і чайнвордах.

## Дыпломы — лепшым...

Праведзены XXXII рэспубліканскі конкурс «Мастацтва кнігі—92», на які было прадстаўлена 50 выданняў, што пабачылі свет у дзевяці выдавецтвах Рэспублікі Беларусь (за выключэннем «Вышэйшай школы»), а таксама ў творча-вытворчым цэнтры «Паліфакт» і выдавецка - паліграфічнай кампаніі «Эрыдан».

Вышэйшая ўзнагарода конкурсу — дыплом імя Францішка Скарыны — не прысуджалася. Дыпломаў першай і трэцяй ступені прысуджана 8, дыпломаў другой — чатырнаццаць...

Дыпломы першай ступені атрымалі каляндар «Беларускія абразы» (выдавецтва «Беларусь»); бібліятэка «Скарбы сусветнай літаратуры» — Лонг «Дафніс і Хлоя», Апулей «Метамарфозы, ці Залаты асёл» («Мастацкая літаратура»), кнігі выдавецтва «Юнацтва» «Зай, які лічыў варон» В. Гардзея, «Хітрэй свету не будзеш», «Беларускія небыліцы», «Сказ пра Робін Гуда» Д. Фенімара і энцыклапедычны даведнік «Культура харчавання», выпушчаны выдавецтвам «Беларуская энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі.

## Упершыню ў беларускай паэзіі

Кніжка гэтая — адметная. Па-першае, яна выпушчана не дзяржаўным выдавецтвам, а Беларускім філіялам творчага аб'яднання Савецкага фонду міласэрнасці і здароўя. Па-другое, афармлена яна паэтам Хведарам Жычкам (дарэчы, ён і рэдактар яе). А па-трэцяе, яе склаў вянок вянкоў санетаў. Спытаеце, што гэта за кніга? «Апакалипсіс душы» Змітрака Марозава. Так, гэта ён стварыў першы ў беларускай паэзіі вянок вянкоў санетаў. Калісьці гэта марыў ажыццявіць Анатоль Сербантовіч (светлай памяці майстра і прысвячае свой твор З. Марозаў), але заўчасна пайшоў з жыцця.

Для тых, хто слаба разбіраецца ў паэтычных жанрах... Вянок санетаў складаецца з пятнаццаці санетаў. Апошні радок першага з іх з'яўляецца першым радком наступнага, апошні радок другога — першым трэцяга і г. д. Пятнаццаты санет, інакш магістраль атрымліваецца з першых радкоў папярэдніх санетаў. У вянку ж вянкоў — чатырнаццаць вянкоў санетаў, а апошні пятнаццаты вянок узнікае з іх магістраляў.

Пра што вянок санетаў З. Марозава? Каб адказаць на гэтае пытанне, лепш за ўсё прачытаць кнігу.

А. М.

## Два фільмы — два народныя...

У Доме літаратара прайшла прэм'ера дакументальных фільмаў «Праўдай адзінай» і «Рыцар і слуга Беларусі», якія распавядаюць пра нашых народных пісьменнікаў Васіля Быкава і Уладзіміра Караткевіча. Але, У. Караткевіч — таксама народны, хоць гэтага ганаровага звання пры жыцці і не займеў.

Развагамі аб творчай працы перад гледачамі падзяліліся аўтар сцэнарыя стужкі пра В. Быкава, рэжысёр В. Кавалёў, кансультант В. Кавалейка, аўтар сцэнарыя фільма «Рыцар і слуга Беларусі» А. Верабей.

На вечары выступілі В. Быкаў, сястра У. Караткевіча Н. Кучкоўская, В. Юбко і іншыя.

МУЗЫКА

## «Рамантычная песня» ў оперным

«Рамантычная песня XIX стагоддзя» — цыкл канцэртаў пад такой назвай падрыхтавала заслужаная артыстка рэспублікі канцэртмайстар Ларыса Максімава разам з вядучымі спевакамі рэспублікі. Паказ адной з такіх праграм адбыўся ў фае ДАВТа Беларусі ў рамках Клуба сяброў оперы. Цёпла прынялі слухачы заслужаных артыстаў Ніну Казлову, якая выканала 8 песень Р. Шумана з цыкла «Каханне і жыццё жанчыны», ды Міхаіла Жылюка — ён праспяваў на нямецкай мове фрагменты з вакальнага цыкла Г. Малера «Песні вандроўнага падмайстра».

П. ГАРДЗІЕНКА.

## Узняцца над будзённасцю

Канцэрт, прысвечаны творчасці вялікага рускага музыканта С. Рахманінава, прайшоў у Барысаўскай музычнай школе. Старэйшы педагог, музыказнаўца Е. Каган, якая рыхтавала гэты вечар (і зрабіла паведамленне пра творчасць кампазітара, піяніста, дырыжора С. Рахманінава), прапанавала выступіць на ім у якасці выканаўцаў выкладчыкам школы ды ўдзельнікам вакальнай студыі завода БАТЭ. Гэта было вельмі адказна, бо непаўторная музыка Рахманінава досыць цяжкая для выканаўцаў. Удзельнічалі ў праграме педагогі Н. Гуцул ды А. Якубенка («Баркарола» з сюіты для 2-х фартэпіяна), І. Уладзімірава (Прэлюдыя до-дзіез мінор), Т. Конарава (Эцюд-карціна соль мінор, «Італьянская полька»). Уразілі публіку рамансы ў выкананні ўдзельніцы вакальнай студыі завода БАТЭ Л. Серпітоўскай ды «Вакаліз», які праспявала кіраўніца гэтай студыі Н. Лістратава. Шчыра захапляюся нашымі жанчынамі-выканаўцамі, якія ў такі нялёгкі час, «непрыдатны» для музыкі, здолелі ўзняцца над будзённасцю, выканаць прафесійна складаныя творы. Удзельнікі канцэрта далі слухачам эстэтычную асалоду і нагадалі, што ў свеце ёсць непазбыўныя каштоўнасці, сярод якіх — і музыка С. Рахманінава.

М. ПІШЧАНКА.
г. Барысаў.

## «Ліда-92»

Зала Лідскага музычнага вучылішча была паўнюткая: тут адбываўся рэспубліканскі конкурс юных піяністаў «Ліда-92». 28 музыкантаў (не старэй за 16 гадоў) з музычных школ буйнейшых гарадоў Беларусі спаборнічалі за званні лаўрэатаў. Найбольш прадстаўнічая дэлегацыя была з Мінска (7 удзельнікаў). У журы конкурсу ўвайшлі вядомыя піяністы-педагогі: А. Мільто, А. Сцепанцоў, А. Крымер, Л. Чарняк. Праграма конкурсу ўключала выкананне поліфанічнага твора, класічнай санаты (адна частка), эцюда, твора лірычнага характару і п'есы беларускага кампазітара.

1 месца заняла пяцікласніца Святлана Лагачова з Полацка (пед. Н. Голубева). Яе выступленне было яркім, эмацыянальным, артыстычным, тэхнічна свабодным. Журы было аднадушным у прысуджэнні першага месца. Другое месца падзялілі Ганна Шыбаева з Музычнага ліцэя пры БДК і Яўген Чысцякоў з Салігорска. Трэцяе месца падзялілі Ілона Караваева з Мазыра, Віталь Фамін з Гомеля і Элеанора Зуброўская з Гродна. Яшчэ шасцёра атрымалі дыпломы за паспяховае выступленне на конкурсе. Публіка вельмі цёпла прымала ўсіх піяністаў, а на заключным канцэрце зала доўга не адпускала Святлану Лагачову, прымушаючы іграць яшчэ і яшчэ.

Конкурс юных піяністаў паказаў, што на Беларусі ёсць таленавітыя дзеці, ды, на жаль, прафесійная падрыхтоўка навучэнцаў не заўсёды адпавядае іх здольнасцям. Пасля конкурсу адбылася метадычная гутарка з педагогамі музычных школ рэспублікі.

Т. ВАЛАДЗЬКО,
старшы выкладчык БДК, старшыня журы.

ТЭАТР

## З прычыны засведчання любові

Знакамітыя купалаўскія капуснікі, прыпыніўшыся на некаторы час, можа, і вернуцца ў тутэйшы культурны абыходак... Шкада, што не пісалася іхняя гісторыя, — тым цікавей занатаваць, мовім так, іх працяг: вечарыну 14 красавіка ўшанавання Мікалая Пінігіна, рэжысёра Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, рэжысёра ці не самага «неакадэмічнага» і, як высвятляецца, ці не самага папулярнага ў гледачоў ды калег.

Вечарына-капуснік у Доме мастацтваў сталася своеасаблівым сюрпрызам улюбёнцу артыстаў, М. Пінігін быў прыемна здзіўлены маленькай пародыяй на свае спектаклі, калі вітанне распачаў квартэт Дамы, Пана, Папа ды Урадніка з Купалавых «Тутэйшых», а Усходні ды Заходні вучоны сварыліся-спрачаліся за прыналежнасць ягонага мастацтва да дзяржаў і плыняў... Вобразы са спектакляў «Жыццё Карыцына», «Дракон», «Курыца» парадзіравалі З. Белахвосцік, А. Гарцуеў, А. Сідарава, І. Дзянісаў, В. Манаеў, Ю. Авяр'янаў, В. Паўлюць, В. Радзько; з нумарам мастацкага свісту брала чынны ўдзел Стафанія Міхайлаўна Станюта, нагадаўшы публіцы зорную часіну спектакля «Гаральд і Мод». У. Кур'ян з музыкантамі тэатра спрыяў вытанчанай нязмушанасці кожнай сцэнічнай праявы: напрыканцы капусніка маэстра бардаўскага пяння У. Бобрыкаў змусіў узяць у рукі гітару і свайго сябрука-рэжысёра. Зала радасна ўзялася падпяваць...

Дык вось, знакамітыя купалаўскія капуснікі, перапыніўшыся на пэўны час, мо і «цвёрда сталі на грунт» вяртання, — з прычыны ўшанавання ды засведчання любові...

Ж. Л.

ВЫСТАВЫ

## Пасля Рыгі — на Беларусь

4 красавіка ў Вайсковым музеі Латвіі (Рыга, вул. Смілшу, 20) адкрылася выстава жывапісных і графічных твораў Вячкі Целеша. Ён нарадзіўся 25 верасня 1938 г. у пасёлку Краснасельскі на Гродзеншчыне, з 1968 г. стала жыве ў Рызе, выпускнік Акадэміі мастацтваў Латвіі (1975 г.).

Імя Вячкі Целеша ў нашай рэспубліцы ведаюць даўно. Ён быў удзельнікам выстаў, прысвечаных юбілеям М. Гусоўскага, Ф. Скарыны, М. Багдановіча... В. Целеш першы старшыня Рыжскага клуба філакартыстаў (1979 г.), даследуе гісторыю беларускіх паштовых картак, аўтар экслібрысаў У. Караткевічу, А. Мальдзісу, Зосьцы Верас і многім іншым.

Зараз у Рызе экспануюцца карціны, прысвечаныя Я. Райнісу і Я. Купалу, П. Масальскаму, многа нацюрмортаў, беларускіх і латвійскіх пейзажаў... А калі ўсё будзе добра, то гэтая выстава (заканчваецца 4 траўня) потым пераедзе ў Менск.

Застаецца нагадаць, што ў Латвіі В. Целешу арганізаваць персанальную выставу дапамаглі: Дзяржаўнае спецыялізаванае прадпрыемства «СУІС» (спонсар), Аб'яднанне мастакоў-беларусаў Балтыі «Маю гонар», Латвійскае таварыства беларускай культуры «Світанак», Вайсковы музей Латвіі.

С. ПАПАР.

НОВЫЯ ВЫДАННІ

## Ёсць «АиФ», ёсць і «АіВ»

Беларускі навукова-даследчы інстытут адукацыі стаў заснавальнікам штомесячнага навукова-тэарэтычнага і інфармацыйна - метадычнага часопіса «Адукацыя і выхаванне», першы нумар якога прыйшоў нарэшце да чытача. Адразу мусім засведчыць — з новых выданняў, якія з'явіліся апошнім часам на Беларусі, гэта адно з самых гжэчных. Часопіс фарматам нагадвае невялікую кнігу, у ім ёсць каляровыя ўклейкі.

Аб накірунках «АіВа» можна даведацца з рэдакцыйнага анонса на чацвёртай старонцы вокладкі, а ў пэўнай ступені і з артыкула дырэктара Беларускага НДІ адукацыі, кандыдата педагагічных навук У. Пархоменкі «Педагагічная навука і практыка: новыя магчымасці ўзаемадзеяння». Часопіс — «дзіця» згаданага інстытута, і першы нумар сведчыць, што ён жыве яго праблемамі, пытаннямі нацыянальнай адукацыі ў рэспубліцы.

З першага нумара пачынаюцца заняткі ў завочнай школе «Гучы, беларуская мова». Іх будзе дванаццаць, вядзе іх В. Раманцэвіч, вопытны педагог, загадчыца кабінета беларускай мовы і літаратуры ў Мінскім гарадскім інстытуце ўдасканалення настаўнікаў.

Распачаў часопіс і курс «Сусветнай мастацкай культуры». Б. Крэпак у першым знаёміць з габеленам.

Загадчык кафедры вывучэння моў і літаратуры Мінскага гарадскога ІУН Г. Нікалаенка ў артыкуле «Ніколі не позна» дзеліцца сваімі развагамі, парадамі аб вывучэнні беларускай мовы ў дарослай аўдыторыі.

Пра вопыт беларусізацыі навучальна-выхаваўчага працэсу і навуковай дзейнасці расказвае ў артыкуле «Alma mater Адраджэння» дырэктар па навучальнай рабоце Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы, прафесар, кандыдат філасофскіх навук С. Габрусевіч.

Змястоўны «Каляндар педагога» на студзень і люты (складальнік У. Кісялёў); багаты бібліяграфічны матэрыял, разнастайная інфармацыя.

Слова ў дарогу «АіВу» кажуць Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. Шушкевіч, народны паэт Беларусі, старшыня Камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры і захаванні гістарычнай спадчыны Н. Гілевіч, намеснік Старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь М. Дзямчук, намеснік міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь Г. Бутрым, паэт, старшыня Беларускага фонду Рэрыхаў А. Разанаў.

Часопіс задуманы на дзвюх мовах — рускай (чамусьці яна стаіць першай) і беларускай, анатацыі публікацый — на англійскай.

## Каб сонца заглянула...

«Загляне сонца і ў наша аконца...» — гэтыя словы ўзяты своеасаблівым эпіграфам да літаратурна-мастацкага і публіцыстычнага часопіса «Анно». Заснавальнікам яго з'яўляецца Беларускае таварыства інвалідаў.

У першым нумары, пазначаным лютым (часопіс выдаецца на беларускай і рускай мовах, выходзіць адзін раз у квартал) — інтэрв'ю са старшынёй праўлення Беларускага таварыства інвалідаў М. Калбаскам «Добрай дарогі», вершы Л. Рашкоўскага, С. Міхайлоўскага, Н. Кавалёвай, Л. Свяцкага і іншых, апавяданні У. Цмыга, У. Шыціка, І. Капыловіча...

ІНТЭРВ'Ю Ў НУМАР

# А пакуль пацыент-безабаронны...

**Што было б, калі б не Юрый Марахоўскі, уявіць няцяжка... Менавіта ён, эрудзіраваны ўдумлівы практык, дзякуючы сваёй дасведчанасці вызначыў лекавы прэпарат, здатны вывесці з крызісу здароўе нашага знанага музыканта, артыста В. Скорабагатава. Назва дэфіцытнага лякарства пачала, як эстафета, перадавацца дзеячамі культуры, журналістамі, сябрамі БНФ, актывістамі фонду «Дзецям Чарнобыля», прадстаўнікамі царквы, замежнымі гасцямі. Першай адгукнулася з Заходняй Германіі, дзе працуе па кантракце, оперная «зорка» М. Гулегіна: партыю купленых ёю лекаў прывезла ў Мінск маці Марыі — Наталля Фёдараўна. Гэта выратавала жыццё хвораму. Але не вырашыла ўсёй праблемы, бо лекаў трэба многа — як інсуліну для дыябетыка... І вось ужо атрымана новая порцыя заходнегерманскіх медыкаментаў для Скорабагатава, у чым дапамог старшыня ВС спадар С. Шушкевіч. Следам партыю лекаў дасла ў а. Надсан. А днямі прыйшла пасылка ад Г. Бураўкіна.**

**Стан здароўя артыста паляпшаецца. Імя яго цудоўнага доктара ўпершыню з'явілася ў «ЛіМе» ў сувязі са зваротам аб медыкаментознай дапамозе хвораму. Сёння Ю. Марахоўскі, доктар медыцынскіх навук, кіраўнік рэспубліканскага гастраэнтэралагічнага цэнтра, прэзідэнт Беларускай гастраэнтэралагічнай асацыяцыі імя Ф. Скарыны, — наш субяседнік.**

**— Гастраэнтэралогія — тэма, здавалася б, не для друку. Але давайце, Юрый Харытонавіч, паспрабуем зацікавіць чытача праблемамі гэтай досыць шырокай галіны. Тым больш, вы — прадстаўнік не дзяржаўных, а, так бы мовіць, альтэрнатыўных структур аховы здароўя. «Цэнтр», «асацыяцыя» — што гэта і дзеля чаго?**

— Мы працуем у якасці цэнтра з 1978 г. Справа ладзілася выключна на энтузіязме работнікаў 1-ай мінскай клінічнай бальніцы, дзе існуе старэйшае на Беларусі гастраэнтэралагічнае аддзяленне, на энтузіязме супрацоўнікаў кафедры, якая распрацоўвала праблемы гастраэнтэралогіі. Наш цэнтр, які з гадамі прычыніўся да найбольш цяжкіх форм паталогіі, не меў фінансавай падтрымкі. (Зрэшты, гэта сітуацыя тыповая для аховы здароўя ў рэспубліцы). Узнікла пытанне наконт адэкватнага абследавання цяжка хворых і адпаведнага іх лекавання. А без фінансавай падтрымкі вырашыць такое пытанне немагчыма. Да таго ж, не было ў нашай сістэме арганізацыі, якая прадстаўляла б інтарэсы групы дактароў, што займаюцца праблемамі гастраэнтэралогіі, і інтарэсы пацыентаў гэтай групы. І год таму мы прыйшлі да высновы: трэба нешта мяняць.

Найбольш аптымальным нам падалося стварыць пры рэспубліканскім гастрацэнтры малое прадпрыемства, якое выражала б інтарэсы цэнтра як юрыдычная асоба. Стварылі. Ды аказалася, што гэта не самая аптымальная форма. Бо сёння ў асобе дзяржавы мы маем манапаліста ў ахове здароўя. З аднаго боку, як кожнаму манапалісту, ёй невыгодна існаванне недзяржаўных форм, а з другога боку, ёсць праблема, вельмі складаная, — кантроль якасці медыцынскай дапамогі. Калі ствараецца малое прадпрыемства, дык хто будзе гарантам якасці гэтай дапамогі? Атрымліваецца — ніхто, дзяржава тут ні пры чым, адказнасць ляжыць толькі на плячах ды сумленні супрацоўнікаў малога прадпрыемства, што значна ўскладняе яго функцыянаванне. І ў такой сітуацыі мы вырашылі далучыць у якасці арганізацыі для кантролю ўстановы дзяржаўныя: Міністэрства аховы здароўя, адпаведны аддзел гарвыканкома. Так што сёння са сваім прадпрыемствам «Гастрасана» мы не з'яўляемся чыста камерцыйнай недзяржаўнай структурай, бо ўвялі ў якасці заснавальніка дзяржаўныя структуры, на якія можам спадзявацца ў плане кантролю. Хаця і самі маем сумленне, і клятву Гіпакрата давалі, і стараемся працаваць добра...

**— ...І наколькі я ведаю, накладак у вас не было.**

— А тым не менш, жыццё такое, што ўсяляк можа здарыцца, не па нашай віне можа быць нейкі зрыў, і хто патлумачыць сітуацыю пацыенту? Мы ж будзем выглядаць зацікаўленай асобай. Разам з тым нам падалося мэтазгодным мець і арганізацыю, незалежную ад дзяржавы, якая па-свойму ажыццяўляла б кантроль якасці дапамогі і садзейнічала пашырэнню чыста інфармацыйных кантактаў. Гэта праблема прафесійная: мы не маем дастаткова інфармацыі сёння, і адсутнасць яе вядзе да таго, што асноўная маса медустаноў лечыць старымі метадамі, не ведаючы пра тое, што робіцца на Захадзе. Дык вось, сярод заходніх структур тыповай з'яўляецца асацыяцыя. Асацыяцыя спецыялістаў ды пэўных пацыентаў. Палічылі, што і нам будзе вельмі карысна стварэнне такой асацыяцыі. І чатыры месяцы назад мы ўтварылі Беларускую гастраэнтэралагічную асацыяцыю імя Францыска Скарыны.

**— Само найменне адразу прыцягвае ўвагу.**

— А чаму такое найменне? Не проста «асацыяцыя гастраэнтэролагаў», а «гастраэнтэралагічная», — гэта дае магчымасць ствараць структуры па абароне інтарэсаў пацыентаў. Будзем пакуль называць гэта клубам: скажам, клуб для згуртавання пацыентаў з хваробамі кішэчніка. Гэта дасць магчымасць пацыентам мець інфармацыю, якая будзе да нас паступаць, па лячэнні канкрэтных захворванняў, па сучасных медыкаментах. Інфармаваны пацыент, нават звярнуўшыся ў дзяржаўную медыцынскую ўстанову, зможа папытаць: «А што ж вы робіце са мной? Я ведаю, што ёсць вось такое лячэнне, а вы мне прапануеце зусім не тое». Павысіўшы такім чынам дасведчанасць хворых, мы «справакуем» сітуацыю, калі і дактарам непазбежна давядзецца або павышаць сваю, або пакінуць месца працы. У гэтым я бачу абарону інтарэсаў пацыентаў, і ў гэтым жа — найпершую задачу асацыяцыі.

Апроч таго, свае клубы могуць мець і дактары-гастраэнтэролагі, і ўсе спецыялісты, што дачыняюцца да нашай сферы: эндаскапісты, ультрагукавікі і г. д. Асацыяцыя дае нам магчымасць ладзіць кантакты з замежнымі калегамі, з аналагічнымі структурамі, якія ёсць у кожнай заходняй краіне. Ужо маем афіцыйную прапанову ад Еўрапейскай гастраэнтэралагічнай асацыяцыі — уключыцца ў яе работу, асабіста мне прапанавана ўступіць у гэтую асацыяцыю. І калі мы будзем мець такіх членаў-спецыялістаў не менш як 10, дык Беларуская асацыяцыя зможа зрабіцца паўнапраўным членам Еўрапейскай асацыяцыі гастраэнтэролагаў. Гэта дасць магчымасць актыўнага ўдзелу нашых членаў у канферэнцыях, што праводзяцца за мяжой, не толькі для спецыялістаў, а і для пацыентаў з мэтай павышэння іх ведаў і навучання метадам самастойнага лячэння — скажам, асваення ін'екцый.

Чаму мы ўзялі імя Францыска Скарыны? Далёка не ўсе ведаюць, што ён быў лекарам. Мала таго, ён быў прыдворным лекарам Багемскага каралеўства пэўны час, і ў мяне ёсць пісьмы, што пацвярджаюць гэтую сітуацыю, ад ягонага нашчадка, Стэнлі Скарыны, які жыве ў Канадзе. Мы мелі з ім і працяглую гутарку, і перапісваемся цяпер. І ён у сваіх паперах знайшоў нават знак таго, што Ф. Скарына займаўся пытаннямі гастраэнтэралогіі, г. зн. хваробамі страўнікава-кішэчнага тракту, досыць грунтоўна. Вось і прычына з'яўлення ягонага імя ў назве асацыяцыі.

**— Юрый Харытонавіч, ваша абноўленае ведамства можа, відаць, разлічваць на нейкія інвестыцыі?**

— Так. Бо вопыт паказвае, што калі працаваць добра, сумленна, дык прыбытак на медыцынскіх паслугах сёння практычна немагчыма атрымаць. Асацыяцыя ж будзе, прынамсі, атрымліваць прыбытак ад продажу сваёй чыста навуковай прадукцыі, скажам так. Ужо ёсць цікавасць да нашай навуковай прадукцыі і да прапаноў аб супрацоўніцтве з боку заходнегерманскіх калег. Ну, і спадзяюся, што ў кагосьці з буйных беларускіх фірм мо ўзнікне жаданне фінансаваць развіццё гастраэнтэралогіі ў рэспубліцы. Дарэчы, сёння такое жаданне выказваюць аўстрыйскія бізнесмены...

Мы ж толькі пачынаем працаваць як асацыяцыя. Але ўжо набылі шэраг замежных кантактаў. Прынамсі, спецыяльныя табліцы, развешаныя ў нас на сценах, бясплатна даслала буйная заходнегерманская фармацэўтычная фірма «Фальк». Ёсць літаратура, атрыманая таксама бясплатна, якая каштуе дужа вялікія грошы. Гэта ўжо добра, бо вызначае наш прафесійны ўзровень. Дамовіліся з замежнымі партнёрамі наконт нашага права перакладаць часткова і ксераскапіраваць літаратуру, рассылаць членам Беларускай асацыяцыі. Тым больш, што мы бачым яе задачу і ў яднанні намаганняў усіх, хто працуе ў розных напрамках гастраэнтэралогіі. Каб у будучым праводзіць конкурсы на лепшыя распрацоўкі і потым уводзіць іх у практыку ўсіх медыцынскіх устаноў...

**— Юрый Харытонавіч, я чула, што ў ЗША ёсць своеасаблівая форма стасункаў медыцыны і пацыентаў: калі лячэнне аказалася неэфектыўным, дык хвораму выплачваецца пэўная сума...**

— Але ў Штатах гэта звязана з вельмі шырокай структурай страхавых арганізацый. Адзін з відаў страхоўкі прадугледжвае сітуацыю, пра якую вы гаворыце. Але ў нашых сённяшніх структурах займацца страхаваннем без наяўнасці закона аб страхавой медыцыне — немагчыма. Мы маглі б прапанаваць сістэму, кшталту заходняй, страхавання пры лячэнні некаторых захворванняў. Напрыклад, мы гаворым пацыенту: можаш рабіць страхавы ўзнос сёння, у цябе няма абвастрэння тваёй язвеннай хваробы, і мы гарантуем, што абвастрэння не будзе на працягу года, але калі яно ўзніконе, мы вернем суму твайго ўзносу. Стасункі з пацыентамі, праўда, паказваюць: наш чалавек не гатовы сёння да такой нязвыклай сітуацыі. Хіба толькі тыя, хто прайшоў «праз нашы рукі» і пераканаўся, што мы сапраўды аказваем высакаякасную дапамогу, пагадзіліся б укладаць у лячэнне і «страхавыя» грошы. Ды зноў жа: няма закона...

**— Значыць, няма і адпаведнага механізма ўзаемаадносін...**

— Няма і механізма прававой абароны інтарэсаў! Нам кажуць: «Гэта ж ваш прыбытак, мы з вас здымаем падатак». Мы не маем ніякіх ільгот на такі выпадак. Тым не менш зараз зацвярджаем «Палажэнне аб цэнтры», дзе падзялілі ўсю нашу дапамогу на 2 раздзелы: гарантаваныя медыцынскія паслугі, якія мы можам у кожны момант гарантаваць пацыенту, і дадатковыя, якія мы можам індывідуальна абмяркоўваць з з ім. Вось у дадатковых паслугах і напісана: «Страхаванне здароўя насельніцтва па прафілактыцы язвеннай хваробы». Але гэтая паслуга можа быць выкарыстана сёння абмежавана. Чаму? Таму што не маем патрэбных сучасных прэпаратаў.

**— Што называецца — ведаю як лячыць, ведаю, чым лячыць, толькі не ведаю, дзе гэта ўзяць?**

— Іменна! У рэчышчы вырашэння праблемы мы правялі ўласныя распрацоўкі з мэтай выпуску прэпаратаў для лячэння захворванняў страўніка, кішэчніка, дванаццаціперснай кішкі, жоўцевага пузыра. Аснова тут — лекавыя травы й натуральная сыравіна, бо займацца з «сінтэтыкай», хіміяй нам вельмі складана сёння. Ды наогул, пры цяперашнім узроўні сінтэтычных лекаў на Захадзе, лічу, для нас гэта напрамак бесперспектыўны. Перспектыўней сказаць заходнім калегам: вось, маўляў, мы можам арганізаваць у сябе фасовачны цэх, 80 працэнтаў будзем аддаваць вам, 10—20 пакідаць сабе. Калі яны згодныя на такія ўмовы, мы ім дамо рабочую сілу танную і будзем мець прэпараты. А што датычыць натуральнай раслённай сыравіны, можам прапанаваць свае распрацоўкі. Сёння ў нас ёсць тэхналагічная лінія, распрацаваная сумесна з талінскім прадпрыемствам «Дэзінтэгратар», — па вытворчасці дробнадысперсных парашкоў з лекавых траў.

**— Не сакрэт, дзе бераце сыравіну?**

— Закупляем у Прыбалтыцы, Расіі, на Украіне, у тых пунктах, дзе зёлкі найбольш чыстыя экалагічна. Перад закупкай робім кантроль: і радыяцыйны, і пэўны батанічны, і хімічны. Наяўнасць парашку, з аднаго боку, дае магчымасць павысіць уздзеянне актыўнага лекавага рэчыва, а з другога — рэшткі гэтага парашку ў арганізме валодаюць сарбцыйным эфектам. Г. зн. яны адсарбіруюць на сабе прадукты абмену і выводзяць іх з арганізма. У тым ліку і радыенукліды. У нас ужо ёсць вялікі доследны матэрыял, клінічныя апрабацыі. Ну, а маючы базісную тэхналогію, можам развіваць яе ў розных напрамках: прынамсі, з гэтага парашку можна рабіць таблеткі, дадаваць гэты парашок у адпаведную аснову і атрымліваць крэмы, мазі для медыцынскіх і нават для касметалагічных мэт.

А што датычыць «сінтэтыкі»... З прадстаўніком фірмы «Фальк», які наведаў нас, мы якраз гаварылі пра тое, што можам прадаставіць магчымасці (з нашым удзелам) пакетавання, таблетавання таго матэрыялу, які самі даставім з Заходняй Германіі. Маючы досыць танную рабочую сілу, мы будзем мець і досыць танныя прэпараты. Да прыкладу, салафальк, патрэбны для лячэння Скорабагатава, каштуе 200 марак упакоўка. Нашы эканамісты падлічылі: калі мы будзем прывозіць прэпарат з Германіі і тут фасаваць, рабіць з яго таблеткі, то ён, будзе каштаваць толькі 14 марак.

**— Розніца істотная...**

— Так, але зноў жа: мы не маем ніякай абароны, працуючы на вытворчасць, мы вымушаныя бараніцца ад падаткаў. Быццам бы для дзяржавы працуем, для здароўя жыхароў рэспублікі, забяспечваючы іх медыцынскай дапамогай, але ж з нас гэтаксама, як з кожнай камерцыйнай структуры, здымаюць «лішняе». Гэта нейкі парадокс! Я разумею, можна пакінуць падаткі на біржы, на рэстараны, на крамы, але што датычыць медыцыны... Ёсць пастанова Саўміна па забеспячэнні лекавымі прэпаратамі, у якой сказана: «Прасіць Вярхоўны Савет разгледзець пытанне аб зніжэнні падаткаў...» Ды пакуль нічога не вырашана. А на Беларусі ж катастрофа з лекавым забеспячэннем! А ў гастраэнтэралогіі ёсць шэраг захворванняў, якія без забеспячэння прэпаратамі дадуць усплеск абвастрэнняў і прывядуць да павышанай інвалідзнасці ды смяротнасці. Паспрабуй у эндакрынналогіі адмяніць прэпарат для хворых на цукровы дыябет! Аналагічныя сітуацыі ёсць і ў нашай сферы.

**— Падаткі падаткамі, а церпіць безабаронны пацыент.**

— Нашым пацыентам мы стараемся аплачваць кошт лячэння, скарыстоўваючы для гэтага прыбыткі ад дзейнасці малога прадпрыемства. Скажам, амбулаторнае лячэнне хранічнага гепатыту, якое мы праводзім, сёння каштуе 5 тысяч рублёў. Ну дзе звычайны чалавек іх возьме? Мы аплачваем, хоць, зноў жа, не абаронены ніякімі законамі. У падаткавай інспекцыі нам кажуць: «Мы палічылі — у вас ёсць прыбытак, з гэтага падатак мы і здымаем». Мы кажам: «Які ж тое прыбытак, мы яго патраціл на лячэнне пацыентаў». А нам: «Ну дык што, гэта ваша ўнутраная справа, мы не ведаем, як вы што робіце». Нікога не хвалюе, ці мы патраціл прыбытак на лячэнне хворых ці паклалі сабе ў кішэню. Атрымліваецца, што лепей было б пакласці ў кішэню, усё было б спакайней і «па закону».

Далей. Мы вымушаны купляць дыягнастычныя прыборы, на што трацім таксама свой прыбытак. Без іх, вядома, немагчыма працаваць. А сучасныя прыборы на рублі каштуюць 1—3 мільёны. Цяжка. Нам кажуць: маўляў, купіш прыбор, будзеш рабіць абследаванне, дык на ім займееш прыбытак. Нашы разлікі паказваюць, што ніякага прыбытку не будзе. Прыбор сябе апраўдвае праз 1,5 года, але ж тады гэта ўжо не той прыбор, які мы купілі, ён маральна старэе. На Захадзе лічыцца: калі медыцынскае абсталяванне папрацавала 2 гады, яго трэба мяняць! А мы карыстаемся прыборамі, якім па 40—50 год.

**— Нават у такіх умовах вы стараецеся абараніць інтарэсы пацыентаў?**

— Амбулаторная дапамога, якую мы аказваем, падзелена ў нас на 2 раздзелы: першы — кансультацыйная дапамога спецыялістаў, яна праводзіцца бясплатна, г. зн. кожны можа атрымаць такую кансультацыю. І мы ўжо сёння захлынаемся ад патоку пацыентаў.

**— Колькі ў вас працуе дактароў?**

— Трое. За дзень кансультуем каля 20 чалавек, ужо на верасень распісаны ўсе кансультацыі, а людзі ўсё ідуць... А другая частка дапамогі — гэта лячэнне ўжо выяўленага дыягназу. Пракансультаваўшы пацыента, мы прапануем: калі хочаце, можам аказаць вам такія-то паслугі па лячэнні, але гэтыя паслугі — платныя. І калі чалавек не ў стане аплаціць, дык мы можам напісаць адпаведнае пісьмо на месца ягонай працы. Калі і яго прафсаюзная арганізацыя не зможа

аплаціць, просім даведку аб заработнай плаце і сямейным становішчы. І калі сума даходу пацыента, у выніку падлікаў, акажацца мінімальнай, мы гэтае лячэнне аплачваем самі, для хворага ўсё бясплатна. Апроч таго, 10 працэнтаў нашых пацыентаў атрымліваюць бясплатнае лячэнне і дыягностыку, бо знаходзяцца ў 1-й клінічнай бальніцы, а ў адным з яе карпусоў нам прадастаўлены рабочыя памяшканні. Сёння мы лазерную тэрапію, напрыклад, у 50 працэнтах выпадкаў праводзім бясплатна, яшчэ 40 працэнтаў абслугоўваем па дагаворах з прадпрыемствамі, якія пералічваюць грошы на абследаванне і лячэнне сваіх работнікаў. Толькі 10 працэнтаў такой паслугі застаюцца платнымі — гэта для тых пацыентаў, якія сапраўды могуць аплаціць кошт лячэння. А такія людзі, вы ведаеце, таксама ў нас ёсць.

**— А праблема медыкаментаў?**

— Стараемся, па-першае, карыстацца ўласнымі лекавымі зборамі з траў. Па-другое, хворы, якому мы аплачваем лячэнне, атрымаўшы ад нас грошы, ідзе ў аптэку. І калі там прэпарату няма, а сёння гэта тыповая сітуацыя, пішам гарантыйнае пісьмо ў арганізацыю, дзе гэты прэпарат ёсць (на тэрыторыі былога Саюза), і за пэўную плату ў рэшце рэшт атрымліваем. Я лічу, у будучым пры нашым цэнтры трэба рабіць аптэчны кіёск ці аптэку, дзе частка прэпаратаў выдавалася б па льготным тарыфе ці нават бясплатна. Перавага тут будзе аддавацца пацыентам — членам гастраэнтэралагічнай асацыяцыі. Такі своеасаблівы варыянт страхавання: чалавек робіць свой уступны ўзнос, плаціць членскія ўзносы — гэта фактычна і ёсць ягоная страхоўка, і ён атрымлівае права на льготнае забеспячэнне медыкаментамі.

**— Юрый Харытонавіч, вы маеце сем аўтарскіх пасведчанняў аб навуковых распрацоўках, вынаходніцтвах. Раскажыце, калі ласка, крыху пра гэта.**

— Так, ёсць распрацоўкі, прынамсі, па дыягностыцы захворванняў жоўцевага пузыра і жоўцевакаменнай хваробы, па некаторых спецыфічных аналізах... Ёсць распрацоўкі па лячэнні язвеннай хваробы з дапамогай апрацоўкі язвеннага дэфекту парашкамі з траў. Праз максімум 7 працэдур можам мець зажыўленне язвы. На стадыі афармлення — распрацоўка па сарбіраванні радыенуклідаў з дапамогай лекавых кампанентаў на аснове тых самых парашкоў. Праведзены буйныя даследаванні жоўцевых камянёў пад электроннай мікраскапіяй, што дае магчымасць адкрыць пэўныя новыя заканамернасці ў фармаванні такіх камянёў. Гэта і была тэма маёй доктарскай дысертацыі. Зірніце на фатаграфіі: як месяцавы пейзаж выглядае, аказваецца, жоўцевы камень пад электронным мікраскопам! Ёсць найцікавыя структуры. Вось — бурбалкі, своеасаблівае «таксі» для размаітых кампанентаў, якое «перавозіць» штось з крыві ў жоўць, у кішэчнік. Тут можна «адабраць», адсарбіраваць сёе-тое з непажаданых кампанентаў.

**— Тыя ж радыенукліды?**

— Так. І гэта вельмі актуальна. Аналіз, які мы правялі на амаль 7 тыс. пацыентаў, паказвае рост шэрагу захворванняў страўнікава-кішэчнага тракту. За апошнія 3 гады павелічэнне захворванняў на неспецыфічны язвенны каліт маем удвая, у 1,5 раза жоўцевакаменнай хваробы і ў 6 — паліпозу жоўцевага пузыра. Гэта хваробы з неспрыяльным увогуле прагнозам, калі імі не займацца, не праводзіць прафілактыку абвастрэнняў. І цяпер мы ставім пытанне наконт таго, каб атрымліваць нейкае фінансаванне пад навукова-практычныя распрацоўкі, якія ў нас ужо ёсць, з тым, каб больш глыбока вывучыць сітуацыю і вырашыць, што трэба рабіць для прадухілення развіцця заўважаных працэсаў.

**— Вы звязваеце гэтыя працэсы з Чарнобылем?**

— Гэта наша гіпотэза, звязаць напрасткі з чарнобыльскімі наступствамі пакуль немагчыма. Ёсць проста факты. Але калі іх прааналізаваць глыбей, дык пэўную сувязь з Чарнобылем знайсці можна. Напрыклад, такая ж, як у нас, частата паліпозу жоўцевага пузыра характэрная для Нагасакі й Хірасімы — тых раёнаў, дзе, як вядома, былі праведзены фактычна выпрабаванні ядзернай зброі (такое ж выпрабаванне было праведзена і на Беларусі). У іншых краінах мне невядома такая частата паліпозу. Змены ў працэсах абмену рэчываў на радыяцыю — доўгі, пралангаваны, і мы ўжо заўважаем змены ў жоўці, характэрныя для падобных сітуацый. Гэта дае нам падставу выказаць гіпотэзу, што пэўная група захворванняў сапраўды мае сувязь з Чарнобылем, ва ўсякім разе, з радыеактыўным заражэннем. Нашы дадзеныя, прынамсі, тое, што рост жоўцевакаменнай хваробы звязаны на Беларусі з пэўнымі мясцовасцямі, — пацвярджае і прафесар Ганчарык, які працуе ў Інстытуце радыяцыйнай медыцыны.

А яшчэ ў нас ёсць методыка, якая дапамагае вызначыць узрост каменя па хімічных элементах, якія ў ім змяшчаюцца. Мы заўважаем таксама ў камянях інкарпараванне пэўных радыеактыўных рэшткаў. Пра што гэта гаворыць? Што пячонка — гэта орган, які прыняў на сябе радыяцыйны ўдар і з часам сфарміраваў камень, структуру, у якую ў выглядзе рэшткавай колькасці назапашваліся тыя кампаненты. Але для больш глыбокіх даследаў патрабуецца інвеставанне...

**— Значыць, трэба біць ва ўсе званы, каб звярнуць увагу на вашу галіну?**

— Яно-то так. Але сёння ў дзяржаўнай праграме ўжо ёсць вельмі багата клопатаў, я так сказаў бы. Ёсць клопаты па анкагематалогіі. Ёсць клопаты па анкалогіі шчытападобнай залозы. Па эндакрыннай паталогіі. Гэта ўсё галіны, у якіх ёсць непасрэдныя пацвярджэнні наступстваў катастрофы ў Чарнобылі. І туды, канечне, скіравана асноўнае дзяржаўнае інвеставанне. І мне гэта зразумела, так і мае быць. А з другога боку, як спецыяліст я не магу пагадзіцца, што не трэба звяртаць увагу на тыя трывожныя факты, што ёсць сёння ў гастраэнтэралогіі, галіне, якая не мае спецыяльных інвеставанняў у сувязі з чарнобыльскімі праблемамі. Захворванні страўнікава-кішэчнага тракту не могуць быць асобна, а Чарнобыль — асобна! Першасны кантакт арганізму з радыенуклідамі адбываецца менавіта праз страўнік. Мяркую, што з часам будзе відавочны далейшы рост кішэчных захворванняў, рост паталогіі падстраўнікавай залозы, пячонкі. Дарэчы, сёння на Беларусі паталогія пячонкі мае выключныя асаблівасці: хваробы развіваюцца малапрыкметна, бессімптомна, мы выяўляем іх па ўскосных прыкметах. Гэта натуральна, бо імунная сістэма адказала на чарнобыльскі ўдар сваімі зменамі, а імунітэт мае істотнае значэнне для развіцця хранічных хвароб пячонкі.

**— Ваша стаўленне да нетрадыцыйных метадаў лячэння, усё больш папулярных у цяперашняй сітуацыі?**

— Я думаю, тое, што эмпірычна назапасіў народ, мае пад сабой рацыянальную аснову, і адкідаць гэта «з парога» не варта. Трэба проста выбраць, ачысціць зерне ад смецця, і самае каштоўнае скарыстаць на патрэбы медыцыны. Але ёсць такі аспект: сёння кожны мае права абвясціць сябе лекарам народным. І вось гэта проста страшна. Справа не ў дыпломе — ёсць ён ці няма. А ў тым, што калі, як я казаў, няма кантролю якасці ў малым прадпрыемстве, дык у такіх саматужных лекараў і падобных арганізацый пра кантроль якасці і гаворкі няма. Гэта самая «безадказная» галіна. Праўда, у Беларусі створана асацыяцыя нетрадыцыйных метадаў лячэння — мо яна штосьці і зможа зрабіць дзеля кантролю якасці дапамогі, якую аказваюць народныя лекары.

Што датычыць навук, якія на Захадзе называюцца парамедыцынскімі навукамі, — астралогія, гамеапатыя і да т. п. У іх ёсць шэраг рацыянальных момантаў, што ўвогуле мы скарыстоўваем у сваёй дзейнасці. Але я за тое, каб не было перагібу. Вопыт краін развітых, скажам, ЗША, дзе мне давялося быць на стажыроўцы, паказвае: чым ніжэй узровень развіцця афіцыйнай медыцыны, тым больш ўспленск парамедыцынскай дапамогі, імкнення да акультных рэчаў, і наадварот. У нас жа адсутнасць веры ў афіцыйную медыцыну і адсутнасць развіцця гэтай медыцыны вядзе да таго, што чалавек імкнецца па дапамогу да нейкай бабкі ці дзядка. Я бачыў многа пацыентаў ужо, у якіх «выганялі» жоўцевыя камяні. Як? Экстрасэнсіўным уздзеяннем або скарыстаннем нейкіх зёлак. Я абследаваў іх пасля. Камяні — на месцы. Гэта не тое захворванне, пры якім ратавацца можна экстрасэнсіўным спосабам. Кажуць, маўляў, чалавеку ад гэтага зрабілася лепш. А чаму? Таму, што ў яго «знялі» болевы сіндром, напрыклад. Хвароба ж як была, так і засталася, толькі як бы «спусцілася» ўглыб.

Так што і ў галіне парамедыцынскай дапамогі павінен быць кантроль. Хай народны лекар працуе, але трэба яго замацоўваць за нейкай медустановай, дзе б ён вёў прыём у кабінеце, а пацыенты рэгістраваліся і далей ажыццяўляўся б кантроль сучаснымі метадамі дыягностыкі. А то атрымліваецца: мы самі сабе, а вы самі сабе, мы да вас ніякага дачынення не маем, а вы да нас ніякага дачынення **не майце!** А што гаротнаму пацыенту рабіць? Куды яму пайсці? Што выбраць?

**— Дык ці набудзе беларуская медыцына сваё цывілізаванае аблічча?**

— Я спадзяюся... Калі мы — маю на ўвазе спецыялістаў — з'яднаем свае намаганні, а не будзе кожны рваць сабе грошы, каб зацыраваць дзіркі. Калі мы з'яднаем намаганні ў пэўных прыярытэтных напрамках, дык, думаю, што будзе не толькі свой «твар», а і ўсё іншае, і «цела» таксама будзе ў нашай беларускай медыцыны. Але цяпер кожны як бы сам сабе. Наша Міністэрства аховы здароўя і ўрад я нават не магу вінаваціць у нечым, бо вельмі цяжка вырашыць сёння пытанне — каму аддаць перавагу, калі кожны спецыяліст просіць фінансаваць ягоную справу як самую важную і кожны звязвае яе з чарнобыльскай сітуацыяй. Патрэбна агульнае абмеркаванне такіх пытанняў. Дасюль у рэспубліцы не былі сабраны ўсе спецыялісты, што працуюць у розных галінах медыцыны, дзеля таго, каб абмяняцца меркаваннямі, уражаннямі пра, скажам так, «паслячарнобыльскія» захворванні. Склікаць такі семінар ці сімпозіум, пэўна ж, цяжка, але без аб'яднання намаганняў і ведаў, без абмену інфармацыяй працаваць далей немагчыма! Толькі разам можна знайсці адказ на спрадвечнае пытанне інтэлігенцыі: «Што рабіць?»

**— Юрый Харытонавіч, дзякую вам за грунтоўную гутарку.**

**С. БЕРАСЦЕНЬ.**

# СВЯТЫЯ АЙЦЫ І ГРЭШНЫЯ КАМУНІСТЫ

(Пачатак на стар. 5).

у вялебнага айца загарэліся вочы на чарговы аб'ект культуры — на Музей беларускага народнага мастацтва, які знаходзіцца ў Раўбіцкім касцёле. І будзьце пэўныя, Музей выселяць. Кс. Завальнюк і камуністычныя ўлады як-небудзь дамовяцца.

Размяшчэнне ў цэрквах і касцёлах музеяў, архіваў ды іншых устаноў культуры ратавала гэтыя будынкі ад разбурэння ці то ад ператварэння іх у розныя склады, майстэрні і г. д. Асаблівая ж заслуга дзеячаў культуры ў тым, што яны выратавалі ад знішчэння вялікую колькасць помнікаў мастацтва — абразоў, скульптур і г. д. Я не ведаю ніводнага праваслаўнага ці рыма-каталіцкага святара, які б ездзіў па Беларусі ды збіраў у падвалах ды на гарышчах занядбаныя іконы, іншыя каштоўнасці. Затое я ведаю, як услаўлялі «свабоду сумлення» ў СССР дзеячы РПЦ.

І вось настала эпоха дэмакратызацыі, якая супала з тысячагоддзем хрышчэння Русі. Царкве пачалі вяртаць святыні. І Царква перш за ўсё звярнула ўвагу на тое, што лепш захавалася. У Віцебску РПЦ пажадала сабе касцёл былога Трынітарскага кляштара, ператвораны пры цары ў Пакроўскую царкву. Гэты будынак ацалеў дзякуючы не праваслаўнай абшчыне, не духавенству, а дзякуючы энтузіястам, «нефармалам», беларускім патрыётам, якія меліся стварыць у ім Цэнтр беларускай культуры. У праваслаўнага духавенства быў выбар, але яно захацела менавіта Пакроўскую царкву. У Заслаўі таксама быў выбар, але, прыдумаўшы легенду аб Рагнедзе, РПЦ забрала Спаскую Царкву, дзе размяшчаўся Музей рамёстваў і народных промыслаў. Зараз вочы праваслаўных іерархаў загарэліся на чарговую ўстанову культуры — Музей рэлігіі ў Гародні, які месціцца ў былым уніяцкім кляштары. Не трэба казаць, колькі гэтая ўстанова зрабіла для падтрымання беларускага жыцця ў горадзе... Але самая запаветная мара дзеячаў РПЦ — забраць Сафійскі сабор у Полацку, сабор, які ў сучасным выглядзе ўзвялі уніяты. І хоць уніяцкія абшчыны, дзеячы навукі, асветы, культуры і мастацтва Гародні, Полацка і Менска выказваюцца за захаванне цяперашняга статуса базыльянскага манастыра ды Сафійкі, баюся, што спадары Арцыменя ды Кулакоў дасягнуць дамовы з праваслаўнымі епіскапамі Гарадзенскім, Полацкім і Віцебскім. Заяўлены прэтэнзіі РПЦ на Дом работнікаў мастацтва. Былыя камуністы гатовыя дзеля палітычнага саюза супраць беларускага патрыятычнага і дэмакратычнага руху абняцца са сваімі ўчарашнімі праціўнікамі.

Усе ведаюць пра супярэчнасці паміж Праваслаўем і Рыма-Каталіцкаю Царквою, але што датычыць Беларусі й беларускае культуры, то й адна й другая Цэрквы, як мы бачылі на прыкладах, спаборнічаюць у тым, хто больш забярэ ўстаноў культуры. Русіфікатарская сутнасць РПЦ на Беларусі не памянялася. Паланізатарская сутнасць Рыма-Каталіцкай Царквы на Беларусі не памянялася. Ведаю колькі праваслаўных святароў - патрыётаў, ведаю ксяндзоў, якія служаць у беларускай мове, але не яны вызначаюць палітыку. Палітыку вызначаюць Масква і Варшава, а таксама тыя польскія святары, якія заселі ў кангрэгацыях і камісіях Ватыкана. Вы заўважылі, як дружна абедзве Цэрквы паўсталі супраць уніятаў? Адны хочуць знішчыць уніяцкі рух, другія — падпарадкаваць яго сабе. І зноў мы бачым, як нашы чыноўнікі — былыя грэшныя камуністы — гатовыя дагадзіць святым айцам: то не рэгіструюць уніяцкія суполкі, то не даюць ім памяшканняў...

Дзеячы БНФ крытыкуюць урад Беларусі за нізкапаклонства перад Масквою. Але ці заўважылі вы новае нізкапаклонства — перад Варшаваю? Асабіста я не зразумеў, чаму для Беларусі Гданьск лепшы порт, чым Рыга ці Клайпеда. А тут яшчэ спадарыня Альжбета Смулэк, генеральны консул Польшчы, выступаючы ў адной аўдыторыі, выказалася за адкрытую мяжу паміж нашымі дзяржавамі. Уяўляю нашэсце польскіх «камерсантаў»: адну такую навалу мы перажылі ў 80-х гадах. Дастаткова й таго, што ў Беларусі працуюць дзесяткі місіянераў і місіянерак. Яны не мелі працы ў Польшчы, а тут актыўна вядуць польскую агітацыю, выстаўляюць у касцёлах партрэты Валэнсы, вывешваюць польскія сцягі... І наш урад маўчыць як вады ў рот набраўшы. Мусіць, баіцца пакрыўдзіць Варшаву. А тым часам перад брамкаю польскага консульства ладзіцца экспазіцыя ў гонар Арміі Краёвай — тае самае, што знішчала ў час вайны пры дапамозе немцаў беларускіх актывістаў...

Ладзіць самастойны быт дзяржавы — гэта значыць ладзіць яе эканамічную ды культурную самастойнасць.

Нам не пашанцавала з заходнім і ўсходнім суседзямі. Польшча й Расія, без увагі, хто там кіруе—Пілсудскі ці Сталін, эндэкі ці хадэкі, камуністы ці манархісты. — ніколі не былі нашымі шчырымі сябрамі. Абедзве гэтыя краіны па меншай меры хацелі, хочуць мець Беларусь у зоне свайго ўплыву, хочуць бачыць яе прахадным калідорам. З заходнім і ўсходнім суседзямі трэба жыць мірна, але ці не шукаць нам саюзнікаў дзе-небудзь далей? Пакуль жа выдае на тое, што ўрад Беларусі не мае пэўнай знешнепалітычнай канцэпцыі. Думаю, што ва ўсякім разе неабходна пачаць перагаворы з Ватыканам і Патрыярхам Маскоўскім. Пара вызначыць цвёрды парадак дзейнасці Цэркваў у Беларусі, дамагчыся, каб гэтая дзейнасць не пярэчыла інтарэсам беларускай нацыі, мовы, культуры, беларускай дзяржаўнасці. Прыкладам, мне вельмі цікава, чаму навучаюць у духоўных семінарыях, як падбіраюць кантынгент вучняў. Царква аддзелена ад дзяржавы? Так. Але ва ўсіх цывілізаваных дзяржавах навучальныя ўстановы працуюць на карысць дзяржавы, на карысць нацыянальнай, а не замежнай культуры.

Адносіны «дзяржава—царква» ў новых умовах патрабуюць карэкціроўкі. Урад Беларусі, калі ён сапраўды беларускі ўрад, павінен быў даўно заняцца гэтымі праблемамі.

**Анатоль СІДАРЭВІЧ.**

ЛІСТ З КАМЕНТАРЫЕМ

# АДРОДЗІМСЯ ЦІ НЕ?

Усё часцей задаю сабе гэтае пытанне і ўсё часцей чую яго ад сваіх сяброў. Нас, жывучых далёка ад родных мясцін, станоўчае вырашэнне яго хвалюе нікольки не менш, чым усіх тых, хто знаходзіцца зараз у межах Беларусі і спрыяе яе Адраджэнню. Сустракаюся са сваімі землякамі, якія жывуць у Эстоніі, размаўляю з імі на вуліцах, на нашых сходах і бачу, што ўсё больш у іх настроі з'яўляецца мінорных нот, усё больш недаверу да таго, што робіцца наўкол, усё больш расчаравання ў надзеях, якімі зусім нядаўна мы жылі. Што ж адбылося з гэтымі людзьмі? І што адбываецца з імі зараз? Чаму ў іх усё менш і менш ахвоты браць удзел у справе Адраджэння? Адказ вельмі просты: людзі ўбачылі, што іх падманулі, што іх павялі за сабою магутным поклічам, а потым... кінулі. Я, як і мае сябры, таксама гэта адчуваю, згаджаюся з імі і падзяляю іх заклапочанасць той справай, якую мы пачалі вясною 1989 года.

...Тады, тры гады таму, усё здавалася значна прасцей. Вяртаючыся дамоў пасля сустрэчы ў Таліне з беларускімі пісьменнікамі і мастацкімі калектывамі, наша ініцыятыўная суполка вырашыла стварыць у горадзе беларускае культурнае згуртаванне. Як вельмі пераканаўчы факт мы ўспрымалі тады словы аб тым, што ў гэтай справе Радзіма будзе аказваць нам усебаковую дапамогу. 4 сакавіка 1989 года Беларускае культурнае згуртаванне ў Кохтла-Ярве было створана. Асаблівага вопыту ніхто з членаў нашага праўлення не меў, але справа пачала пакрыху рухацца — ад вяртання мовы да вывучэння гісторыі, літаратуры, культуры і мастацтва Бацькаўшчыны. Неўзабаве мы навучыліся праводзіць вечарыны, віктарыны, сустрэчы з цікавымі людзьмі. Праз год мы адчулі, што трывала стаім на нагах, і вырашылі запрасіць да сябе ў госці мастацкі калектыў «Юнацтва» з Баранавіч. Канцэрты нашых землякоў у гарадах Эстоніі прайшлі з вялізным поспехам. Мы ім зрабілі добрую сустрэчу, а затым наладзілі падарожжа ў Талін.

Згуртаванне вырашыла выйсці з «падполля» і афіцыйна зарэгістравалася. Нам вельмі не хапала сувязяў, не хапала знаёмстваў з аднадумцамі. На нашы артыкулы ў беларускім друку ніхто не адклікаўся, і таму мы з вялікай радасцю прынялі пастанову стаць адным з калектыўных членаў Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны. Для пошукаў тых жа сувязяў летам 1990 года я звярнуўся да эстонскага, расейскага і беларускага друку з прапановай велавандроўкі пад бел-чырвона-белым сцягам з Эстоніі ў Беларусь. Газеты «Молодежь Эстонии» і «Советский спорт» адгукнуліся адразу, брэсцкая «Заря» друкаваць мой артыкул не пажадала, а «Чырвоная змена» надрукавала яго толькі тады, калі наша вандроўка ўжо скончылася.

Ніякіх праблем з начлегам у Вільні ў мяне не было. Прапаноў было шмат, але я выбраў адну з іх і так апынуўся ў кватэры Валдаса Банайціса. Да гэтага часу я вельмі ўдзячны гэтаму чалавеку, які прытуліў мяне, накарміў, а раніцай правёў у далёкую дарогу.

Перад самым Менскам я пераапрануўся ў нацыянальнае адзенне, падрыхтаваўся да сустрэчы з цікавымі людзьмі і накіраваў свайго жалезнага каня ў горад. Адшукаўшы патрэбны адрас, пакінуў свой ровар на вуліцы, адчыніў дзверы, за якімі, як паведамляў надпіс, знаходзілася ТБМ імя Ф. Скарыны. Менавіта сюды слалі мы свае лісты і менавіта сюды ў пошуках сяброў я ехаў.

Чалавека, які сядзеў за сталом, жыццё беларусаў Эстоніі не цікавіла. Крыху парухаўшы сваімі вусікамі і глянуўшы на мяне, як на нейкае дзіва, ён параіў мне «пагуляць па вуліцах Мінска колькі гадзін». Я «пагуляў» і зноў прыйшоў, але, як высветлілася, дарма. Усім сваім выглядам гэты «дзяржаўны дзеяч» са значком «Вярхоўны Савет БССР» на лацкане даў мне зразумець, што я тут — лішні. Я не прымусіў сябе доўга чакаць і пакінуў спачатку памяшканне, а потым і Менск. Калі залазіў у спальны мех у лясочку пад Стоўбцамі, на душы было вельмі брыдка. Я зразумеў, што і ў справу Адраджэння трапілі розныя людзі, і можа здарыцца так, што тое, што адбылося са мной, — толькі кветачкі...

Адродзімся ці не?.. Усё сваё жыццё мой бацька выкладаў у вясковай школе гісторыю. Незадоўга да пенсіі ён звярнуўся да людзей з ініцыятывай збору экспанатаў для вясковага музея. Экспанаты знайшліся, але «не знайшлося» памяшкання. Зараз тыя экспанаты валяюцца ў пакойчыку школы і ў любы момант могуць быць знішчаны. Змагацца за іх у бацькі няма ўжо сілы — ён хварэе. Я перафатаграфаваў экспанаты і накіраваў здымкі разам з артыкулам усё ў тую ж «Чырвоную змену». Прайшоў год. Артыкул не надрукавалі. Мабыць, вырашылі, што музей у вёсцы — гэта ўжо занадта, тым больш, калі сярод экспанатаў — знойдзеныя каля вёскі каменная сякера і Ісус Хрыстос з адбітымі рукамі. Ці ж здолею я захаваць справу свайго бацькі, жывучы ў Эстоніі, калі яна на Беларусі непатрэбна нават тым, хто за захаванне гістарычнай спадчыны грошы атрымлівае?..

У верасні мінулага года прадстаўнікі нашага «БЭЗу» былі на ўстаноўчай канферэнцыі згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына». Якіх толькі слоў там ні казалася! Ад «Радзіма будзе спрыяць вяртанню на зямлю продкаў кожнага сына, кожнай дачкі» да «мы будзем усяляк падтрымліваць шматлікія беларускія суполкі за межамі Беларусі». Але ж давайце вызначым, што такое тая мяжа для кіраўнікоў «Бацькаўшчыны»? Як мы бачым, дзейнасць яе накіравана толькі ў той бок, толькі за тую мяжу, дзе яшчэ нешта ёсць. У Амерыку, Канаду, Нямеччыну і нават Польшчу ездзіць куды прыемней! Добрае спалучэнне цікавай працы і цвярозага сэнсу. Адкрыццё ж на адзін толькі тыдзень «Беларускага дома» ў Таліне мінулым летам працай «Бацькаўшчыны» ў Эстоніі нават з вялікім «нацягам» не назавеш. Я ўжо не кажу пра «працу» ТБМ імя Ф. Скарыны, якой мы наогул не адчуваем.

Чаму атрымліваецца так, што кніжкі, якія нам дасылаюць ад Беларускага фонду культуры,— гэта менавіта тыя кніжкі, якіх ніхто не купляе і не чытае на Беларусі, а песні — якіх ніхто не спявае? Чаму, калі мы ў чарговы раз прапаноўваем зрабіць велавандроўку да беларусаў Беласточчыны, дык нам шэсць месяцаў нешта абяцаюць, а за тыдзень да дарогі раптам тлумачаць: «Не, гэтага зрабіць нельга, бо вы ж жывяце не на Беларусі, а ў Эстоніі...» Як быццам раней мы жылі на Месяцы!.. Чаму звычайна ад нас адмахваюцца, як ад мухі? Чаму, калі наш сход у лістападзе мінулага года звяртаецца да спадара Шушкевіча з пытаннем вяртання на Радзіму, дык да гэтага часу ўсё яшчэ не можам атрымаць ад яго нават пустога канверта? Чаму, калі на 100-годдзе з дня нараджэння Багдановіча ў госці да «Славянскага таварыства» ў Талін прыязджаюць артысты з Менску, дык беларусы ў Эстоніі пра гэта не ведаюць? Чаму, калі мы адчыняем у Кохтла-Ярве выставу мастакоў-беларусаў Балтыі «Маю гонар», дык яна выклікае цікаўнасць ва ўсіх, толькі не ў тых, хто абавязкова павінен быў тут быць, хто непасрэдна адказвае за развіццё беларускага мастацтва? Чаму, калі нашы людзі едуць на чарговае пасяджэнне ў Менск, дык пры вяртанні ў Эстонію яны ўвесь час кажуць, што адчувалі сябе там лішнімі і нікому непатрэбнымі? Чаму, нарэшце, нашу беларускую суполку ў Кохтла-Ярве, як тую казанскую сірату, фінансуе ўвесь час толькі Міністэрства культуры Эстоніі? Ці ж у нас няма свайго, родненькага? Ці ж не сорамна яму перад эстонскім урадам, перад эстонскім народам? Бо нам перад людзьмі, якіх мы пазвалі да нас у «БЭЗ», сорамна. Толькі год прайшоў з таго часу, як мы ўскладалі каля Курэмяэскага кляштара вянкі і кветкі на магілу жаўнераў Булак-Балаховіча, якія загінулі, абараняючы Эстонію. Толькі палавіна года мінула з той пары, калі мы ўсім аўтобусам спявалі беларускія песні, вяртаючыся ў Кохтла-Ярве пасля сустрэчы ў Вільні з Лявонам Луцкевічам і «Сябрынай». Толькі тры месяцы таму мы чыталі «Малітву за Беларускі народ», калі палілі свечкі і святкавалі каляды. Толькі два месяцы — як сустракалі ў сябе «Маю гонар». І ад мерапрыемства да мерапрыемства людзей прыходзіла ўсё менш і менш. Згуртаванне, якое налічвала некалі больш як семдзесят чалавек, да свайго трохгадовага юбілею зменшылася ўдвая. А што будзе далей? Што адбываецца, калі людзі страчваюць веру і надзею на падтрымку з боку Радзімы?

Дык адродзімся ці не?

**Уладзімір ДЗЕХЦЯРУК,**
**старшыня праўлення БЭЗ.**

Эстонія,
г. Кохтла-Ярве.

## АД РЭДАКЦЫІ

**У лісце з Эстоніі падымаюцца занадта балючыя пытанні, каб пакінуць яго без каментарыя. Як мы зразумелі, з энтузіязмам распачатая ў Кохтла-Ярве беларуская справа траціць запал, радзеюць шэрагі яе прыхільнікаў. Адну з прычын гэтага старшыня тамтэйшага згуртавання беларусаў У. Дзехцярук бачыць у тым, што няма належнай дапамогі з Беларусі. Былі спробы наладзіць сталыя сувязі, але, як з крыўдай піша У. Дзехцярук, ён не знайшоў у сталіцы ні маральнай, ні матэрыяльнай падтрымкі, ні нават элементарнай чалавечай увагі.**

**Як жа так магло стацца пры наяўнасці асяродкаў нацыянальнага жыцця — Таварыства беларускай мовы, «Бацькаўшчыны», Фонду культуры,— што нашы суайчыннікі з невялікага эстонскага гарадка адчуваюць сябе тут, на радзіме, нікому не патрэбнымі? Што ад іх, па словах аўтара допіса, «адмахваюцца, як ад мухі»? Мусіць жа, былі падставы ў старшыні згуртавання менавіта такім чынам думаць і выказвацца?**

**У гутарках з прадстаўнікамі пералічаных арганізацый нешта пацвердзілася, пра нешта зусім не ведалі, хаця пра існаванне беларускай суполкі ў Кохтла-Ярве ўвогуле было вядома. Нам паведамілі, што па лініі БФК на другую палову года запланавана сустрэча з суполкамі былога СССР. Што ж тычыцца формы сувязей, дык яны пакуль што немудрагелістыя: «Звернуцца з канкрэтнымі просьбамі і прапановамі — стараемся дапамагчы».**

**На практыцы, на жаль, так бывае не заўсёды. Па многіх прычынах. Адна з іх — аб'ектыўная: чакаць істотнай дапамогі, асабліва фінансавай, ад грамадскіх арганізацый проста не выпадае, іх магчымасці, мякка кажучы, абмежаваныя. Пакуль клопат пра суайчыннікаў, што жывуць за межамі, не ўзяла на сябе дзяржава, збіранне беларусаў у агульнае супольніцтва будзе чыстым аматарствам.**

**Спадару ж Дзехцеруку хочацца падзякаваць за ягоны клопат і сказаць: не адчайвайцеся, не апускайце рук! Бойцеся пачуцця безнадзейнасці, бо няўдачнікаў не любіць ніякая справа, у тым ліку і адраджэнская...**

Марцін КОЎЗКІ

# ДОЛЯ ПРАЎДЫ

Дзіўны мор пайшоў на бібліятэкі: прафесура раскрадае картатэкі. Ну а як не знесці карту-доказ, калі доктар ты за гэткі опус, што цяпер гучыць, як анекдот, тыпу партыя вядзе нас у паход. Дык жа той эпохі дылетанты і цяпер куюць нам дысертантаў.

●

У сацыялістычнай нашай гаспадарцы культуру курыравалі ці не дрывасекі. Надалі імя Горкага паркам, імя Леніна — усім бібліятэкам. У Мінску па-падхалімску падтрымалі куратараў славу, каб звязаць «буравесніка» з адпачынкам, адлілі шырокую лаву. І сядзіць на ёй Горкі, як на дачы, у горадзе, які ніколі не бачыў. Побач — яшчэ адзін «пост» — Ленін ва ўвесь рост, манументальнае відовішча... у кнігасховішчы. А падхалімы цягнуць сваю лінію — аздобілі плошчу Калініным. І шмат шчэ якія скульптуры бачыліся тым работнікам культуры...

●

Мода, як калготкі, вен яе кароткі. Ці не таму, гаротная, яна бессмяротная.

●

«Ахвяруйце грошы на мір!» — клікала партыя-павадыр. А партыя, як выявілася цяпер, сама была мільянер. Ужо не скажа партыя-зладзейка, дзе падзеліся нашы капейкі.

●

Вера ў Бога не проста маленне, ёсць святое ў сэрцы кожнага. Толькі нельга сумленне выхоўваць глумленнем і ў храме кадзіць бязбожнаму. Ці не верх гэта ідыятызму — у касцёле музей атэізму? І ці робіць каго свядомым кіназал у маленьким доме? Ладзіць танцы клуб КДБ — падабаецца гэта табе?

●

— Людзьмі звацца? Даўно завёмся. А каму служыць? — спыталі лёкаі.

●

Пераклад з французскай: калі чагосьці дзе няма, дык і чаргі за тым няма, а ёсць чарга, дык, значыць, там нешта ёсць. Вунь выдаў новы том Хама (у арыгінале Дзюма) а як з чаргой за ім? Няма. Вось гэта, c'ler ami, Хама.

●

Як сабе ўяўляюць беларускія талеры некатрыя таварышы? З Леніным, у вышыванцы.

●

— Пацалаваць, любы? З'ем «губы». Усміхнуцца? «Шчочкі» абтрасуцца. Паплакаць хоць чуць? «Вочы» пацякуць. Касметыка, мой любы, не для сметніка, сядзіба пачынаецца з штыкетніка.

●

Пра аднаго сабаку: усё зразумее, не здрадзіць, не кіне, выратуе, не вагаючыся і трошачкі, і ўмомант здзічэе, забудзе і згіне... Як толькі ўбачыць «кошачку».

●

З Генрыха Гейне: калі ты маўчыш, чую твой голас, любая, калі гамоніш, нічога ўжо не чуваць.


ЛІМ

Заснавальнікі:
САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ
І МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах
Друкарня «Беларускі Дом друку».

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 33-24-61; намеснік галоўнага рэдактара — 33-25-25; адказны сакратар — 33-19-85; аддзел публіцыстыкі: Міхась ЗАМСКІ — 33-19-65; аддзел пісьмаў і грамадскай думкі: Людміла КРУШЫНСКАЯ, Марыя ГІЛЕВІЧ — 33-19-85; аддзел літаратурнага жыцця: Алесь МАРЦІНОВІЧ — 33-24-62; аддзел крытыкі і бібліяграфіі: Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ — 33-22-04; аддзел літаратуры: Юрась СВІРКА — 33-22-04; аддзел музыкі: Святлана БЕРАСЦЕНЬ — 33-21-53; аддзел тэатра, кіно і тэлебачання: Жана ЛАШКЕВІЧ — 33-21-53; аддзел выяўленчага мастацтва і аховы помнікаў: Пётра ВАСІЛЕЎСКІ — 33-24-62; аддзел навін: Віталь ТАРАС — 33-19-65, Юрась ЗАЛОСКА — 33-22-04; аддзел мастацкага афармлення: Уладзімір ТАБУШАЎ — 33-44-04; фотакарэспандэнт Уладзімір ПАНАДА — 33-24-62; бухгалтэрыя — 26-86-40.

Пры перадруку просьба спасылацца на «ЛІМ». Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з думкамі і меркаваннямі аўтараў публікацый.

Галоўны рэдактар Мікола ГІЛЬ.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Анатоль БУТЭВІЧ, Анатоль ВЯРЦІНСКІ, Андрэй ГАНЧАРОЎ (нам. галоўнага рэдактара), Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Лілія ДАВІДОВІЧ, Міхась ДРЫНЕЎСКІ, Алесь ЖУК, Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ, Ігар ЛУЧАНОК, Уладзімір НЯКЛЯЕЎ, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Барыс САЧАНКА, Юрась СВІРКА, Рычард СМОЛЬСКІ, Уладзімір СТАЛЬМАШОНАК, Віктар ТУРАЎ.

Адказны сакратар Барыс ПЯТРОВІЧ.

Індэкс 63856

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12